

МАТЭРЫЯЛЫ
ДА 100-годдзя
З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ
МІКОЛЫ ШЧАКАЦІХІНА
1896—1940



Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь



Беларускі Фонд Сораса

МАТЭРЫЯЛЫ

ДА 100-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІКОЛЫ ШЧАКАЦІХІНА 1896–1940

Мінск 1996

ББК 85.10 г
М341

УДК 7(476) (092) (093.3) [Шчакаціхін] + 012
[Шчакаціхін] + 7(476) (063)

У мерапрыемствах, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння
М. Шчакаціхіна, прынялі ўдзел:

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
Музей гісторыі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь пры Інстытуце гісторыі
Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства,
этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны музей гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь
Упраўленне культуры Мінскага аблвыканкама
Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
Цэнтральны навуковы архіў Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь
Архіў Камітэта дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь
Федэральная Служба Бяспекі Башкортастана
Краязнаўчы музей г. Белебея
Аддзел культуры г. Белебея
Аддзел культуры Іглінскага райвыканкама
Аддзел культуры гарвыканкама г. Маладзечна
Беларускі фонд Сораса
Беларускі фонд культуры
Дзеці М.М. Шчакаціхіна:
Уладзімір Мікалаевіч Шчакаціхін
Аляксандр Мікалаевіч Шчакаціхін
Алена Мікалаеўна Шчакаціхіна

На вокладцы: М. Шчакаціхін. Мінск. 1924 г.

ISBN 985–6051–07–X

© Высоцкая Н. Ф., канцэпцыя, 1996.
© Аўтары артыкулаў, 1996.
© Чэбан І. Л., біябібліяграфія, 1996.
© Харытоненка В. Я., афармленне і макет, 1996.
© Фотаздымкі і дакументы з архіва сям'і
М. Шчакаціхіна, 1996.

Шчакаціхін Мікалай Мікалаевіч (1/13.10.1896, Масква – 1.04.1940, Белебей, Башкірская АССР) выдатны беларускі савецкі мастацтвазнавец, гісторык і тэарэтык мастацтва, педагог. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце (1914–1918). З 1922 г. у Мінску працаваў: у БДУ – з 1923 г. чытаў курс беларускага мастацтва; у Інбелкульце (1925–1928), у АН БССР (1929–1930). З 1931 г. у Башкірскай АССР. Пачынальнік беларускага савецкага мастацтвазнаўства, таленавіты гісторык, тэарэтык і крытык: даследаваў выяўленчае мастацтва і архітэктуру Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці, культавае дойлідства і манументальны жывапіс XI–XIX стст., іканапіс XVII–XVIII стст., абарончыя збудаванні XIII–XVI стст., старажытныя беларускія гравюры, мастацтва кніг Ф. Скарыны, творчасць мастакоў В. Вашчанкі, М. Філіповіча, В. Волкава, А. Грубэ, І. Ахрэмчыка, У. Кудрэвіча і інш. Упершыню ў беларускім савецкім мастацтвазнаўстве выпрацаваў навуковую канцэпцыю гісторыі беларускага мастацтва, асноўных напрамкаў яго развіцця, зрабіў спробу перыядызацыі. Пільную ўвагу ўдзяляў станаўленню нацыянальнай мастацкай школы, арганізацыі мастацкага жыцця рэспублікі. Выступаў з публікацыямі па праблемах беларускага мастацтва, аўтар артыкула пра беларускае мастацтва для першага выдання Вялікай Савецкай Энцыклапедыі (1927).

Арсень Ліс

ХРАНАЛОГІЯ ЖЫЦЦЯ І ДЗЕЙНАСЦІ М. ШЧАКАЦІХІНА[1]

(1896–1940)

1896, 1 кастрычніка	нарадзіўся ў Маскве
1914	скончыў з залатым медалём гімназію А.Е. Флёрава
1914–1918	вучыўся ў Маскоўскім універсітэце на аддзяленні тэорыі і гісторыі мастацтва пад кіраўніцтвам прафесара У.К. Мальмберга і маладых дацэнтаў (пазней прафесараў) А.А. Сідарава, А.Н. Някрасава, якія спецыялізаваліся па гісторыі заходнееўрапейскага мастацтва
1918	пачатак працоўнай дзейнасці. Працаваў інструктарам Аддзела па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва і даўніны ў Наркамасвеце ў Маскве (дакументы не захаваліся)
1919, сакавік	пераехаў на радзіму маці ў Арол. Служыў у музейным пададдзеле Губнарадукацыі (дакументы не захаваліся). З ліпеня адначасова працаваў клубным інструктарам і лектарам пры Палітаддзеле Арлоўскай вайсковай акругі (дакументы не захаваліся)
1920, люты	пераехаў у Харкаў. Працаваў навуковым супрацоўнікам музея, лектарам раённых рабочых студый пры Аддзеле мастацтваў Губнарадукацыі (дакументы не захаваліся)
май	прызначаны загадчыкам перакладчыцкай калегіі, з'яўляўся супрацоўнікам камітэта Тэатральнага аддзела Наркамасветы, членам рэпертуарнай камісіі пры Навукова-тэарэтычным пададдзеле Наркамасветы УССР (Мандат N 2880 ад 7.05.1921)
верасень	адначасова быў прызначаны загадчыкам літаратурнай секцыі Цэнтральнага Паказальнага чырвонаармейскага і працоўнага клуба "Будучыня" пры палітаддзеле Харкаўскай вайсковай акругі (Пасведчанне N 246 ад 16.03.1921)
лістапад	абраны членам Усеўкраінскага Саюза пісьменнікаў, затым членам Праўлення Усеўкраінскага Саюза пісьменнікаў (білет N 10 ад 8.09.20 і Мандат N 306 ад 15.05.1921)
1921, з мая	знаходзіўся ў доўгатэрміновай камандзіроўцы ад Наркамадукацыі УССР і Усеўкраінскага Саюза пісьменнікаў у Адэсе з мэтай інструктажу па арганізацыі навукова-даследчай работы ў адпаведных установах горада (Мандат N 306 ад 15.05.1921 і N 2880 ад 17.05.1921. Пасведчанне ад 30.06. 1921 N 2296)
снежань	прыехаў у Мінск
1922, студзень	быў запрошаны на пасаду асістэнта на кафедру гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта (БДУ) пад кіраўніцтвам прафесара М. Г. Сыркіна. Першапачаткова праца ішла ў галіне тэорыі мастацтваў. Адначасова працаваў у якасці інструктара літаратурнага гуртка на 21-х кавалерыйскіх курсах (да к. 1922 г.) (Пасведчанні ад 2.03.22 г. N 975 і ад 13.09.22 N 5368)

[1] Пры складанні былі выкарыстаны звесткі аб жыцці і дзейнасці М. Шчакаціхіна з асабістага архіва сям'і вучонага, а таксама з асабістых спраў, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве РБ і Архіве КДБ РБ.


к. 1921/1922 і 1922/1923	вёў семінар па агульных уводзінах у мастацтвазнаўства
1923, лета	распрацоўваў курс па гісторыі і тэорыі беларускага мастацтва
кастрычнік	абараніў працу "Ілюстрацыі Даніэля Хадавецкага да "Буры" Шэкспіра" і атрымаў рэкамендацыі на права самастойнага выкладання ў БДУ (Асабістая справа ў Нацыянальным архіве РБ "М.М. Шчакаціхін пры катэдры мастацтва." Ф. 205. Воп. 3. Адз. зах. 9438.)
1923, 5 снежня	бярэ шлюб з Раманавай Ганнай Мацвееўнай (5.03.1906 г., Мінск – 8.11.1987 г., Маладзечна)
1923/1924	упершыню прачытаў курс па гісторыі беларускага мастацтва
1924	напісаў першы том "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва" (рукапіс на расійскай мове)
кастрычнік	за абарону ў Прадметнай Камісіі навуковай работы атрымаў званне дацэнта БДУ на кафедры гісторыі мастацтваў (Пасведчанне ад 10.8.1926)
1924, 17 кастрычніка	нарадзіўся першанец Уладзімір
1924/1925	дадаткова чытаў курс па гісторыі польскага і ўкраінскага мастацтва. Першыя спробы выкладання на беларускай мове
1925, люты	прызначаны на пасаду навуковага сакратара Секцыі беларускага мастацтва пры Інстытуце беларускай культуры (ІБК) (Пратакол Прэзідыума Інстытута Беларускай Культуры N 7 ад 5.03.25)
	перайшоў у працы на беларускую мову
	садзейнічаў правядзенню 1-й Усебеларускай мастацкай выстаўкі. Займаўся перакладам рукапісу "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва" на беларускую мову
1926	быў членам-супрацоўнікам камісіі па гісторыі мастацтваў у ІБК. Адначасова працаваў на пасадзе стыль-рэдактара выдавецкага аддзела ІБК
У 1920-я гг.	праводіў навуковыя экспедыцыі па даследаванню і вывучэнню помнікаў Беларусі. Займаўся бібліятэчнай і архіўнай працай у Ленінградзе і Маскве. Яго артыкулы друкаваліся ў газетах "Зьвязда", "Савецкая Беларусь", у часопісах "Наш край", "Полымя" і інш. Займаўся сфрагістыкай, нумізматыкай: працаваў над абагульненнем тапаграфіі манетных знаходак. Уваходзіў у склад Камісіі па ахове помнікаў мастацтва і даўніны пры Наркамасветы ад ІБК, з'яўляўся кансультантам Беларускага дзяржаўнага музея
1926, 26 верасня	нарадзіўся сын Аляксандр
1927	прызначаны навуковым сакратаром ІБК па вывучэнню мастацтва Беларусі. З'яўляўся старшынёй Камісіі гісторыі мастацтваў у ІБК (Пасведчанне N 1012-7 ад 4.01.28)
1928	надрукаваны першы том "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва"
1929, студзень	адбылася рэарганізацыя ІБК у Беларускую акадэмію навук (БАН). Заставаўся на пасадзе старшыні Камісіі гісторыі мастацтваў пры кафедры гісторыі Беларусі

1929, 25 чэрвеня	нарадзілася дачка Алена
1930, 21 ліпеня	арыштаваны. Звольнены з работы ў БАН
1931	накіраваны ў ссылку ў г. Белебей, у Башкірскую АССР згодна з пастановай калегіі АГПУ ад 10 красавіка 1931 г., арт. 58/ 4, 7, 10, 11
1932, жнівень	пераезд сям'і да яго ў г. Белебей. Быў на пасадзе статыстыка Белебееўскага райспажыўсаюза, рахункавода гарадскога спажывецкага таварыства, потым планавіка. Працаваў настаўнікам у белебееўскай трохгадовай школе Кааператыўна-Гандлёвага вучнёўства, пачаў працаваць над "Нарысамі гісторыі літоўскай манеты XVI–XVII стст."
1934	працаваў у сярэдняй школе N 1 г. Белебея выкладчыкам нямецкай мовы
1935, снежань	арыштаваны. Звольнены з работы
1936	беспрацоўны, шукаў вакансій
верасень	уладкаваўся працаваць у татарскае педагагічнае вучылішча настаўнікам нямецкай і рускай мовы і літаратуры. Хварэў
1937	арыштаваны (на некалькі месяцаў). Хварэў на сухоты, атрымаў інваліднасць. Даваў урокі лацінскай мовы вучням белебееўскай аптэкі N 17 (на працягу пяці месяцаў)
1938	звольнены з татарскага педагагічнага вучылішча
жнівень	атрымаў прызначэнне Наркамасветы на працу выкладчыкам старэйшых класаў у сярэднюю школу ў вёску Кальтаўка (каля 300 км ад Белебея) Іглінскага раёна
1939, студзень	цяжка хварэў
май	вызвалены ад працы ў школе па інваліднасці
1940, люты	ў стане цяжкай хваробы скончыў работу над рукапісам "Нарысы гісторыі літоўскай манеты XVI–XVII стст. Ч. I". Яе і калекцыю гербаў, адбіткаў пячатак, экслібрысаў адправіў у Ленінград у Эрмітаж
вясна	здароўе значна пагоршылася
1940, 5 красавіка	памёр у Белебеі
	пахаваны на могілках у Белебеі
1956, 30 студзеня	пастанова ад 10.04.1931 г. у адносінах да Мікалая Мікалаевіча Шчакаціхіна адменена і справа спынена за недаказанасцю абвінавачвання


...




М. Шчакаціхін са сваёй маці Лідзіяй Пятроўнай Шчакаціхінай. Масква. 1914 г.



Кабінет у кватэры М. Шчакаціхіна (на рагу вуліц Універсітэцкай і Валадарскага д. 5/30 кв. 5). Мінск. 1926 г.



М. Шчакаціхін у працоўным кабінеце. Мінск. 1920-я гг.




ВЫПИСЬ ИЗЪ МЕТРИЧЕСКОЙ КНИГИ, ЧАСТИ ПЕРВАЯ, О РОДИВШИХСЯ, ЗА 1896 ГОДЪ.

Счетъ родившихся. Мужскаго пола.	Женскаго пола.	Месяцы и дни рожденія. мѣс.	дни.	Имена родившихся.	Званіе, имя, отчество и фамилія родителей, и какому вѣроисповѣданію.	Званіе, имя, отчество и фамилія воспріемниковъ.	Кто совершилъ таинство крещенія.	Рукоприкладство или дѣтей записи положенія.
24	—	Сентябрь	1 30	Николай	Въ городѣ Москвѣ, имѣетъ онъ фон Юлиенъ Адольфъ Александръ, Вильгельмъ Константиновичъ, Лютеранскаго вѣроисповѣданія. Петровой супругой его, Маріей Ѳеодоровой православнаго.	Коллежскій секретарь Московскаго Университета историко-филологическаго факультета Ѳедоръ Васильевъ Шляпкинъ, Вдовствующая Ея Императорскаго Величества Государыня Императрица Марія Ѳеодоровна.	Священникъ Евгеній Васильевъ Петровъ Никольской церкви.	

1896 года. Сентября 1 дня.

Выпіска з метрычнай кніжкі аб нараджэнні за 1996 г., зробленая 9 снежня 1900 г.




1901 года ... дня по указу ЕГО ИМПЕРАТОРСКАГО ВЕЛИЧЕСТВА, Московский Окружный Суд ... Отделения ... краевой ... под председательством Товарища Председателя ... в составе членов: ... при участии Товарища Прокурора ... при ... Секретаре ... рассмотрев ... об усыновлении ... Потомственным Дворянином ... Статским Советником ... Московской Губернии ... Уездным Предводителем Дворянства ... Кавалером ... Орденов ... Женой его ... Потомственной Дворянкой ... Статской Советницей

АТТЕСТАТЪ ЗРѢЛОСТИ.

Дан сей сыну дворянскому Ферапонту Николаевичу Шереметевскому
Шереметевскому Николаю Николаевичу Шереметевскому
в том, что онъ, вступивъ въ частную мужскую гимназію А. Е. Фишера въ Москвѣ
осенью тысяча восемьсотъ девяносто седьмого года
и окончивъ полный восьмиклассный курсъ, при чемъ обнаружилъ нижеслѣдующія познанія:

Предметы гимназическаго курса	Отмѣтки, выставленныя на окончательномъ совѣтѣ по баллами отъ 1 до 12 (единица—наименьшій, двѣнадцать—наивысшій, установленнымъ Министерствомъ Народнаго Просвѣщенія)
Законъ Божій	отличныя (12)
Русскій языкъ и словесность	отличныя (12)
Философская пропедевтика	отличныя (12)
Латинскій языкъ	отличныя (12)
Математика	отличныя (12)
Математическая географія	отличныя (12)
Физика	отличныя (12)
Исторія	отличныя (12)
Географія	отличныя (12)
Законовѣдѣніе	отличныя (12)
Нѣмецкій языкъ	отличныя (12)
Французскій языкъ	отличныя (12)
Греческій языкъ	———

Московскій
Московскій Университетъ



Атэстат сталасці ад 1 чэрвеня 1914 г.

Беларуская Акадэмія Навук

Сталае пасьведчаньне асобы

На 1930 г.

№ 19.

Ск. Ат.
Аг. 74×105

Ф. № 9.

Сапраўдна на працягу аднаго году

Выдадзена „4" сакавіка 1930 г.

Прад'явіцель гэтага Шчакаціхін Мікола Мікалаевіч

знаходзіцца на службе ў Беларускай Акадэміі Навук

на падставе навуковага супрацоўніка Інстытуту Беларусазнаўства

Вуч.-выдавецкі Кам (Окам)


(М. П.)




Адзнака або выпіска з артыкулаў закону або пастановы, якое вызначае прысвоеныя правы і абавязкі.

Арт. 28, 30 і 31 статуту Беларускай Акадэміі Навук, зацверджанага СНК БССР 26.III.1928 г. (З. З. БССР № 15, ад 20.III. 1928 г. арт. 92).

Пасведчанне члена Інбелкульта. 1930 г.



М. Шчакаціхін сярод прафесараў Беларускага дзяржаўнага Універсітэта (злева направа): М.М. Нікольскі, А.А. Міхайлоўскі, У.І. Пічэта, М.М. Шчакаціхін. Мінск. 1926 г.



Дом, у якім у другой палавіне 1930-х гг. жыў і памёр М. Шчакаціхін. Белебей. Беглы завулак, д. 4. (Фота Чэбан І.Л. 1996 г.) Публікуецца ўпершыню.

Р. С. Ф. С. Р.
Московский Государственный Университет им. М.В. Ломоносова

АРХИВ.
Москва, Моховая 9, корп. 8.

"2" июня 1936 г.
№ 1222

СПРАВКА.


Гражданин Шекатихин Николай Николаевич был зачислен студентом Московского Государственного Университета на историко-филологический факультет 1 Августа 1914 года, с 31 Августа 1915 г. был переведен на естественное отделение физико-математического факультета, с 6 октября 1917 г. снова был переведен на историко-филологический факультет, выбыл из Ун-та в 1918 г.

Примечание: Настоящая справка наведена по материалам Архива Московского Государственного Университета, заключающимся в деле Ар. студенческие дела сего Ун-та 1914 г. Лист и выдана гр-ну Шекатихину Н.Н. вследствие его просьбы, для предоставления по месту работы.

Заведующий Архивом МГУ:- (ГАВРИЛИН)

Секретарь:- (ГАВРИЛИН)

Даведка аб вучобе ў Маскоўскім універсітэце ў 1914–1918 гг., атрыманая М. Шчакаціхіным у 1936 г.



SSSR Eşke Eştər Xalıq Komissarlatı
Grazdanlıq xəle aktları bylege

Народный Комиссариат Внутренних Дел СССР
Отдел актов гражданского состояния

YLEV TURAHLNDA AKTTЬ JAƉЬV
ЗАПИСЬ АКТА О СМЕРТИ

№ 64

25 дек. 40

1. Familiyası, Фамилия: Щекотихин
2. Adı, Имя: Николай
3. Atasının adı, Отчество: Николаевич
4. Jenesi, Пол: мужской
5. Milləti, Национальность: Русский
6. Yığılğı vaqtı (gün, ay, il), Время смерти (число, месяц, год): 5 апреля 1940г.
7. Yaşı (neçə yaş tolduğu), Возраст, исполнилось: 42 лет
8. Yığılğı təcrübən yə bəşvə kiləre xəlqanlıq (xoz nagda kəsmə) hərəkətə bəşqasıne Имел ли умерший свои средства сумасшествия или иной из средства другого лица: нейдет, нет (подчеркнуть)
9. Şuğlə (prafsiyası, sedisete, hunəle) Занятие (специальность, должность, ремесло):
10. Eşləgən orunu (predpriətie, kalxoz i t. p. hesə) Место работы (наименование предприятия, колхоза и т. д.):
11. Yığılğı orunu, Место смерти: Больница
12. Yığılğı kəşe təbiətçən vşuna eşyine vaqti gəldiğə, Сколько времени лиц умерший в месте регистрации смерти:
13. Yığılğı orunu, Место смерти: Тубинская участковая больница
14. Yığılğı vaqtı təsdiq eləyən dokumentlərə, Предъявленные врачебные документы о смерти: Справка от Белиб. туберкулезной больницы от 7/XII 40г.
15. Yığılğı səbəbləri, Особые приметы:
16. Ölən kəşenin familiyası, adı, atasının adı, Фамилия и имя умершего: Щекотихина Вера Тимофеевна
17. Bəldirməyinə qoldanğaldı, Подпись заявителя: Щекотихина

Qeyd: Yığılğı yığan kəşe başqa kəşe təndəlikində başqa adda, əmə familiyası ilə dəşqalı yığan kəşe kəm tanıməyinə başqa adda, şul kəşe tuğılğıda tuğılğıda. Если умерший женщина, то обе части графы 9 заполняются относящимися лиц. за подписью которых умерший находился.


Qeyd: Yığılğı yığan kəşe başqa kəşe tanəlikində başqa adda, əmə familiyası ilə dəşqalı yığan kəşe kəm tanıməyinə başqa adda, şul kəşe tuğılğıda tuğılğıda. Если умерший женщина, то обе части графы 9 заполняются относящимися лиц. за подписью которых умерший находился.

ZAQS işçisi, Заведующий: Шедрь

Qeyd: Yığılğı yığan kəşe başqa kəşe tanəlikində başqa adda, əmə familiyası ilə dəşqalı yığan kəşe kəm tanıməyinə başqa adda, şul kəşe tuğılğıda tuğılğıda. Если умерший женщина, то обе части графы 9 заполняются относящимися лиц. за подписью которых умерший находился.

Qeyd: Yığılğı yığan kəşe başqa kəşe tanəlikində başqa adda, əmə familiyası ilə dəşqalı yığan kəşe kəm tanıməyinə başqa adda, şul kəşe tuğılğıda tuğılğıda. Если умерший женщина, то обе части графы 9 заполняются относящимися лиц. за подписью которых умерший находился.

Даведка аб смерці. 1940 г.



БАШҠОРТОСТАН РЕСПУБЛИКАҺЫ
БУЙЫНСА РФ ФЕДЕРАЛЬ
ИМЕНЛЕК ХЕҘМӘТЕ
ИДАРАҺЫ
(Башкортостан Республикаһы
Имеңлек министерствоһы)

УПРАВЛЕНИЕ ФСБ РФ
ПО РЕСПУБЛИКЕ БАШКОРТОСТАН
(Министерство безопасности
Республики Башкортостан)

От 6 августа 1996
№ 10/6-30443

№ 220600, г. Минск, ул. Ленина, 20,
Директору Национального музея
Республики Беларусь
тов. КАРАЧУНУ Ю. А.

На Ваш запрос № 268 от 29.07.96г.

Сообщаем, что, по материалам архивного уголовного дела, ШЕКОТИХИН НИКОЛАЙ НИКОЛАЕВИЧ, 1895 года рождения, уроженец г. Москва и житель г. Минска, отбывая ссылку в г. Белебее БАССР, был необоснованно арестован 3 декабря 1935г. НКВД БАССР. Ему были предъявлены обвинения в том, что он неоднократно высказывал враждебное отношение к советской власти и проводимым ею мероприятиям, поддерживал тесную связь с другими осыльными национал-демократами (в частности, с САВИЦКИМ Иваном Васильевичем, ВАЛЬКОВИЧЕМ Александром Ивановичем), вел с ними антисоветские разговоры, оказывал сопротивление развитию стахановского движения в школе, в которой преподавал (ст. 58 п. 10 УК РСФСР).

Постановлением Белебеевского р/о НКВД БАССР от 13 января 1936г. мера пресечения (содержание под стражей в Белебеевской тюрьме по 1 категории) была изменена на подписку о невыезде и ШЕКОТИХИН Н.Н. из-под стражи был освобожден.

В деле имеются сведения, что ШЕКОТИХИН Н.Н. 10 октября 1931г. был осужден Коллегией ОГПУ в г. Минске по ст. 58 пп. 4, 7, 10, 11 УК РСФСР к 5 годам ссылки в Башкирию (за принадлежность к так называемой контрреволюционной организации белорусских национал-демократов). Прибыл в г. Белебей в июле 1931г., а срок ссылки закончился 17 июля 1936г.

В анкете арестованного от 4 декабря 1935г. и обвинительном заключении от 26 февраля 1936г. указано, что ШЕКОТИХИН Н.Н. проживал в г. Белебее по ул. Свободы, д. 18, преподавал немецкий и русский языки в полной средней школе г. Белебея, имел семью в составе 4-х чел.

Постановлением Особого Совещания при НКВД СССР от 15 мая 1936г. дело в отношении ШЕКОТИХИНА Н.Н. было прекращено (мотивировка прекращения в деле отсутствует) и подписка о невыезде аннулирована.

8 июня 1936г. дело ШЕКОТИХИНА Н.Н. было сдано на хранение в архив НКВД БАССР.

Другими сведениями о пребывании ШЕКОТИХИНА Н.Н. в Башкирии УФСБ РФ по РБ не располагает.

Зам. начальника УФСБ РФ по РБ Э. А. НИГАМЕДЗЯНОВ

Тир. Заказ 10-2. Тираж 5000

300
10 05 96

Адказ Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі з Федэральнай Службы Бяспекі Башкортастана. 1996 г.

1918

1. Феликс Валлотон. Очерк Н.Н. Щекатихина: Вступ. ст. А.А. Сидорова. М.: Альціон. 1918 (?). 112 с. На тит. л.: Мастера новой графики.

1923

2. Иллюстрации Даниеля Ходовецкого к "Буре" Шекспира // Працы. БДУ. 1923. N 4–5. С. 134–149.

3. Меринг Франц. На философские и литературные темы: Сб. статей. Перевод с немецкого Н.Н. Щекатихина. Мн.: Белтрестпечать. 1923. 132 с.

1924

4. У колектыве выкладчыкаў беларусазнаўства: М.М. Шчакаціхін аб беларускім мастацтве: Інфармацыя пра даклад на сходзе выкладчыкаў // Асьвета. 1924. N 3. С. 171–175.

5. "Нарысы гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. (Уся праца меркавалася ў 5 тамах.). Рукапіс на рускай мове. 1925. Месца знаходжання невядомае.

6. Фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра // Наш край. 1925. N 1. С. 18–27.

7. Наша сучаснае мастацтва // Трыбуна мастацтва. 1925. N 1. С. 4–5.

8. Наша сучаснае мастацтва і нацыянальны стыль (працяг) // Трыбуна мастацтва. 1925. N 3. С. 2.

9. Матар'ялы да гісторыі Беларускага малярства XVIII сталецьця: Збор Віцебскага Аддзяленьня Беларускага Дзяржаўнага Музэю: Даклад у Мастацкай Сэкцыі першай Віцебскай Акруговай Краязнаўчай Конфэрэнцыі 26–27 красавіка 1925 г. // Віцебшчына. Віцебск. 1925. Т. 1; С. 26–36.

10. Калі радзіўся Францішак Скарына // Полымя. 1925. N 5. С. 148–151.

11. Васіль Вашчанка – магілёўскі гравёр канца XVII – пач. XVIII сталецьця. Мн. 1925. Перадрукаваны ў зборніку "Магілёўшчына" Магілёўскага Акруговага таварыства краязнаўства.

12. Падрахунак мастацкіх сіл // Савецкая Беларусь. 9.12.1925.

1926

13. 1-я Усебеларуская мастацкая выстаўка: Каталёг аддзелу старажытнага мастацтва / Апрац. М. Шчакаціхін. Мн. 1926. 29 с. (З артыкуламі: "Беларускае малярства ў XVII і XVIII сталецьцях" і "Дэкорацыйнае і скульптурнае разьбярства XVII і XVIII сталецьцяў".)

14. Дрэварыты і орнамэнт у выданьнях Скарыны // Наш край. 1926. N 1. С. 8–17.

15. Мотывы краязнаўства ў нашым сучасным мастацтве: З вынікаў Усебеларускай Выстаўкі // Наш край. 1926. N 2–3. С. 15–25.

16. Спосабы зьбіраньня матар'ялаў з беларускага мастацтва: Анкеты, програмы і інструкцыі // Наш край. 1926. N 2–3. С. 62–69.

17. Сучаснае мастацтва Беларусі // Полымя. 1926. N 6. С. 130–148.

18. Кнігапіс // Полымя. 1926. N 7. С. 177–180.

19. Гравюры і кніжныя аздобы ў выданьнях Францішка Скарыны // 400-лецце беларускага

друку (1525–1925). Мн. Інбелкульт. 1926. С. 180–227.

Гравюры і кніжныя аздобы ў выданьнях Францішка Скарыны // Інбелкульт. Мн. 1926. 50 с. і іл. (Адбітак з "400-лецця беларускага друку").

20. Увагі да ілюстрацый // 400-лецце беларускага друку (1525–1925). Мн. Інбелкульт. 1926. С. 229–340.

21. Замак у Рагачэве// Наш край. 1926. N 10–11. С. 26–33.

22. Ілюстрацыі Даніэля Хадавецкага да "Буры" Шэксьпіра (працяг) // Працы. БДУ. Мн. 1926. N 12. С. 23–33.

1927

23. Белорусское искусство // БСЭ. Т. 5. М. 1927. С. 416–421.

24. Орнамэнтальныя росьпісы Сьмядынскай Барысаглебскай царквы ў Смаленску // Гістарычна-археолёгічны зборнік. Мн. Інбелкульт. 1927. N 1. С. 67–82.

25. Новыя архіўныя матар'ялы // Гістарычна-археолёгічны зборнік. Мн. Інбелкульт. 1927. N 1. С.367–371.

26. На шляхох да новага беларускага мастацтва: Нарыс творчасьці Міхася Філіповіча // Полымя. 1927. N 2. С. 163–179.

27. Беларускае мастацтва да 10-гадовага юбілею Кастрычніка // Полымя. 1927. N 7. С. 188–195.

28. Беларускае мастацтва ў гістарычнай і археолёгічнай літаратуры: Адбіткі з часопіса "Полымя". Мн. 1927. N 6. С. 166–190; N 8. С. 158–185.

29. Беларуская архітэктура ў XI–XII ст. / Інбелкульт. Мн. 1927. 62 с. 19 іл. (Асобны адбітак II раздзелу "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва". Т. 1.)

1928

30. Да пытаньня аб хронолёгіі "Малой Падарожнай Кніжыцы" Скарыны / Інбелкульт. Мн. 1928. 16 с. (Адбітак з гістарычна-археолёгічнага зб. Т. II.)

31. Помнікі старадаўняе архітэктуры XVII–XVIII сталецьцяў у Менску // Працы камісіі гісторыі мастацтва: Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Інбелкульт. Мн. 1928. Кн. 6. . Т. 1, сш. 1. С. 1–38.

32. Рыгор Мядзьвецкі – невядомы Беларускі малер канца XVIII сталецьця / Інбелкульт // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кн. 6. Працы камісіі гісторыі мастацтва. Т. 1, сш. 1. Мн. 1928. С. 183–187.

33. Белорусское изобразительное искусство // Белорусская культура: Сб. 1 / Белорусское общество культурных связей с заграницей. Мн. 1928. С. 35–45.

34. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. Мн. 1928. 280 с. (Рэц.: Цвяткоў Л. // Полымя. 1929. N 3. С. 169–170).

35. Матар'ялы да гісторыі беларускага малярства XVIII сталецьця: Збор Віцебскага Аддзяленьня Беларускага Дзяржаўнага Музэю (працяг) // Віцебшчына. Віцебск. 1928. Т. 2. С. 147–167.

1929

36. Сучаснае беларускае мастацтва: Праваднік па аддзеле сучаснага беларускага малярства і разьбярства / БДМ; Апрац. М. Шчакаціхін і В. Ластоўскі. Мн. 1929. 30 с. 53 іл.

37. Рэестр экспонатаў аддзелу новачаснага беларускага малярства і разьбярства // Сучаснае беларускае мастацтва / БДМ, Мн. 1929. С. 15–30.

1930

38. Новы Менск // Чырвоная Беларусь. 1930. N 2. С. 10—11.

Рукапісы

1929

1—2. "Обзор монетных находок Белоруссии за 1926—1928 гг."; "Описание монетных находок на территории Минска". Артыкулы, якія М.М. Шчакаціхін падрыхтаваў да друку. Месца знаходжання невядомае. (Рябцевич В.Н. "Нумизматика Беларуси". Мн.: Полымя. 1995. С. 8.)

3—8. Брашура з серыі аб ахове помнікаў мастацтва і старажытнасці. (Па сведчанню М. Шчакаціхіна, магчыма, знаходзіцца ў архіве Камісіі па ахове помнікаў мастацтва, даўніны і прыроды пры Інбелкульце, або Галоўнавукі.)* Месца знаходжання невядомае.

Праект навуковай тэрміналогіі па гісторыі, тэорыі і тэхніцы выяўленчага мастацтва. (Па сведчанню М. Шчакаціхіна, быў заказаны Інстытутам навуковай мовы.)* Месца знаходжання невядомае.

1930

Навуковая работа (пачаў працаваць з 1928 г.) "Некаторыя помнікі Гродзенскага феадальнага і гарадскога будаўніцтва XVI ст.". (Па сведчанню М. Шчакаціхіна, рукапіс знаходзіўся ў выдавецкім аддзеле БАН.)* Месца знаходжання невядомае.

Артыкул "Развіццё народнага мастацтва Беларусі пад уздзеяннем рэвалюцыі". (Па сведчанню М. Шчакаціхіна, рукапіс здадзены ў рэдакцыю часопіса "Маладняк".)* Месца знаходжання невядомае.

"Да пытання аб дыялектыцы мастацтва ў Пляханава".* Месца знаходжання невядомае.

"Аб пралетарскай архітэктуры". (Па сведчанню М. Шчакаціхіна, рукапісы не завершаны.)* Месца знаходжання невядомае.

1930-я гг.

Працаваў і падрыхтаваў рукапісы да друку ў Белебеі:

1. "Топография кладов с литовскими монетами на территории древнего Литовского государства. 1933—1934 гг". Рукапіс перададзены на захаванне Дзяржаўнаму Эрмітажу М. Шчакаціхіным. (265 с. N зах. 129052).[1]

   На гэту работу ён атрымаў водгук за подпісамі вядомых вучоных-нумізматаў А.А. Ільіна і М.П. Бауэра.

2. "Некоторые варианты литовских монет". 1936. Захоўваецца ў нумізматычным аддзеле Эрмітажа. (40 с. N зах. 129053).

3. "Водяные знаки Литовской метрики" (7 друкаваных аркушаў тэксту, 38 табліц з малюнкамі). (Па сведчанню М. Шчакаціхіна.) Гл. крыніцу зноскі [1]. Месца знаходжання невядомае.

4. "Очерк истории литовской монеты XVI—XVII столетий. Ч. I." 1932—1937 гг. Захоўваецца ў нумізматычным аддзеле Эрмітажа. (391 с. N зах. 139974).

---

*) Звесткі атрыманы з асабістай справы М. Шчакаціхіна ў КДБ РБ.

[1]) Гэту працу М.М. назваў: "Клады с литовскими монетами как материал для истории литовской нумизматики и денежного обращения до к. XVII ст.". (Па сведчанню М.Шчакаціхіна, каля 10 друкаваных аркушаў). Пісьмо М.М.Шчакаціхіна да У.І. Пічэты ад 2 лютага 1939 года (Архіў РАН. Ф. 1548. Воп. 3. Спр. 244).

5. Вопіс рэчаў, якія належалі М.Шчакаціхіну (захоўваюцца ў аддзеле нумізматыкі Эрмітажа):

5.1. 52 пячатак:

1. пячаткі з тапазу ў аправе з бірузой;

2. 2 пярсцёнка сярэбраных з сердалікам;

3. 17 пячатак на камянях;

4. 33 медных і жалезных пячатак.

5.2. 72 адбіткаў пячатак на паперы.

5.3. 121 гербавых exlibris'аў.

6. Незавершаны лацінскі слоўнік. (Па сведчанню М. Шчакаціхіна.). Пісьмо М. Шчакаціхіна да жонкі Г.М. Шчакаціхінай ад 21.01.1932. Месца знаходжання невядомае.


...


Комитет по делам искусств при СНК СССР

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭРМИТАЖ

Ленинград, Набережная у Зимнего, 38 Тел. 171-61 и 312-93 (коммутатор)

Адказ М. Шчакаціхіну з Дзяржаўнага Эрмітажа ад 30 марта 1940 г.



Форма № 1 - 9

При запросах ссылаться на № настоящего акта

СНК СССР
ВСЕСОЮЗНЫЙ
Комитет по Делам Искусств
ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭРМИТАЖ

КОПИЯ
№ 487
30 марта 40 г.

АКТ № 172
на приемку
в Эрмитаж вещей на экспертизу
г. Ленинград, 31 марта 1940 г.

Государственный Эрмитаж в лице Ученого Секретаря В.Н.Павлова

и Завед. Кустсклада А.Н.Бограда

принял на экспертизу: Вещественные на листах. Ещё, согласно прилагаемому списку

№ № пп	Наименование	Количество	Описание (размер, вес, сохранность)	Оценка вещей в рублях
1.	Плакаты на холсте	19	Согласно прилаг.	
2.	Плакаты смешан.		записей в расписке	
	техники	33	в списке	
3.	Этюдник с плакат.	72		
4.	Барабан со свёрт.	121		

Задачи экспертизы Классификация

Владелец вещей Щеголихина Николай Николаевич

и его адрес Ленинград, Лит. Бригад, Советская наб. 4 тел.

Сдал вещи Поступили на хранение.

Особые условия

По проведении экспертизы Эрмитаж уведомит о том владельца вещей по указанному адресу. Невостребованные вещи хранятся в течение шести месяцев со дня отсылки владельцу уведомления, предложенного получить вещи обратно. По истечении указанного срока никакие претензии рассматриваться не будут.

Эрмитаж не берет на себя обратной доставки вещей, если это не обусловлено выше.


Акт составлен в двух экземплярах, из которых один для Эрмитажа и один другой сдавшему вещи.

С подлинным верно:

Зав. Центральн. делопроизводством
по учету и хранению

Ленобллитиздат № IX 1937 г. Типо-лит. Гидрометеоиздата, Ленгр., наб. 9 января, 32. Зак. 1902. Тир. 1000 экз.

Акт N 172 на прыём рэчаў у Эрмітаж. 1940 г. (Адварот гл. на с. 22).



Заключение экспертов

Наименование	Заключение эксперта	Оценка в рублях
1) Книга в кожаном переплете		50/-
2) Гравюра серебряная с орнаментом		25
3) 17 печатей на разных метал.		170
4) 33 медали и жетона разных по ст.		165
5) 36 оттисков печатей на бумаге по 1 руб.		36
6) 2 ex libris'a по 10 р.		20
7) 55 ex libris'ов по 3 р.		165
8) 84 ex libris'a по 1 р.		84
		655

Все печати и экземпляры ex libris'ов № 1 по 8 в сопроводительной ведомости к сопроводительной описи № 1 к акту № 172 от 28/III 40 г. Ленинград

О сем сторонами подписано;


Н. Загряцкий

А. Витязев


28/III 40.

гор. Ленинград

Акт N 172 на прыём рэчаў у Эрмітаж. 1940 г. (Адварот).



Пісьмо М. Шчакаціхіна да жонкі Г.М. Шчакаціхінай ад 21 студзеня 1939 г., в. Кальтаўка Іглінскага р-на Баршкірскай АССР. (Адварот гл. на с. 24)



Пісьмо М. Шчакаціхіна да жонкі Г. М. Шчакаціхінай ад 21 студзеня 1939 г., в. Кальтаўка Іглінскага р-на Баршкірскай АССР. (Адварот)



Ганна Мацвееўна Раманава. Мінск. 1923 г. Публікуецца ўпершыню.

УСПАМІНЫ ГАННЫ МАЦВЕЕЎНЫ
(У АПРАЦОЎЦЫ С. ХАЙКІНАЙ)[1]

У Маладзечне многія ведаюць Алену Мікалаеўну Шчакаціхіну. Ведаюць як выдатнага педагога-літаратара. Мудрага, тактоўнага і па-мастацку ўмелага выхавацеля моладзі. Яе вопыт правядзення заняткаў і арганізацыі выхаваўчай работы сярод навучэнцаў навукова-планавага тэхнікума, дзе яна працавала амаль чвэрць веку, неаднаразова абагульняўся ў спецыяльных перыядычных выданнях. Ведаюць Алену Мікалаеўну як нястомную актывістку-лектара, кнігалюба і проста як цудоўнага, прыгожага чалавека. Яе воля і шчырасць у спалучэнні з аптымізмам, чуласцю, спагадлівасцю і абаяльнасцю ствараюць тое магнітнае поле, якое і прыцягвае людзей. Гэта, бадай, адчулі ўдзельнікі хору ветэранаў, разам з якімі яна заўсёды выступае. Зведалі і члены клуба "Ветэран", што нядаўна створаны пры яе самым актыўным удзеле, дзе яна з'яўляецца яго душой...

...Ганна Мацвееўна – жонка і верны друг, апора і крыніца натхнення Мікалая Мікалаевіча – вяла дзеннік. Гэта не проста ўспаміны пра мужа з дня іх першай сустрэчы да апошняга дня яго жыцця. А хутчэй навелы, прасякнутыя лірызмам і смуткам.

– У лёсе аднаго чалавека і ўсей нашай сям'і, як у кроплі вады, адлюстравалася трагічная эпоха ў гісторыі нашай краіны, – заўважыла Алена Мікалаеўна, знаёмячы з дарагімі сямейнымі рэліквіямі – нешматлікімі фотаздымкамі, дзённікавымі заметкамі, санетамі Мікалая Мікалаевіча, перадсмяротным пісьмом да жонкі. Усе гэта мае бясцэннае значэнне не толькі для родных, бо высвечвае шматграннасць цудоўнай асобы вучонага і чалавека, яго самаадданасць і самаахвярнасць у працы, высакароднасць, вытанчанасць і пяшчотнасць яго натуры. Таму, здаецца мне, успаміны Ганны Мацвееўны маюць не меншую каштоўнасць, чым афіцыйныя сведчанні і пасведчанні.

УСПАМІНЫ ГАННЫ МАЦВЕЕЎНЫ

Расцвітала вясна ў вяселкавым зіхаценні... У прыродзе ўсё было маладым, свежым, яркім. Бязмежны купал блакітнага ласкавага неба быццам расставаў у празрыстым паветры. Сонейка струмяніла жыццё, святло і радасць.

Аднойчы ў ясны майскі поўдзень мы з сяброўкай хадзілі па Мінску. Зямля дыхала духмянасцю, і нам было лёгка і радасна. Бесклапотна жартавалі, смяяліся. Падымаліся па вуліцы ўверх ад Свіслачы да таго месца, дзе цяпер Палац прафсаюзаў, а насустрач рухалася мужчынская фігура. Нечакана сяброўка махнула ў яго бок рукой і прапела: "Вунь ідзе твой жаніх!" Калі мы параўняліся, малады чалавек акінуў нас поглядам, а мы ледзь устрымаліся ад смеху!

Прайшло некалькі тыдняў. Сяброўка прапанавала мне пайсці на лекцыю.

– Хто чытае? – спытала я.

– Не ведаю. Прозвішча даўжэзнае, я не запомніла. Пойдзем, тады даведаемся, – адказала яна. Аднак я пайсці не змагла. А сяброўка прыбегла назаўтра ўзбуджаная, з захапленнем расказвае пра лекцыю. Затым весела паведаміла, што чытаў жаніх. Мы ўспомнілі тую выпадковую сустрэчу і дружна рассмяяліся.

Праходзілі тыдні, месяцы. Дні сталі карацей. Стаямі кружыліся птушкі, з дрэў асыпалася лісце. Восень! Ішла другая палавіна кастрычніка. У пошуках паэм і вершаў У. Маякоўскага

[1] Цыт. па: Хайкіна С. Вернутае імя // Святло камунізму. Маладзечна. 5.07.1989. (N 107); 11.07.1989. (N 110); 12.07.1989. (N 111); 14.07.1989. (N 112); 15.07.1989. (N 113); 18.07.1989. (N 114); 19.07.1989. (N 115).

мы з сяброўкай прыйшлі да знаёмай настаўніцы, спадзеючыся, што ў яе бібліятэцы павінны быць кнігі паэта. Гаспадыня прыняла ветліва. Сказала, што кніга з вершамі Маякоўскага ў суседа, ён хутка прыйдзе, і прапанавала пачакаць. А каб не было сумна, параіла выйсці ў двор і паглядзець у вакно налева. На падаконніку сядзеў вялізны чорны кот. Мы сталі гуляць з катом. Вадзілі пальцамі па шклу, а ён безупынна крычаў і спрабаваў злавіць. Раптам мы пачулі за спіной: "Вам падабаецца мой кот?" Азірнуліся – перад намі стаяў "жаніх". Як метэоры пранесліся мы міма яго ў кватэру настаўніцы. "Жаніх" аказаўся яе суседам. Ён перадаў нам томік Маякоўскага і запрасіў на вечар, прысвечаны М.А. Някрасаву. Вечар адбыўся ў будынку па вул. М. Горкага, дзе размяшчаліся Ваенныя артылерыйскія курсы. Наш знаёмы ўсадзіў нас. З дакладам аб творчасці паэта ён выступаў першым. Да мяне даляталі толькі абрыўкі фраз. Дагэтуль у нас былі вельмі кароткія сустрэчы. А цяпер я ўважліва вывучала рысы яго твару, услухоўвалася ў яго голас і спрабавала зразумець, што адбылося, як мы аказаліся разам? Лектар закончыў, падышоў да нас, папрасіў прабачэння, прадставіўся: "Шчакаціхін Мікалай Мікалаевіч" – і сеў паміж намі. Гэта адбылося ў 1922 годзе. У той вечар першай сустрэчы з Мікалаем Мікалаевічам я не магла падумаць, што імя яго стане мне дарагім і вядомым. Нашы лёсы сышліся.

Шчасце

З бацькоўскага дома я пайшла з любімым. З гэтай пары я ўвайшла ў яго жыццё, у яго духоўны свет, і мы былі шчаслівыя.

Ішоў час, і наша сям'я разрасталася. Клопаты аб дзецях не распылялі нашых глыбокіх узаемных пачуццяў. Ва ўсе гадзіны яго натхнёнай, напружанай навуковай работы я была побач. Ён прасіў мяне аб гэтым, бо толькі тады яму працавалася лёгка і прадукцыйна. Я любіла глядзець на яго, схіленага над сталом. Мне здавалася, што я лаўлю яго думкі, што ператвараліся ў словы, якія ліліся, ліліся і бісерным почыркам клаліся на паперу. Мікалай Мікалаевіч пісаў шмат, з захапленнем. Яго натхняла тое, што ён адкрывае новыя старонкі ў гісторыі беларускага мастацтва, дагэтуль не вывучаныя. Запоўніць адзін ліст рукапісу, падкладвае другі, абмяняецца са мной усмешкай і зноў працягвае пісаць.

За сталом ён сядзеў паглыблена сур'ёзным. Часта заседжваўся да глыбокай ночы. Робячы невялікі перапынак, ён закураваў люльку, адкінуўшыся на спінку крэсла. Раскладзе перада мной некалькі лістоў рукапісу, кажа: "Чытай, унікай, потым пагаворым". Паклаўшы люльку на месца, зноў схіляўся над работай.

М.М. пісаў доўга, нястомна. Завершыць раздзел, беражліва складзе лісткі ў столік і кажа: "Напісаў дык напісаў! Гэта выдатна!" Вочы яго блішчаць. Мне здавалася, што ён і не стомлены, а нават прасветлены тым, што духоўную часцінку сваёй працы аддае людзям. І звычайна адчаканьваў: "З гэтай нагоды..."

– Чай! – дабаўляла я. Ён, як масквіч, любіў чай, моцны, гарачы, духмяны, і выпіваў па дзве-тры шклянкі некалькі разоў у дзень.

Аднойчы ўвечары, скончыўшы работу і склаўшы лісткі рукапісу, ён уважліва паглядзеў на мяне, быццам чакаючы пытання.

– Хочаш нешта сказаць? – спыталася я.

– Так, ты здагадалася, – адказаў М. М.

– Хачу з табой падзяліцца сваёй задумай. Хачу напісаць гісторыю беларускага мастацтва ў пяці тамах. Лічу, што мне хопіць жыцця здзейсніць гэта. А як ты думаеш?

– Думаю, што ты ўзбагаціш беларускую культуру, – адказала я. – Тым больш, што паставіў гэта мэтай жыцця.

Мы верылі, што жаданні збудуцца і загадзя былі гэтым шчаслівыя, усхваляваныя. Той перыяд – з 1924 па 1929 г. – быў плённым росквітам яго навуковай дзейнасці і жыцця.

Беларусь - яго любоў

М.М. Шчакаціхін нарадзіўся ў Маскве 1 кастрычніка 1896 года. У 1914 скончыў з залатым медалём гімназію і паступіў у Маскоўскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. У 1918 г. пачалася яго працоўная дзейнасць... Працуючы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і з'яўляючыся навуковым супрацоўнікам Беларускай акадэміі навук, рабіў экспедыцыі па рэспубліцы, вывучаў помнікі беларускага мастацтва (архітэктуру, жывапіс, разьбу), збіраў матэрыялы. Усе, што датычыцца беларускай культуры, захапляла М.М. Часта ён вяртаўся да любімай размовы пра Людамонта, іншы раз мы рабілі прагулкі на Людамонт, праўдзівей, на Татарскую Слабаду. "Вось тут, на цяперашніх татарскіх агародах, – гаварыў ён, – у XI стагоддзі ціха рабаціласа возера. У ім з высокага берага адлюстроўваўся замак князя Менса. З цягам вякоў замак разбураўся, возера высыхала. Неабходна тут правесці раскопкі. Я ўпэўнены, што з зямлі будзе здабыта шмат каштоўнасцей, якія ўяўляюць інтарэс для беларускай культуры".

Рускі па нацыянальнасці, М.М. сваю першую кнігу пісаў на рускай мове. Прыходзіў перакладчык Каспяровіч і зачытваў пераклад на беларускую мову. М.М. заставаўся незадаволеным і вырашыў вывучыць беларускую мову. Авалодаў ёй у дасканаласці. Усе наступныя кнігі пісаў на беларускай мове. Палюбіў яе так, як любіў Беларусь, дзе расцвіло яго дараванне вучонага-даследчыка. Да канца сваіх дзён ён адчуваў у душы сябе беларусам. Спадзяваўся вельмі многа зрабіць для Беларусі, якая стала яму роднай. Штогод выязджаў у навуковыя камандзіроўкі ў Маскву і Ленінград. У архівах вывучаў культуру старажытнай Беларусі, побыт і характар беларускага народа.

Такім ён быў

Быў ён культурным чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова. Дасканала валодаў нямецкай, французскай, грэчаскай, лацінскай мовамі. Вывучаў англійскую. А ў час ссылкі ў Башкірыю спрабаваў вывучыць 12 блізкіх цюркскіх моў (чувашскую, татарскую, башкірскую і інш.). М.М. быў бібліяфілам – вялікім аматарам і збіральнікам кніг. Ён набываў у букіністычных магазінах каштоўныя ўнікальныя выданні. Беражліва браў іх у рукі і з глыбокай пашанай перагортваў старонкі, быццам адчуваў у іх подых мінулага. Асабліва шанаваў фаліянт у пераплёце з слановай косці – "Літоўская метрыка XIV ст."

Быў М.М. эстэтам у навуцы і жыцці. Любіў прыгожыя рэчы і абсталяваў імі свой кабінет. Збіраў карціны, манеты, адбіткі пячатак на паперы, старадаўнія гербы на камянях. Пісаў навуковыя працы па нумізматыцы. Па-дзіцячаму радаваўся, калі знаёмыя прыходзілі паглядзець яго калекцыі і называлі кабінет "музеем у мініяцюры".

Пунктуальны і педантычна акуратны, М.М. быў строгім, сур'ёзным і разам з тым жыццярадасным, таварыскім, дасціпным, любіў танцаваць, асабліва мазурку, цаніў сур'ёзную музыку і спяваў рускія, беларускія народныя песні, акампануючы сам сабе на цытры, крыху маляваў і пісаў вершы, добра фатаграфаваў. Заўсёды элегантна апрануты, ён выклікаў прыхільнасць да сябе людзей. Росту быў вышэй сярэдняга, хударлявы, вочы вялікія, шэрыя, насіў акуляры, валасы каштанавыя, хадзіў з кійком. З многімі М.М. сябраваў, з некаторымі сходзіўся асабліва блізка, як з прафесарамі Нікольскім і Міхайлоўскім, хірургам Трамповічам і інш. Да нас на кватэру (а жылі мы ў доме прафесуры на рагу вуліц Валадарскага і Кірава) прыходзілі супрацоўнікі М.М., студэнты. Частымі гасцямі былі мастакі Тычына, Волкаў, Бразер, Крыгер[1], Станюта і многія іншыя, чыіх прозвішчаў я не памятаю.

---

[1] Магчыма, маецца на ўвазе мастак Я.М. Кругер (14.05.1869–19.03.1940), беларускі савецкі жывапісец. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР (1939). Вучыўся ў акадэміі Жуліяна ў Парыжы, у Пецярбургскай АМ у У. Макоўскага. У 1904 годзе адкрыў у Мінску курсы рысавання і жывапісу (з 1906 г. – мастацкая школа). Працаваў пераважна ў жанры партрэта.

Сяброўскія адносіны звязвалі М.М. з калектывам Віцебскага мастацкага тэхнікума. Нярэдка работнікі прыязджалі да нас разам з дырэктарам тэхнікума. Мікалай Мікалаевіч вельмі любіў гэтыя сустрэчы. Размаўлялі пра мастацтва, пра таленты. Паступова гутарка прымала вясёлы, непасрэдны характар, пелі песні і, як заўсёды, муж спяваў сваю любімую — студэнцкі гімн "Гаудэамус" на лацінскай мове. Памятаецца, колькі было радасці, калі аднойчы віцебскія мастакі прывезлі ў падарунак двухвядзерную гліняную вазу з беларускім арнаментам. Яна з вялікім букетам кветак упрыгожыла нашу сталовую.

Уся атмасфера нашага жыцця была насычана яго нястомнай навуковай працай, яго тонкім густам, любоўю да прыгожага і нашымі нязменнымі душэўнымі пачуццямі.

Ганенне

А ў гэты час над бязвоблачным гарызонтам нашага жыцця сталі збірацца навальнічныя хмары. У газетах паявіліся артыкулы, якія кампраментавалі навуковых работнікаў. Газеты не абышлі імя Шчакаціхіна: маўляў,"... у яго кабінеце вісіць распяцце Хрыста". А гэта ж распяцце — твор мастацтва XVI ст. Газетнае ганенне вымотвала душу М.М., прыніжала яго годнасць. Нават супрацоўнікі ад страху пазбягалі вітацца з ім. Аднойчы ён вярнуўся дамоў ашаломлены: "Я звольнены з універсітэта!" Кожны дзень прыносіў новыя хваляванні і трывогі.

Адзін з супрацоўнікаў універсітэта ўсклаў на сябе амаральную місію. Ён вадзіў М.М. з яго кнігамі на заводы і фабрыкі і на сходах, звяртаючыся да рабочых, гаварыў, што Шчакаціхін М.М. піша навуковыя творы, у цэнтры ўвагі якіх цэрквы і касцёлы. "Гэта шкодніцтва!" — і паказваў фатаграфіі архітэктурных помнікаў Беларусі, змешчаныя ў кнігах.

Мікалай Мікалаевіч прыходзіў пасля такіх уніжальных душэўных пакут разбітым, знішчаным. Ён казаў: "Я сення хадзіў па пакуты...". Ён быў падаўлены, панury. Горыч і боль ускіпалі ў мяне за абняслаўленне мужа. І ў гэты гаротны час я была побач з ім. Прайшлі чуткі аб магчымых арыштах супрацоўнікаў Беларускай акадэміі навук. Чуткі гэтыя неўзабаве спраўдзіліся.

Арышт

Ліпень 1930 г. Званок у дзверы каля 12 гадзін ночы не абяцаў нічога добрага. Уварваліся... "Рукі ўгару! Вы арыштаваны!" М.М. указалі на стул. Я села насупраць. Нам не дазвалялі размаўляць. Мы былі ашаломлены. З жахам і тугой глядзелі адзін на аднаго, разумеючы, што разбураецца наша жыцце, наша шчасце, яго навуковая кар'ера.

У мяне на руках капрызнічала нованароджаная дачушка. А пад раніцу трагічны фарс быў скончаны. Нас падганялі развітвацца. Мы абняліся. Адыходзячы, М.М. усклікнуў: "Дзеці! Дзеці!" Я засталася адна, быццам пасля пагрому. Да поўдня заставалася пад хатнім арыштам. Каравульны не выпускаў мяне з пакоя на кухню, каб пакарміць дзяцей. Доўга я не магла апамятацца, узрушаная арыштам мужа. Засталася адна, не маючы сродкаў да існавання, з трыма малымі дзецьмі. А было мне тады 24 гады.

Неўзабаве асобным жонкам арыштаваных дазволілі рабіць перадачы. Мяне пазбавілі і гэтага. Прафесар Нікольскі сказаў мне, што М.М. утрымліваецца ў падвале ГПУ, што ён захварэў і просіць перадаць паліто.

Муж хворы і галодны ў падвале. Мы жывем упрогаладзь. Як вытрымаць?..

Пасля дзевяцімесячнага мучэння М.М. у падвале я атрымала толькі адно спатканне. Яно было і развітальным перад адпраўкай мужа ў ссылку. Ён ужо быў пераведзены ў турму. Я прывяла з сабой старэйшых дзяцей. Мяне папярэдзіў работнік турмы, што размаўляць мы можам толькі наконт здароўя. Кажу яму, што муж ні ў чым не вінаваты. "Вінаваты!" — ускрыкнуў ён. Я зноў: "Не вінаваты!". "Вінаваты!" — загарлапаніў служака

і стукнуў кулаком па стале. Дзеці спужаліся, закрычалі. Увялі Мікалая Мікалаевіча. Яго цяжка было пазнаць. Аброслы, пажаўцелы твар. Голас мне здаўся такім далёкім... Ён пасадзіў дзяцей на калені. Раптам у мяне вырваліся некалькі слоў недазволеных. І адразу ж вокрык: "Спыніць! Пазбаўляю спаткання!" Мы моўчкі, са смуткам глядзелі адзін на аднаго. Спатканне кончылася. Мы абняліся і развіталіся. Мікалай Мікалаевіч папрасіў мяне перадаць яго ўнікальную бібліятэку ў дар Ленінскай бібліятэцы. Але дырэктар бібліятэкі т. Сіманоўскі не пажадаў азнаёміцца са спісам кніг. А каштоўнейшыя тамы мужа нават наводзілі жах. Прыйшлося скласці кнігі ў хлеў.

Прафесар Нікольскі, які дружалюбна адносіўся да нашай сям'і, прапанаваў калегам універсітэта аказаць М.М. матэрыяльную дапамогу на дарогу ў ссылку. Але высакародная прапанова не была падтрымана.

Такім чынам без суда і следства мой муж у 1931 г. быў адпраўлены ў ссылку на пяць гадоў ў Башкірыю, у г. Белябей.

Ссылка

Першае пісьмо з Башкірыі было дзівосным, усхвалявана-зачараваным. Яно было пранізана шчасцем свабоды. "Я адчуваю сябе быццам зноў народжаным, быццам упершыню ў жыцці радуюся багаццю паветра, святла і сонца, — пісаў ён. — Пасля цяжкіх перажыванняў, пасля доўгай пакутлівай разлукі я зноў думаю пра цябе як пра нявесту". Заканчваўся ліст так: "Як бы ні складваліся акалічнасці ў далейшым, прыязджай. Сустрэну цябе як нявесту".

Яшчэ больш года працягвалася наша разлука. У жніўні 1932 года я з трыма дзецьмі пакінула родны Мінск і паехала ў ссылку за М.М.

а) Даведкі, дакументы, копіі даведак М. Шчакаціхіна

1. Выпіска з метрычнай кнігі аб нарадзіўшыхся за 1896 г. N 14413 ад 9.12.1900

2. Копія дакумента Маскоўскага Акружнога Суда аб усынаўленні Шчакаціхінай Лідзіяй Пятроўнай яе сына Мікалая. N 10726 ад 1.06.1901

3. Атэстат сталасці (Маскоўская гімназія А.Е. Флёрава). N 412 ад 1.06.1914

4. Пасведчанне намесніка Старшыні Рэпертуарнай Камісіі Аддзела мастацтваў г. Адэсы М.М. Шчакаціхіну. N 2296 ад 30.06.1921

5. Выпіска з пратакола N 10 пасяджэння прадметнай гістарычнай камісіі аб прызнанні М.М. Шчакаціхіна годным звання выкладчыка ад 18.09.1924 (Старшыня Нікольскі, сакратар Жарынаў)

6. Мандат Інстытута Беларускай Культуры аб дазволе праводзіць фатаграфічныя работы, звязаныя з вывучэннем помнікаў мастацтва. N 1729 ад 14.07.1926

7. Пасведчанне члена БАН N 19 на 1930-1931 гг. ад 4.07.1930

8. Даведка аб працы статыстам Белебееўскага Райспажыўсаюза ад 2.04.1932

9. Даведка аб настаўніцтве ў трохгадовай школе Кааператыўна-гандлёвага вучнёўства

г. Белебея. N 863 ад 16.10.1932

10. Адказ Савецкай філатэлістычнай асацыяцыі пры Камісіі УЦВК (Усесаюзнага цэнтральнага выканаўчага камітэта) па фонду ім. У.І. Леніна ад 5.12.1934

11. Даведка аб вучобе ў Маскоўскім універсітэце. N 1222 ад 2.07.1936

12. Адказ з Наркамасветы РСФСР з аддзела кіравання сярэднімі школамі аб аднаўленні М.М. Шчакаціхіна на настаўніцкай працы ў белебееўскай сярэдняй школе з выплатай за вымушаны прагул. N 1188 ад 29.07.1936 г.

13. Адказ з Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў, завочнага сектара на ліст М.М. Шчакаціхіна аб здачы кандыдацкага мінімума ад 28.12.1936

14. Прафсаюзны білет N 867535 выдадзены Райкамам пачатковай сярэдняй школы г. Белебея ў 21.08.1937

15. Адказ з Пракуратуры РСФСР на скаргу М.М. Шчакаціхіна аб яго неабгрунтаваным звальненні з пасады настаўніка нямецкай мовы ў педагагічным вучылішчы. N 4-U5-1091-12 ад 25.02.1938

16. Даведка аб выкладанні лацінскай мовы вучням Белебееўскай аптэкі N 17 з 15.11.1937 па 15.03.1938. N 160 ад 2.04.1938

17. Адказ Наркамасветы Башкірскай АССР М.М. Шчакаціхіну на яго зварот у Наркамасветы РСФСР ва Упраўленне пачатковай школы ў Маскву аб прадстаўленні настаўніцкай работы. N 1–7 ад 13.05.1938

18. Копія даведкі аб працы ў татарскім педагагічным вучылішчы з 23.09.1936 па 23.10.1937. N 1000 ад 3.08.1938.

19. Накіраванне на працу ў Кальтаўскую сярэднюю школу Іглінскага раёна. N 11–7 ад 5.08.1938

20. Даведка аб настаўніцтве ў Кальтаўскай сярэдняй школе Іглінскага раёна Башкірскай АССР. N 45 ад 1.10.1938

21. Працоўная кніжка, выдадзеная Іглінскім РАНА (раённы аддзел народнай адукацыі) Башкірскай АССР ад 24.01.1939

22. Даведка аб настаўніцтве ў Кальтаўскай сярэдняй школе 20.08.1938–25.05.1939. N 155 ад 13.08.1939

23. Копія даведкі аб выкладанні нямецкай мовы ў Белебееўскай сярэдняй школе N 1 у 1934–1935 гг. N 186 ад 20.09.1939

24. Ліст з вопісам з Дзяржаўнага Эрмітажа аб атрыманні пасылкі з каштоўнасцямі і рукапісам ад М.М. Шчакаціхіна. N 957 ад 30.03.1940

25. Даведка Вярхоўнага Суда БССР N 5-10 ад 17.10.1958 аб адмене Пастановы ад 10.04.1931 у адносінах да М.М. Шчакаціхіна і прыпыненню справы за недаказанасцю абвінавачвання

26. Адказ Міністэрства Бяспекі Рэспублікі Башкортастан А.М. Шчакаціхінай на запрос аб яе бацьку М.М. Шчакаціхіне. N 10/9-Щ-99 ад 26.02.1993

б) асабістыя дакументы М.М. Шчакаціхіна

1. Аўтабіяграфія (ад дня нараджэння да 1930 г.)

2. Вершы:

Сонет (3.12.1935)

Терцина о любви (5.12.1935)

Терцины (17–19.12.1935)

Близость любимой (Перевод из Гете...)

Сонет о встрече (20.12.1935)

На Новый год (31.12.1935)

Дом над морем (11–12.01.1936)

3. Пісьмо М.М. Шчакаціхіна ў Народны Камісарыят Асветы Беларускай ССР ад 18.01.1936 з просьбай аб пацвярджэнні надання яму звання дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і зацвярджэнні яго ў гэтым званні Дзяржаўным Навуковым Саветам БССР у канцы 1924 г.

4. Пісьмо да жонкі Г.М. Шчакаціхінай (перадсмяротнае) ад 21.01.1939, напісана М.М. Шчакаціхіным у в. Кальтаўка Іглінскага р-на

в) Успаміны Г.М. Шчакаціхінай. (1960-я – 1980-я гг.).

г) Фотаматэрыял.

III

Дакументы, копіі дакументаў

а) НММ РБ

1. Фотакопіі матэрыялаў 1-й Усебеларускай выстаўкі 1925–1926 гг.

2. Копія даведкі аб смерці М.М. Шчакаціхіна за нумарам N 64 ад 7.04.1940. (Друкуецца ўпершыню)

3. Адказ Упраўлення Федэральнай Службы Бяспекі Расійскай Федэрацыі па Рэспубліцы Башкортастан на запыт НММ РБ. N 368 ад 22.07.1996

4. Фотаздымкі гістарычнай часткі застройкі г. Белебея, зробленыя Чэбан І.Л. 3–5.09.1996

б) Копіі дакументаў з архіваў:

1. Архіў КДБ

1.1 Копіі пратаколу допыту абвінавачанага Шчакаціхіна Мікалая ад 12.08.1930

1.2 Копіі паказанняў Шчакаціхіна Мікалая ад 17.09.1930

1.3 Копіі паказанняў арыштаванага Шчакаціхіна М. ад 23.11.1930

1.4 Копіі дадатковых паказанняў М. Шчакаціхіна ад 1.12.1930

2. Нацыянальны архіў РБ

2.1 Копія асабістай справы М.М. Шчакаціхіна (пачата 25.02.1922, завершана 20.3.1922) Ф. 205, Воп. 3, Адз. зах. 9439.

2.2 Копія асабістай справы "М.М. Шчакаціхіна пры катэдры мастацтва" (пачата 1.04.1922, завершана 12.09.1928) Ф. 205, Воп. 3, Адз. зах. 9438.

3. Цэнтральны навуковы архіў АН РБ

3.1 Копіі пратаколаў агульных пасяджэнняў, выпіскі з пратаколаў, палажэнне аб Інстытуце БК. 1924–1925 гг. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 8.

3.2 Копіі матэрыялаў археалагічнай і гістарычнай секцыі ІБК. 1925 г. Справа N 25. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 6.

3.3 Копіі пратаколаў пасяджэнняў прэзідыума і секцый ІБК. 1925. Справа N 2. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9.

4. Архіў Расійскай АН

4.1 Копія пісьма да У.І. Пічэты ад 1939 г. Ф. 1548. Воп. 3. Спр. 244.

IV

Відэадакументальныя матэрыялы*

1. Відэазапісы размоў са сведкамі, якія памятаюць М. Шчакаціхіна. Зроблены падчас камандзіроўкі ў Башкортастан І. Л. Чэбан. Аўтар сцэнарыя І. Л. Чэбан. Аператар П.А. Федзін. 1996 г.

2. Фільм, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М.Шчакаціхіна. Аўтар сцэнарыя — І.Л. Чэбан, аператар П.А. Федзін, мантаж — В.К. Ігнатовіч. Архіў І.Л. Чэбан. Мінск. 1996 г.[1]

3. Відэаматэрыялы святкавання (аператар В.К.Ігнатовіч)[2]:

   3.1. адкрыццё выставы. НММ РБ. Мінск. 30.09.96.

   3.2. вечарына памяці М.Шчакаціхіна. Маладзечна. 2.09.96.

...

*) Архіў НММ РБ, сям'і М. М. Шчакаціхіна, І. Л. Чэбан.

1) Дзякуючы падтрымцы Беларускага фонда Сораса стала магчымым ажыццявіць гэтую працу.

2) Копіі фільма і відэаматэрыялаў мерапрыемстваў па святкаванню 100-гадовага юбілею М. Шчакаціхіна былі падараваны сям'і вучонага 30 кастрычніка 1996 у дзень памінання ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

НАВУКОВЫЯ ЧЫТАННІ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ПАМЯЦІ М. ШЧАКАЦІХІНА[1]

Аб дзейнасці М. Шчакаціхіна

1. Габрусь Т.В., кандыдат архітэктуры, Мінск

   Мікола Шчакаціхін і пытанні генезісу беларускай готыкі ў культавым дойлідстве

2. Грышчанка Л.В., кандыдат гістарычных навук, кафедра гісторыі, Міравой і айчыннай культуры Беларускай палітэхнічнай акадэміі, Мінск

   Мікалай Шчакаціхін і першыя мастацкія выстаўкі на Беларусі 20-х гадоў

3. Налівайка Л.Д., навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ (ІМЭФ АН РБ), Мінск

   Выяўленчае мастацтва ў дзейнасці Інбелкульта

4. Холадава І.П., дырэктар Мастацкага музея, Віцебск

   М. Шчакаціхін: нашы задачы

5. Шаранговіч Н.В., Мінск

   Шчакаціхін і пытанні тэорыі беларускага мастацтва

Агульныя працы

6. Высоцкая Н.Ф., доктор искусствоведения, профессор, Минск

   Специфика барокко в Белоруссии

7. Карэлін У.Р., старшы навуковы супрацоўнік, АН РБ, Мінск, Мельнікаў М.П., малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ (ІМЭФ АН РБ), Мінск

   Параўнанне распаўсюджання ізводаў Пакроў і Апёка на Беларусі

8. Пікулік А.М., мастацтвазнаўца, навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ (ІМЭФ АН РБ), Мінск

   М.М. Шчакаціхін – даследчык магілёўскіх старадрукаў

9. Пятровіч Н.І., Таварыства "Веды", Мінск

   Слуцкі мецэнат князь Геранім Фларыян Радзівіл

10. Пуцко В.Г., Калуга

    Искусство барокко и византийская традиция в России: уроки исторического выбора

11. Сазанович Н.В., Минск

    Поэтика барокко М.К. Сарбевского

12. Сакалоўскі У.Л., Мінск

    Беларускае адраджэнне і далучэнне нямецкіх вучоных да даследавання беларускай культуры

13. Трутнева Н.Ф., кандидат исторических наук, директор Московского областного краеведческого музея в Истре, Московская обл.

    Труды по истории Западного края России, изданные П.Н. Батюшковым в 60–90-е гг. XIX в.

14. Чистякова М.В., научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

    Историко-культурные связи Новодевичьего монастыря с православными монастырями Белоруссии во второй пол. XVII в.

---

[1] Канферэнцыя праходзіла ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі 2–3 кастрычніка 1996 г.

15. Шведова М.М., старший научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

Новодевичий монастырь на стыке белорусской и русской культуры второй половины XVII в.

16. Шлионская Е.И., научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

Русско-белорусские связи на примере некрополя Московского Новодевичьего монастыря (к постановке проблемы)

Жывапіс

17. Горшковоз О.Д., кандидат искусствоведения, Минск

Рубенсовский архетип барокко Белоруссии

18. Горшковоз О.Д., кандидат искусствоведения, Минск

Мастер Иосиф. Могилевская школа живописи

19. Піскун Ю.А., мастацтвазнаўца, выкладчык Акадэміі мастацтваў, Мінск

Васіль Маркіянавіч – слуцкі мастак сярэдзіны XVIII стагоддзя

20. Хадыка А.Ю., навуковы супрацоўнік музея старжытнабеларускай культуры ІМЭФ АН РБ, Мінск

Алтарныя карціны першай паловы XVII ст. з Музея старажытнабеларускай культуры ў Мінску

21. Шведова М.М., старший научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

Работы иконописца Карпа Золоторева в Новодевичьем монастыре

22. Ярашэвіч А.А., навуковы супрацоўнік музея старжытнабеларускай культуры ІМЭФ АН РБ, Мінск

Абраз на сюжэт з гісторыі ордэна кармелітаў

Графіка

23. Гваздзёў С.М., Мінск

Пытанні вывучэння творчай біяграфіі Яўхіма Мініна

24. Нікалаеў М.В., Расійская нацыянальная бібліятэка (РНБ), Санкт-Пецярбург

Старадрукі з графічнымі выявамі навагрудскіх цудатворных абразоў

25. Ткачэнка М.Н., навуковы супрацоўнік, Расійская нацыянальная бібліятэка (РНБ), Санкт-Пецярбург

Невядомая гравюра абраза Маці Боскай Свержаньскай

26. Шматаў В.Ф, доктар мастацтвазнаўства, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, Мінск

Да пытання аб развіцці стылю барока ва ўсходнеславянскай кніжнай графіцы XVI–XVIII стст.

27. Яцкевіч З.Л., Мінск

Цікавейшы твор пачатку XVIII ст. з магілёўскай брацкай друкарні

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

28. Косицина М.Ю., старший научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

История создания и бытования древней плащаницы Новодевичьего монастыря

29. Сташкевіч А.Б., Мінск

Беларускае шкло ў Маскве XVII ст.

Габрусь Т.В., кандыдат архітэктуры, Мінск

МІКОЛА ШЧАКАЦІХІН І ПЫТАННІ ГЕНЕЗІСУ БЕЛАРУСКАЙ ГОТЫКІ Ў КУЛЬТАВЫМ ДОЙЛІДСТВЕ

Праблема паходжання "беларускай царкоўнай готыкі" з грунтоўных мастацтвазнаўчых пазіцый упершыню была разгледжана М. Шчакаціхіным у апошнім раздзеле яго "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва". Ужо ў загалоўку раздзела "Беларуская готыка XV-XVI сталецьця" дакладна сфармулявана наватарская навуковая канцэпцыя аўтара, які ў адрозненне ад папярэднікаў, расейскіх і польскіх даследчыкаў, разглядае архітэктуру як прадукт мастацкай творчасці, а не толькі як матэрыяльны фон пэўных клерыкальных і шавіністычных пазіцый, і акцэнтуе ўвагу на нацыянальных каранях з'явы.

У методыцы даследавання М. Шчакаціхін абапіраецца на эвалюцыянісцкую тэорыю паслядоўнага дыялектычнага развіцця стылявых характарыстык мясцовага культавага дойлідства, хаця, на наш погляд, перабольшвае ролю непасрэднага ўплыву на яго формаў нямецкай царкоўнай готыкі, які не быў адзінкавым і адбываўся, хутчэй, апасродкавана, праз замкавае будаўніцтва.

Для вывучэння генезісу і эвалюцыі стылю М. Шчакаціхін не меў магчымасці карыстацца натурнымі, нават візуальнымі абследаваннямі помнікаў беларускай готыкі, таму што на той час як гатычныя касцёлы Вільні, так і праваслаўныя чатырохвежавыя абарончыя цэрквы Гродзеншчыны, якія ён разглядае, знаходзіліся ў межах Заходняй Беларусі. Таму для навуковых высноў ён карыстаецца працамі В. Францэвіча, Я. Ядкоўскага, М. Сакалоўскага, П. Пакрышкіна, А. Шышка-Богуша і на падставе толькі пісьмовых і графічных крыніц робіць амаль фантастычны па скрупулёзнасці мастацтвазнаўчы аналіз касцёлаў св. Ганны і бернардзінцаў у Вільні, цэркваў-крэпасцяў у Сынковічах, Мала-Мажэйкаве (Мураванцы) і Супраслі. Разгляд помнікаў менавіта ў гэтай паслядоўнасці, што замацавалася і надалей, невыпадковы і адпавядае навуковай канцэпцыі даследчыка. Але, на наш погляд, адзначаная паслядоўнасць абумоўлена недастатковасцю на той час ведаў па даціроўках і агульнай колькасці помнікаў беларускай готыкі. Гэта, безумоўна, паўплывала на навуковую канцэпцыю даследчыка, у якой мы цяпер можам адзначыць шэраг недакладнасцяў храналагічнага, тапаграфічнага і структурнага характару. Пры пошуку крыніц форматворчасці ў манументальным культавым дойлідстве абарончага перыяду М. Шчакаціхін ідзе шляхам пошуку прамога візуальнага першаўзора, што больш уласціва выяўленчаму мастацтву, і амаль не зважае на сацыяльна-гістарычныя аспекты, з якіх звычайна і вынікае архітэктурны стыль. Аднак высокі прафесійны ўзровень тэарэтыка мастацтвазнаўства дазволіў М. Шчакаціхіну перакрыць тагачасныя "белыя плямы" навуковых ведаў нацыянальнай інтэнцыяй светапогляду і амаль дакладна акрэсліць складаны сімбіёз мастацкіх кампанентаў у фарміраванні "своеадменнай", па яго вызначэнню, беларускай царкоўнай готыкі.

Далейшыя гісторыка-архітэктурныя даследаванні, якіх, дарэчы, было няшмат (Ю. Ягораў, А. Квітніцкая, У. Чантурыя, Ю. Якімовіч), толькі часткова прысвечаныя помнікам гэтага стылю, у асноўным паўтараюць мастацтвазнаўчую канцэпцыю М. Шчакаціхіна. Гісторыкі М. Ткачоў і А. Кушнярэвіч, з'яўляючыся адначасова і археолагамі-практыкамі, значна ўдакладнілі вывучэнне помнікаў беларускай готыкі гісторыка-археалагічнымі дадзенымі, пакінуўшы, аднак, мастацтвазнаўчую распрацоўку праблемы на тым жа ўзроўні. Абапіраючыся на новыя матэрыялы, уведзеныя ў навуковы ўжытак гэтымі даследчыкамі,

і ў цэлым падзяляючы мастацтвазнаўчую канцэпцыю М. Шчакаціхіна, са свайго боку лічу неабходным у чым-нечым яе ўдакладніць.

Галоўным накірункам эвалюцыі беларускай готыкі ў культавым дойлідстве канца XV – першай паловы XVI ст. было, безумоўна, яе іманентнае фарміраванне на падставе сінтэзу гатычных форм і канструкцый цэнтральнаеўрапейскіх краін "цаглянай" готыкі: Чэхіі, Маравіі, Польшчы, а не толькі нямецкіх, з візантыйска-рускім тыпам крыжова-купальнага храма, "мацярынскую" аснову якога М. Шчакаціхін яўна не даацэньваў. Яшчэ двума важнымі кампанентамі гэтага працэсу былі таксама традыцыі мясцовага замкавага і драўлянага культавага будаўніцтва – у гэтых адносінах вельмі істотнымі з'яўляюцца праведзеныя М. Шчакаціхіным паралелі ў формах вежаў праваслаўных абарончых цэркваў і брамы Субач Дольнага замка ў Вільні. Своеасаблівасць дэкаратыўных прыёмаў беларускай готыкі, па нашаму меркаванню, у значнай ступені зыходзіць з пераасэнсавання і інтэрпрэтацыі мясцовымі будаўнікамі гатычных і протарэнесансных форм і канструкцый у кантэксце сакральнай этнаграфічнай сімволікі. Этапы тэктанічнай і эстэтычнай эвалюцыі чатырохвежавых храмаў перыяду абарончага дойлідства, хутчэй за ўсё, адбываліся ў наступнай паслядоўнасці: Полацкі Сафійскі сабор, Дабравешчанская царква ў Супраслі, затым амаль адначасова – Мікалаеўская ў Брэсце і Прачысценская ў Вільні, затым – Троіцкая ў Вільні і Міхайлаўская ў Сынковічах, апошняй, па ўсіх характарыстыках, была, відавочна, царква ў Мураванцы (Маламажэйкаўская). Архітэктура бернардзінскага касцёла ў Вільні з'явілася водгукам у каталіцкім храмавым будаўніцтве на архітэктуру тагачасных праваслаўных храмаў горада, а не іх першаўзорам, як лічыў М. Шчакаціхін.

Ацэньваючы рэтраспектыўна ўклад М. Шчакаціхіна ў вывучэнне беларускага дойлідства, нельга не здзіўляцца глабальнасці яго мыслення, шырыні мастацтвазнаўчых інтарэсаў, глыбіні навуковага аналізу і не быць удзячным за жыццё, аддадзенае беларускаму мастацтву.

Грышчанка Л.В., кандыдат гістарычных навук,
Беларуская дзяржаўная палітэхнічная Акадэмія (БДПА), Мінск

МІКАЛАЙ ШЧАКАЦІХІН І ПЕРШЫЯ МАСТАЦКІЯ ВЫСТАЎКІ НА БЕЛАРУСІ 20-х ГАДОЎ

Вядома, што мастацкія выстаўкі арганізоўваліся яшчэ ў канцы стагоддзя. У асноўным справамі выставак займаліся Таварыствы перасоўных выставак Масквы і Санкт-Пецярбурга. Большасць экспанентаў былі з Расіі. У пачатку стагоддзя кола выставачнай дзейнасці пашыралася за кошт мастакоў з Вільні, мелі прадстаўніцтва і мастакі з Захаду. Але толькі ў 20-я гг. Беларусь мела магчымасць арганізоўваць мастацкія сілы для таго, каб кансалідавацца духоўна, праз творчасць мясцовых мастакоў.

Першымі выстаўкамі былі Усебеларускія мастацкія экспазіцыі 1925–1930-х гг. Арганізатарамі і духоўнымі кіраўнікамі былі супрацоўнікі Інстытута беларускай культуры, якія маглі кансалідаваць пад сваімі лозунгамі нацыянальнага адраджэння моцныя навуковыя сілы. Яскравым прадстаўніком гэтай першай плеяды беларускіх навукоўцаў быў мастацтвазнавец, кандыдат мастацтвазнаўства Мікалай Мікалаевіч Шчакаціхін. Менавіта яму выпаў гонар стаць на чале мастацкага руху Беларусі 20-х гг. У каталогах выставак тых часоў заўсёды стаяла яго прозвішча -арганізатара, прадстаўніка Інбелкульта.

У Нацыянальным архіве РБ захаваліся матэрыялы адносна арганізацыі Першай Усебеларускай мастацкай выстаўкі (Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 1700), дзе можна ўбачыць, як паслядоўна адбываўся працэс падрыхтоўкі да гэтай вялікай падзеі. Па-першае, быў створаны Камітэт па арганізацыі выстаўкі, Праект арганізацыі, Палажэнне аб выстаўцы.

У кожным з гэтых дакументаў ёсць імя М. Шчакаціхіна, Я. Дылы, І. Цьвікевіча, Д. Жылуновіча і іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі 20-х гг., якая прыдавала вялікую ўвагу фарміраванню кадраў мастацкай інтэлігенцыі, накіраванню яе на звяршэнне творчых планаў, якія былі неабходны на першых этапах фарміравання беларускай мастацкай школы.

М. Шчакаціхін стаў аўтарам-апрацоўшчыкам экспанатаў аддзелаў сучаснага мастацтва і стваральнікам "Каталога аддзела старажытнага мастацтва". Ім было напісана некалькі артыкулаў на старонках друку, зроблены дасканалыя крытычныя агляды, вызначаны характэрныя напрамкі і г.д. Вось што напісаў мастацтвазнавец у Каталозе Першай выставы 1925 г.: "... Выстаўка павінна паказаць шырокім працоўным масам БССР тыя фактычныя дасягненні, якія мы маем у галіне прасторавых мастацтваў, з'явіцца лепшым спосабам падрахунку нашых мастацкіх сіл і, нават, свядомай спробай для нашых мастацкіх інстытуцый паасобных мастакоў, якая дазволіла б канкрэтна выявіць тыя мастацкія групоўкі альбо напрамкі, на якія мы можам у далейшым абапірацца ў справе культурнага і сацыяльнага будаўніцтва..."

У ўступным артыкуле да Каталога 2-й Усебеларускай мастацкай выставы М. Шчакаціхін пісаў: "Калі ў 1-й выстаўцы галоўную ролю грала, магчыма, колькасць удзельнікаў і іх экспанатаў у мэтах найбольш поўнага выяўлення ўсяго нашага творчага актыву, – дык цяпер асяродкам увагі павінна з'явіцца фармальная і тэматычная якасць экспанаваных твораў". Мэтанакіраваная творчая дзейнасць мастацтвазнаўцы спрыяла таму, што ў 1929 г. М. Шчакаціхін змог узяць на свае плечы справу апрацоўкі матэрыялаў з фондаў Дзяржаўнага мастацкага музея, вынікам чаго з'яўляецца Рэестр экспанатаў аддзела новачаснага беларускага малярства і разбярства, дзе кожны экспанат быў занатаваны па ўсіх правілах навуковай рэгістрацыі твораў мастацтва. Такі падыход да выяўленчага мастацтва Беларусі 20-х гг. даў свае станоўчыя вынікі: быў пабудаваны моцны мастацтвазнаўчы і навуковы фундамент для далейшага будаўніцтва нацыянальнай мастацкай школы, першыя абрысы якога змог убачыць сам ідэйны натхняльнік – Мікалай Мікалаевіч Шчакаціхін.

Налівайка Л.Д., навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ (ІМЭФ АН РБ), Мінск

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА Ў ДЗЕЙНАСЦІ ІНБЕЛКУЛЬТА

Вялікая справа Адраджэння аказала станоўчы ўплыў на развіццё мастацкай думкі, на фарміраванні новых напрамкаў выяўленчага мастацтва. Асноўны вынік – выданне першых старонак гісторыі беларускага мастацтва ў выглядзе "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва", аўтарам якіх з'яўляўся Мікалай Шчакаціхін. Выяўленчае мастацтва таго часу прадстаўляе сабой выключна цікавую мастацкую з'яву, якая прыцягвае да сябе ўвагу даволі паспяховымі спробамі карэкцый традыцыйных форм і наватарства, відавочнай кваліфікацыі асноўных груп мастацкіх твораў. Першымі мастацтвазнаўцамі і крытыкамі беларускага мастацтва 20-х гг. былі супрацоўнікі секцый Інбелкульта М. Шчакаціхін, М. Каспяровіч, В. Ластоўскі, Я. Дыла і інш.

Асабліва актыўна ўключыўся ў справу кансалідацыі мастацкіх сіл Беларусі рускі вучоны Шчакаціхін – дацэнт БДУ, кандыдат мастацтвазнаўства, які абараніў дысертацыю па гісторыі беларускага мастацтва. З 1925 г. М. Шчакаціхін працаваў у секцыях Інбелкульта, прыкладаючы ўсе сілы для стварэння сапраўднага навуковага фундамента беларускага мастацтвазнаўства. Цяжка ахапіць кола інтарэсаў вучонага. Ён выступаў у якасці крытыка на старонках часопісаў "Трыбуна мастацтва", "Працы БДУ", "Наш край", "Полымя", зб. "Віцебшчына", напісаў курс лекцый па гісторыі беларускага мастацтва для студэнтаў

БДУ, з'яўляўся стылістам навуковых выданняў ІБК, даследаваў старажытныя фрэскі Полацка, выдаў матэрыялы сваіх даследаванняў аб беларускім першадрукары і вучоным Ф. Скарыне, аб старажытнай віцебскай іконе XVIII ст., аб гравернай магілёўскай школе XVII–XVIII стст. У дапамогу краязнаўцам М. Шчакаціхін напісаў інструкцыю "Спосаб збірання матэрыялаў з беларускага мастацтва", у якой імкнуўся дапамагчы практыкам і краязнаўцам скласці правільнае ўражанне аб народных традыцыях, рысах нацыянальнага стылю.

Але асобую ўвагу М. Шчакаціхін удзяляў мастакам, вызначаючы іх ролю ў духоўным жыцці Беларусі 20-х гг. Таму нездарма ўсе першыя мастацкія выставы – ад 1925 па 1928 год – былі непасрэдна ім арганізаваны і не засталіся без яго ўвагі. М. Шчакаціхін – аўтар уводзін да каталогу выстаў, разам з В. Ластоўскім напісаў "Рээст твораў мастацтва з Дзяржаўнага мастацкага музея" (1928).

Да сяго часу мастацтвазнаўцы ўважліва вывучаюць той падрабязны крытычны аналіз М. Шчакаціхіна ў адносінах твораў выяўленчага мастацтва, якія экспанаваліся на усебеларускіх мастацкіх выстаўках.[1] Ім былі вызначаны наступныя творчыя напрамкі ў тагачасным мастацтве. Акадэмічна-натуралістычны – у творах М. Слепяна, Ю. Пэна, часткова В. Волкава. У гэтым жа напрамку былі выдзелены імпрэсіяністычныя ўклоны ў работах У. Кудрэвіча, А. Русецкага, дзе быў заўважаны ўплыў М. Урубеля, адзначаны фармалістычныя пошукі на выснове позняга "сезанізма" ў творах М. Філіповіча, А. Касталянскага і асабліва групы студэнтаў маскоўскага ВХУТЭМАСа. Часткова сюды набліжаўся А. Бразер. Другі напрамак – дэкаратыўна-стылізаванае, якое, па словах даследчыка, было "выразным і глыбока сучасным". Гэты напрамак быў характэрны галоўным чынам для беларускага мастацкага тэхнікума, вучнёўскія працы якога сведчылі аб тым, што іх аўтары імкнуліся да манументалізацыі натуры, да арнаментальнага яе вырашэння ў мэтах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Часткова да гэтага напрамку адносіліся мастакі, якія распрацоўвалі народны і старажытнабеларускі арнаменты і імкнуліся да дэкаратыўнай стылізацыі на нацыянальнай выснове. Да трэцяга напрамку адносіліся творы так званай "стылізаванай умоўнасці" у творах А. Быхоўскага, С. Юдовіна, часткова М. Эндэ, М. Лебедзевай і інш.

Прыклады, якія падкрэслівалі правільнасць вызначэнняў мастацтвазнаўцы, ёсць і зараз: распрацоўка беларускага арнамента ставілася ў віцебскім тэхнікуме як адна з асноўных задач дзеля прыдання ўсёй рабоце мастацка-вытворчага характару. Менавіта за гэты ўхіл мастацтвазнавец М. Каспяровіч пісаў наступнае: "Беларусізацыя мастацка-практычных прадметаў увасабляецца ў оперна-тэатральным стылі кампазіцыі". Сапраўды, матывы старажытна-беларускага арнамента былі выкарыстаны М. Лебедзевай у распрацаваным сцягу мастацкага тэхнікума, у кніжных афармленнях, такіх, як "400-лецце беларускага кнігадрукавання" (1926) і інш.

У 1927 г. М. Шчакаціхін паставіў пытанне фарміравання новага нацыянальнага беларускага мастацтва, яскравым прадстаўніком якога лічыў Міхася Філіповіча. Сярод яго твораў ("Вясенняе свята", "На Купалле", серыя на гістарычную тэматыку "Мінскі замак", "Бой на Нямізе", "Слова аб палку Ігараве") бачылася, што мастацтва на правільным шляху. Пазнаць і вывучаць народныя вытокі, перадаць у пластычных вобразах гістарычны, псіхалагічны, жыццёва-бытавы вобраз народа – вось шлях да новага мастацтва.

Пад уражаннем усесаюзнай выставы "Мастацтва народаў СССР", якая адбылася ў 1927 г. у Маскве, М. Шчакаціхін піша артыкул "Народнае мастацтва ў Савецкім Саюзе", дзе сцвярджае, што народнае мастацтва – "фундамент, на якім у наш час вырастае будынак новага нацыянальнага мастацтва". (Арсень Ліс. Мікола Шчакаціхін. Мн. 1968). На старонках розных выданняў друкаваліся артыкулы М. Шчакаціхіна, нават у Вялікай

[1] Шчакаціхін М. Сучаснае мастацтва Беларусі // Полымя. 1926. N 6; На шляхах да новага беларускага мастацтва // Полымя. 1927. N 2; Беларускае мастацтва да 10-годдзя юбілею Кастрычніка // Полымя. 1927. N 11.

Савецкай Энцыклапедыі 1927 г. у пятым томе ёсць артыкул "Беларускае мастацтва". Цяжка пераацаніць уклад М. Шчакаціхіна ў развіццё беларускага мастацтвазнаўства, усёй беларускай навукі і культуры.

Холадава І.П., дырэктар Мастацкага музея, Віцебск

М. ШЧАКАЦІХІН: НАШЫ ЗАДАЧЫ

У першым нумары часопіса "Трыбуна мастацтва" (1925 г.) М. Шчакаціхін надрукаваў артыкул "Нашы задачы", дзе, як ён лічыў, было пастаўлена пытанне аб знаходжанні шляхоў жывой сувязі з рабочымі масамі і аб прыбліжэнні мастацтва да рабочага гледача. Менавіта з гэтых часоў М. Шчакаціхін пачаў свае тэарэтычныя распрацоўкі ў галіне мастацкай творчасці 20-х гадоў. Але гэта былі не проста словы: М. Шчакаціхін станавіўся сапраўдным лідэрам-мастацтвазнаўцам, які кансалідаваў мастакоў. Аб гэтым сведчаць першыя беларускія мастацкія выставы 1925–1928 гадоў, калі рабіліся першыя спробы сістэматызаваць мастацкую творчасць. Яскравым доказам цікавасці да твораў мастацтва ў такім відзе, як жывапіс, служаць мастацтвазнаўчыя артыкулы, якія пісаў М. Шчакаціхін да каталогаў першай, другой, трэцяй Усебеларускіх мастацкіх выставак. Найбольш поўна гэтая праца завяршылася выданнем "Сучаснае беларускае мастацтва" з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея. Гэта быў 1929 год. Спецыфічны каталог з артыкулам, біяграфічнымі даведкамі 53 твораў мастацтва.

Уступ да каталога вызначаў два важных моманта ў арганізацыі музейных збораў: арганізацыйны і непасрэдна творчы, які заключаўся ў "набліжэнні тэматыкі мастацкіх твораў да інтарэсаў і патрэб сацыялістычнага культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, нарэшце ў свядомым шуканні нацыянальных форм і своеадметнага стылю". Такі падыход да праблем фарміравання музейных фондаў, да стварэння свайго "твару" кожнаму мастацкаму музею, на наш погляд, з'яўляецца вельмі станоўчым. Беларускія музеі, як і ўсе музеі свету, якія маюць назву "нацыянальныя" альбо "дзяржаўныя", павінны займацца зборам сваіх нацыянальных каштоўнасцяў. У прыватнасці, Віцебскі мастацкі музей збірае ў свае фонды творы мастацтва мясцовых мастакоў усіх эпох і напрамкаў. Пашыраюцца фонды за кошт твораў мастакоў-выхаванцаў віцебскіх мастацкіх школ, ад прыватнай майстэрні Ю. Пэна, твораў самога майстра і яго вучняў да сучасных мастакоў: творчых груп мастакоў "Квадрата", віцебскіх акварэлістаў і інш.

Шаранговіч Н.В., Мінск

ШЧАКАЦІХІН І ПЫТАННІ ТЭОРЫІ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

Праблема вывучэння не толькі гісторыі, але і тэорыі мастацтва сталася вельмі важнай і надзённай на сённяшні дзень. У мастацтвазнаўчых колах яўна не хапае моцных тэарэтыкаў мастацтва і мастацкага працэсу, з-за чаго асмысленне гэтых пытанняў ідзе марудна і павярхоўна. Але што характэрна, да неабходнасці стварыць тэарэтычную базу для разумення беларускага мастацтва неаднаразова звяртаўся яшчэ Шчакаціхін у сваіх артыкулах 20-х гг.

Гаворачы пра незгуртаванасць, раз'яднанасць мастакоў, ён адзначае іх немажлівасць стварыць адзіны супольны мастацкі струмень. І вызначыць, як галоўнае, пытанне нацыянальнага стылю ў мастацтве. Шчакаціхін звяртае ўвагу на тое, што многія даследчыкі мастацтва робяць знак роўнасці паміж нацыянальным стылем і народным мастацтвам

(што доўгі час заставалася заганнай практыкай і для сённяшніх беларускіх мастацтвазнаўцаў). Шчакаціхін доказна даводзіць, што стыль не можа абмяжоўвацца толькі народнай вопраткай і арнаментам, нібыта ў галіне вобразных мастацтваў Беларусь нічога слушнага не зрабіла апроч арнаменту. Таму і нацыянальнае мастацтва тлумачыцца як бытавое, і гэта ў лепшым выпадку ўтрымлівае мастакоў у межах сялянскіх матываў або дэкаратыўных узораў, узятых з вясковых вышыванак і паяскоў.

Шчакаціхін падкрэслівае, што народнае мастацтва заслугоўвае ўвагі, але гэта не ўсё мастацтва цалкам. Гэта водгук беларускага мастацкага стылю, які развіўся на працягу стагоддзяў, спыніўшыся толькі ў канцы XVIII ст. пад расейскай уладай. Кожны мастацкі стыль утвараецца з гістарычнай лініі развіцця народу.

У дакладзе будуць пададзены погляды Шчакаціхіна на сучаснае рэвалюцыйнае, авангарднае мастацтва, на пытанні беларускай нацыянальнай школы мастацтва з пункту гледжання стварэння яе тэарэтычнай базы.

...

Высоцкая Н.Ф. , доктор искусствоведения, профессор БГУ, Минск

СПЕЦИФИКА БАРОККО В БЕЛОРУССИИ

I. Предпосылки

1. Вхождение белорусских земель в состав Великого княжества Литовского (ВКЛ) и Речи Посполитой (XIV–XVIII). Вильно – крупнейший центр белорусской культуры.
2. Расположение Белоруссии на стыке православного Востока и католического Запада. Принятие православия (988). Появление католицизма (X). Униатство – кардинальный вопрос в истории и культуре Белоруссии (к. XVI–XVIII). Католические ордена. Православные братства. Регламентация заказов.
3. Большое число живописцев, резчиков, скульпторов, золотых дел мастеров в Белоруссии и Вильно (не менее 2677). Художники – выходцы из Италии, Франции, Германии, Испании, Польши, Литвы, Украины, России, Белоруссии.
4. Роль цехового производства в развитии и совершенствовании мастерства в XV–XVIII вв.
5. Наследственные владения магнатов, роль личности магната в становлении центров культуры и развитии видов искусства.
6. Своеобразие мировоззрения магнатов в Белоруссии. Сарматизм. Заупокойный культ. Погребальный портрет и хоругвь (конклюзии). Мемориальная пластика и ее роль в формировании и развитии всех видов искусства.
7. Три слоя культуры Белоруссии XVI–XVIII вв.: искусство, обслуживающее магнатов, шляхту и народные массы.

II. Особенности барокко Белоруссии

8. Становление барокко на базе основных европейских стилей (романского, готики, Ренессанса), развивающихся в неразрывном единстве с византийско-русскими и местными традициями XII–XVI вв.
9. Периодизация барокко – искусство ансамбля:

    а) раннее барокко – к. XVI – первая половина XVII в.;

    б) зрелое барокко – вторая половина XVII в.

В памятниках прикладного искусства первой половины – середины XVII в. видны рецидивы готики, Ренессанса, итальянского и нидерландского маньеризма;

    в) позднее барокко – XVIII в. Рококо – 1725–1750 – в архитектуре, 1730–1775 – в скульптуре, живописи и прикладном искусстве. В симбиозе с барокко – 1760–1780 гг. – становление классицизма.

10. Принятие такой периодизации позволяет:

    а) отнести формирование национального варианта барокко к середине – второй половине XVII в.;

    б) проследить "перетекание" этого варианта барокко в Московию во второй половине XVII в., где работало не менее 138 художников, выходцев из Белоруссии;

в) выявить взаимовлияние барокко Белоруссии, Украины, Литвы, Польши, России и стран восточно-европейского ореала в XVII–XVIII вв.;

г) уточнить, что в Белоруссии развитие барокко идет почти одновременно с западноевропейским искусством. Наличие национального варианта этого стиля, своей художественной школы связано с существованием в Белоруссии мощных истоков местного искусства, опирающегося на культуру Византии и Древней Руси X–XV вв.

Карэлін У.Р., старшы навуковы супрацоўнік, АН РБ, Мінск
Мельнікаў М.П., малодшы навуковы супрацоўнік
Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ
(ІМЭФ АН РБ), Мінск

ПАРАЎНАННЕ РАСПАЎСЮДЖАННЯ ІЗВОДАЎ ПАКРОЎ І АПЁКА НА БЕЛАРУСІ

Статыстычная апрацоўка іконаграфічных сюжэтаў, якую мы распачалі ў апошнія гады, заснавана на тым архіўным матэрыяле, які быў сабраны падчас экспедыцыйнай работы па даследаванню рухомых помнікаў мастацкай культуры ў культавых пабудовах Беларусі. Гэта - пашпарты з апісаннямі абразоў, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама негатывы з фотафіксацыяй гэтых помнікаў агульнай колькасцю каля 30 тыс. адзінак захавання. Даследаванні грунтуюцца на спісе абразоў XVII–XIX стст., які створаны супрацоўнікамі аддзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АНБ. З яго намі выбрана звыш 5000 помнікаў, якія маюць найбольшае мастацкае значэнне.

У дадзеным паведамленні зроблена спроба аналізу двух сюжэтаў, прысвечаных Маці Божай, якія сустракаюцца на Беларусі. Гэта Пакроў і Апёка.

Іканаграфія Пакрова звязана з падзеяй, якая, па легендзе, адбылася ў 910 г. у царкве Маці Божай ва Улахернах у Канстанцінопалі. Падчас усяночні святы Андрэй, дзеля Хрыста юродзівы, падняўшы вочы да неба, убачыў Божую Маці ў акружэнні анёлаў і святых, якая стаяла на паветры. Яна доўга малілася за хрысціян, а потым зняла са сваёй галавы покрыва і распасцерла яго над людзьмі, якія былі ў храме, абараняючы іх ад ворагаў бачных і нябачных.

Культ Пакрова знайшоў шырокае распаўсюджанне на Русі. У XIV ст. склалася поўная іканаграфічная кампазіцыя гэтага сюжэта. Звычайна у цэнтры, на фоне храма, знаходзіцца выява Маці Божай з пакровам у руках. Унізе, на амбоне, стаіць Раман Сладкапевец, паабапал якога знаходзяцца фігуры апосталаў, мучанікаў і свяціцеляў – Андрэя Юродзівага і Епіфанія.

Уключэнне фігуры Рамана Сладкапеўца, які жыў амаль на 500 гадоў раней, падкрэслівае тэму ўслаўлення Маці Божай. Згодна падання, аднойчы пасля гарачай малітвы архідыякан Раман убачыў Божую Маці, якая ўручыла яму світак і загадала яго праглынуць. Прачнуўшыся, Раман адчуў натхненне і праспяваў "Дева днесь" і іншыя песні. Да таго ж свята Пакрова і дзень услаўлення Рамана Сладкапеўца супадаюць па даце – 1 кастрычніка па старому стылю.

У краінах Заходняй Еўропы культ заступніцтва Маці Божай знайшоў сваё праяўленне ў некалькі іншым плане – плане міласэрнасці і даравання. У якасці ахоўнага элемента тут выкарыстоўваецца не покрыва з галавы Маці Божай, а яе плашч. Матыў апякунскага плашча яшчэ з раннехрысціянскіх часоў вядомы ў Еўропе ў тэкстах літургічных, пазней тэалагічных, а таксама ў містычных бачаннях. Па аднаму з паданняў, бенедыкцінскай манашцы Гертрудзе, якая памерла ў 1302 г., было яўленне: пад плашчом Маці Божай

знаходзілі прытулак грэшнікі, якія атрымоўвалі там дараванне грахоў і абарону.

Іконаграфічна гэта ўвасобілася ў сюжэце пад назвай Маці Божая Misericordiae, што значыць Міласцівая, вядомая на Беларусі як Апёка. Звычайна іканаграфія гэтага сюжэта уяўляе сабой франтальную выяву Маці Божай, якая сваім плашчом ахінае ўсіх, хто мае патрэбу ў яе абароне і міласці.

Як ужо адзначалася раней, на Беларусі сустракаюцца як адзін, так і другі ізводы. Найбольш часта сустракаецца Пакроў. Са 110 разгледжаных намі абразоў 92 адносяцца да Пакрова і толькі 18 – да Апёкі. Геаграфічна Пакроў больш шырока распаўсюджаны ў Палескім рэгіёне – Гомельскай і Брэсцкай вобласцях. Тут ён складае ў сярэднім 1,8% ад агульнай колькасці абразоў. Найбольш слаба ён прадстаўлены ў Мінскай і Гродзенскай вобласцях – каля 1%.

Асноўная частка абразоў з выявай Апёкі знаходзіцца ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Яны прысутнічаюць там як у праваслаўных, так і ў каталіцкіх храмах.

Мы хочам звярнуць увагу на шырокую трансфармацыю іконаграфічных схем, якая, магчыма, з'яўляецца вынікам адначасовага існавання гэтых двух ізводаў.

Так, на абразах з сюжэтамі Пакрова маюцца наступныя адхіленні ад кананічнай схемы. На абразе з Рэчыцкага раёна Маці Божая не трымае амафор у руках, а ён ляжыць у яе на лакцях. На абразе з Пінскага раёна мы бачым змену акцэнтаў у памерах выяваў Рамана Сладкапеўца і Маці Божай. Тут фактычна наглядна адлюстраваны змест падзеі ва Улахернскім храме. На абразе з Аршанскага р-на Маці Божая ў малельнай позе, з амафорам у руках, звяртаецца да благаслаўляючага Хрыста, выступаючы ў ролі заступніцы людзей перад богам. Такіх іконаграфічных схем сустракаецца даволі многа.

Арыгінальнымі з'яўляюцца сюжэты Пакрова з выявай адной Маці Божай. На абразе з Лунінецкага раёна Божая Маці з амафорам у руках стаіць на воблаках над выявай мясцовай царквы.

Цяпер прывядзем некалькі аналагічных прыкладаў для сюжэта Апёка. На абразе з Карэліцкага раёна мы бачым мадыфікацыю Апёкі, калі над Маці Божай прысутнічае выява Св. Тройцы. Падобны сюжэт Апёкі прысутнічае і на абразе з Астравецкага касцёла. Тут плашч Маці Божай падтрымліваюць анёлы, а сама яна трымае ў руках кавалачкі тканіны – шкаплеры, адкуль і паходзіць назва Маці Божая Шкаплерная.

Пакольк сюжэты Апёкі знаходзіліся як у цэрквах, так і ў касцёлах, сустракаюцца абразы, у якіх адчуваецца сумяшчэнне абодвух ізводаў. Так, на абразе з Лунінецкага раёна мы бачым іконаграфічную схему Пакрова. Але замест амафора Маці Божая ахінае ніжнюю групу плашчом, які падтрымоўваюць анёлы. На абразе са Слонімскага раёна наадварот: у кампазіцыі Апёкі прысутнічаюць персанажы Пакрова, а ў руках Маці Божая трымае яшчэ і амафор.

Пікулік А.М., мастацтвазнаўца, н.с. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН РБ (ІМЭФ АН РБ), Мінск

М.М. ШЧАКАЦІХІН - ДАСЛЕДЧЫК МАГІЛЁЎСКІХ СТАРАДРУКАЎ

Сярод навуковых інтарэсаў М.М. Шчакаціхіна 20-х гадоў значнае месца займае інтарэс да беларускіх старадрукаў. Гэта заканамерна. У рэспубліцы шырока адзначалася 400-лецце беларускага кнігадрукавання, праводзіліся спецыялізаваныя мастацкія выстаўкі, рыхтаваўся юбілейны навуковы зборнік. Вядома таксама, што з 1925 года М.М. Шчакаціхін працаваў у Інбелкульце, а з 1926 года нават узначальваў створаную пры інстытуце Камісію гісторыі мастацтва, дзе займаўся непасрэдным зборам і вывучэннем мастацкіх

каштоўнасцяў, значную частку якіх і займалі беларускія кірылічныя выданні XVI—XVIII стст. Вынікам іх вывучэння з'явіўся шэраг змястоўных публікацый, прысвечаных мастацтву кнігі: "Васіль Вашчанка — магілёўскі гравер канца XVII — пачатку XVIII сталецця" (1925); "Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны" (1926); "Да пытання аб храналогіі "Малой падарожнай кніжкі" Скарыны" (1928). Калі інтарэс да асобы і творчай спадчыны Францыска Скарыны быў заканамерным, абумоўленым усёй гісторыка-культурнай сітуацыяй на Беларусі (вобраз беларускага асветніка і першадрукара выкарыстоўваўся і мастакамі, і літаратарамі, і навукоўцамі як сімвал нацыянальнага адраджэння Беларусі), то з'яўленне артыкула, спецыяльна прысвечанага творчасці магілёўскага мастака, было даволі нечаканым.

У часы М. Шчакаціхіна мастацтва магілёўскіх старадрукаў было амаль невядомым на Беларусі. Рускія гісторыкі і бібліёграфы XIX стагоддзя У. Сопікаў, А. Мілавідаў, У. Ундольскі, І. Каратаеў, П. Пекарскі склалі бібліяграфічныя апісанні некаторых магілёўскіх выданняў.[1] У кнізе Д.А. Ровинского "Русские граверы и их произведения с 1564 года до основания Академии художеств" упершыню закраналіся пытанні мастацкага аздаблення магілёўскіх старадрукаў.[2] Аўтар назваў магілёўскіх граверaў Максіма і Васіля Вашчанкаў, склаў спіс іх твораў. На жаль, ён не пазбегнуў памылак: Д.А. Равінскі сцвярджаў, што ў Магілёве працаваў гравёр Афанасій Вашчанка, ён назваў толькі падпісныя (і далёка не ўсе) гравюры мастакоў, сцвярджаў, што гэтыя творы цалкам належаць кіева-львоўскай гравернай школе.

Безумоўна, адзначаныя даследаванні былі вядомы М.М. Шчакаціхіну. Абапіраючыся на гэтыя трактаты, а таксама гістарычныя нарысы Ф. Жудро, беларускі мастацтвазнаўца значна пашырыў уяўленне аб даследаванай з'яве.[3] Абмежаваны рамкамі невялікага артыкула, М.М. Шчакаціхін асноўную ўвагу ўдзяляе творчасці Васіля Вашчанкі, якую ён упершыню разглядае поўна, у эвалюцыі і кантэксце развіцця ўсёй беларускай культуры XVII — пачатку XVIII ст.

Асноўны метад, які выкарыстоўвае даследчык, — уважлівы і паслядоўны стылістычны аналіз мастацкіх твораў. Вывучаючы падпісныя гравюры мастака, М. Шчакаціхін пераканаўча выдзяляе ўласцівыя В. Вашчанку мастацкія прыемы, яго манеру маляваць, выяўляць форму, выкарыстоўваць перакрыжаваную штрыхоўку, лінію, пляму. На падставе гэтых назіранняў даследчык здолеў атрыбуціраваць шэраг ананімных магілёўскіх гравюр, упэўнена аднесці іх да твораў В. Вашчанкі. Дарэчы, і сёння, калі магілёўскія старадрукі вывучаны больш поўна, большасць атрыбуцый М. Шчакаціхіна здаюцца цалкам вернымі.

Тонкае адчуванне мастацтва, шырокая эрудыцыя дазволілі навукоўцу зрабіць шэраг вельмі важных тэарэтычных заўваг, якія таксама мелі важнае значэнне для далейшага вывучэння матэрыялу. Так, М. Шчакаціхін упершыню ўводзіць у беларускае мастацтвазнаўства паняцце "магілёўская школа гравюры", маючы на ўвазе перш за ўсё творчасць мастакоў Максіма і Васіля Вашчанкаў. Менавіта ў такім кантэксце гэты тэрмін і зацвердзіўся ў беларускім мастацтвазнаўстве і выкарыстоўваецца да сённяшняга дня.[4]

Напісаны цікава, эмацыянальна і жыва, артыкул М. Шчакаціхіна карысны не толькі для гісторыкаў кнігі, але і для аматараў архітэктуры, жывапісу, скульптуры, бо аўтар не абмяжоўвае сябе і дае вельмі слушныя заўвагі, параўнанні і аналогіі, якія ярка сведчаць аб грунтоўнасці яго ведаў і шырокай эрудыцыі.

Увогуле, даследаванне М. Шчакаціхіна аб магілёўскіх старадруках і сёння, калі мінула ўжо 60 гадоў з часу яго стварэння, можа разглядацца як узор мастацтвазнаўча-навуковага твора.

---

[1] Сопиков В.С. Опыт Российской библиографии. Ч. 1—5. Спб. 1813—1821; Миловидов А.И. Описание славянских русских книг Виленской публичной библиотеки. 1491—1800. Вильно. 1908; Ундольский В.М. Очерк славяно-русской библиографии. М. 1871; Каратаев И. Хронологическая роспись славянских книг, напечатанных кирилловскими буквами: 1491—1730. Спб. 1861; Пекарский П. Наука и литература в России при Петре Великом: В 2-х т. Спб. 1880—1882.

[2] Ровинский Д.А. Русские граверы и их произведения с 1564 года до основания Академии художеств. М. 1880.

[3] Жудро Ф. История могилевского Богоявленского братства. Могилев. 1890; Богоявленский братский монастырь в Могилеве. Могилев. 1899.

[4] Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5-ці т. Т. 3. Мн. 1986.

Пятровіч Н.І., таварыства "Веды", Мінск

СЛУЦКІ МЕЦЭНАТ КНЯЗЬ ГЕРАНІМ ФЛАРЫЯН РАДЗІВІЛ

Геранім Фларыян Радзівіл (1715—1760) падчашы літоўскі, харунжы Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), малодшы сын канцлера ВКЛ Караля Станіслава Радзівіла і Ганны з Сангушкаў. Пасля смерці бацькі з 4-гадовага ўзросту выхоўваўся маці, атрымаў хатнюю адукацыю. З 1730 да 1735 г. падарожнічаў па замежных краінах, дзякуючы чаму добра валодаў французскай і нямецкай мовамі. У адрозненне ад бацькі і старэйшага брата Міхала Казіміра Рыбенькі, вядомых сваёй мяккасцю і лагоднасцю, пакінуў па сабе памяць дзівака з эксцэнтрычным, жорсткім і помслівым характарам. Па сведчанню сучаснікаў, быў чалавекам сярэдняга розуму, скупым, любіў угодніцтва і пахвальбы, непрыязна, а часам нават з нянавісцю ставіўся да брата Міхала Казіміра. З-за цяжкага характару Гераніма Радзівіла дзве жонкі развяліся з ім, а трэцяя ледзьве датрывала да яго смерці. Надзвычай строгім і бязлітасным быў ён да сваіх падданых і слуг і нанятых на службу людзей нават шляхецкага паходжання. За найменшую правіннасць без суда караў хлыстом і турэмным затачэннем. Турмы ў яго замках заўсёды былі перапоўненыя.

У 1731 г. княгіня Ганна праз свайго паверанага ў Мангейме сасватала сына з адной з трох дачок Рэнскага палаціна Юзафа Караля. У выніку быў падпісаны перадшлюбны кантракт, па якому яшчэ да заключэння шлюбу Геранім Радзівіл атрымаў правы на валоданне так званымі нейбургскімі маёнткамі, г.зн. Слуцкім княствам, з правам пакінуць іх за сабой нават у выпадку разрыву шлюбнага дагавору. Але да жаніцьбы справа не дайшла, бо пазнаёміўшыся бліжэй са сваім будучым зяцем, які ў 1733 г. прыехаў у Мангейм, каб ажаніцца, палацін пажадаў лепш страціць свае маёнткі, чым аддаць дачку за Гераніма Радзівіла. Апошні, вярнуўшыся дадому, у лістападзе 1735 г. уступіў ва ўладанне атрыманымі маёнткамі. Аднак фармальна паўнапраўным уладальнікам Слуцка і Слуцкага княства ён стаў толькі ў маі 1744 г., сплаціўшы ўсім прэтэндэнтам на гэтыя землі 6 млн. злотых. У 1746 г. пасля смерці маці атрымаў у спадчыну маёнтак Белая на Падляшшы.

Князь Геранім Фларыян Радзівіл быў малаактыўным у грамадскім і палітычным жыцці, не дамагаўся званняў і пасад, рэдка бываў пры двары караля, дзе, аднак, з ім лічыліся і нават пабойваліся. Пры дварах у Белай і Слуцку ўтрымліваў 6 тысяч коннага і пешага войска, вымуштраванага на прускі лад. Апрача таго, князь Геранім трымаў гарнізоны з казакаў і стральцоў у замках. Афіцэрамі ў войску былі пераважна выхадцы з Курляндыі і Латарынгіі. Для асабістай аховы сфарміраваў атрад так званых грандмушкецёраў.

Геранім Радзівіл не прызнаваў каралеўскай улады ні ў справах кіравання сваімі маёнткамі, ні, тым больш, свайго войска. Падаткаў на ўтрыманне войска Рэчы Паспалітай ён не плаціў, лічачы, што досыць многа робіць для дзяржавы, утрымліваючы ўласнае войска, якое ў выпадку неабходнасці гатовы паставіць на яе абарону. У лютым 1744 г. з дапамогай свайго войска жорстка задушыў паўстанне ў Крычаўскім старостве, загадаўшы жыўцом пасадзіць на кол 18 найбольш актыўных паўстанцаў, аб чым з гонарам успамінаў у сваім "Дыярушы... 1749—1756". У асноўным жа войска выкарыстоўвалася для парадаў, розных забаў, гульняў у вайну з т.зв. каралём славацінскім.

Акрамя ваенных забаў, гульняў, частых паляванняў, Геранім Радзівіл быў вялікім аматарам музыкі і тэатра. У другой палове 40-х гг. ён ужо меў аркестр, які складаўся з музыкаў высокага прафесійнага ўзроўню. На карысць гэтага сведчыць і тое, што часта

аркестр князя Гераніма запрашалі ў Нясвіж. Музыкі ў аркестры былі пераважна чэшскага, нямецкага, аўстрыйскага і часткова мясцовага паходжання. У сярэдзіне 50-х гг. колькасць іх дасягнула 40 чалавек.

У 1750 г. князь Геранім вырашыў заснаваць свой тэатр, што было зроблена ў пачатку 1751 г. у Слуцку, а годам пазней і ў Белай. Трупа складалася з артыстаў, запрошаных з Прусіі, Італіі, Чэхіі, а таксама з Ведня. Спачатку слуцкі тэатр сталага будынка не меў і спектаклі ставіліся то ў будынку манежа, то ў замкавай скарбніцы. У ліпені 1752 г. былі распачаты працы па прыстасаванні пад тэатр будынка старога суднага дома, што стаяў непадалёк ад Старога замка, за касцёлам бернардынцаў. У кастрычніку таго ж года работы ў асноўным былі завершаныя і спектаклі пачалі ставіць на сталай сцэне. Аднак ужо ў 1756 г. будынак пачаў практычна развальвацца і таму ў 1758 г. было распачата будаўніцтва новага "камедыянхаўза", якое закончылася ў верасні 1759 г. Новы будынак тэатра, па словах самога князя Гераніма, прыгажэйшы, чым у Белай, быў добра і прыгожа абсталяваны: меў партэр з высланымі і абабітымі мяккім сукном лаўкамі, навакол партэру размяшчаліся ложы з такімі ж выгоднымі лаўкамі ў іх. Сцэны і столь тэатра былі ўпрыгожаныя мноствам вялікіх і малых люстэрак. Перад сцэнай было прадугледжана спецыяльнае месца для аркестра, сцэна мела вельмі прыгожыя заслоны з маляўнічымі дэкарацыямі. На сцэне слуцкага тэатра ставіліся оперы, камедыі з выкарыстаннем тэатраў марыянетак і ценяў, балетныя спектаклі.

Часта ў спектаклях удзельнічалі мясцовыя кадэты. Спектаклі ставіліся на нямецкай і італьянскай мовах, таму для лепшага разумення іх гледачамі князь Геранім патрабаваў, каб у кожным спектаклі выкарыстоўваліся марыянеткі.

У 1756 г. Геранім Радзівіл заснаваў у Слуцку першую на Беларусі балетную школу, у якую адбіраліся 8–10-гадовыя дзеці мясцовых мяшчан. У школе працавалі выдатны італьянскі балетмайстар і педагог Антоні Пуціні, знакаміты французкі танцор і балетмайстар Луі Максіміліян Дзюпрэ. Дарэчы, Антоні Пуціні адзначаў, што дагэтуль яму яшчэ ніколі не даводзілася вучыць такіх таленавітых дзяцей. За адносна кароткі час свайго існавання слуцкая балетная школа падрыхтавала даволі многа выдатных танцораў, сярод якіх быў і першы беларускі балетмайстар Антон Лойка. Слуцкая балетная трупа славілася сваім высокім прафесіяналізмам і часта выступала на нясвіжскай сцэне.

Пасля смерці ў 1760 г. князя Гераніма Фларыяна Радзівіла спадкаемцам яго застаўся Міхал Казімір, які палічыў, што бессэнсоўна ўтрымліваць некалькі "камедыянхаўзаў" і таму ўвосень таго ж года перавёў артыстаў у свой нясвіжскі тэатр і туды ж перавёз тэатральнае абсталяванне і рэквізіт.

Пуцко В.Г., Калуга

ИСКУССТВО БАРОККО И ВИЗАНТИЙСКАЯ ТРАДИЦИЯ В РОССИИ: УРОКИ ИСТОРИЧЕСКОГО ВЫБОРА

Приобщение Московской Руси к западноевропейской культуре прослеживается с к. XV в. Его начало связано с работой итальянских зодчих в Москве и проникновением в иконопись отдельных элементов и целых схем из католической иконографии. Наиболее радикальные заимствования встречали осуждение со стороны ревнителей византийской традиции (архиеп. Геннадий, дьяк И.М. Висковатый). В отличие от ювелирного искусства и оформления рукописной, а также печатной книги, икона оставалась надежно защищенной от западной культурной экспансии авторитетом соборных решений (Стоглавый собор 1551 г.).

Кардинальное изменение ситуации происходит в России лишь в период патриаршества Никона (1652–1658), ознаменованного церковными реформами и вызванным ими расколом. Ориентация на современные греческие образцы потенциально вела к усвоению опыта итало-критских мастеров. Участие Симона Ушакова в походе под Смоленск в качестве топографа способствовало широкому ознакомлению с польской живописью. В марте 1656 г. зачислен на службу в Оружейную палату польский шляхтич из Смоленска Станислав Лопуцкий. Начальник Оружейной палаты боярин Б.М. Хитрово и возглавивший иконописную мастерскую С. Ушаков всемерно способствовали внедрению "фряжского дела". Т.о., шлюзы, сдерживавшие проникновение стиля барокко в московскую иконопись, были открыты.

С середины XVII в. идет непрерывный процесс "обмирщения" русской иконописи, выражающийся в наполнении традиционных иконографических схем западными художественными формами, сопровождаемый усилением декоративного начала. На первых порах отчетливо проступает роль ренессансных образцов с элементами готики немецко-польского круга. Широко используется гравюра. Соотнесение икон из церкви Георгия Неокесарийского на Полянке (1686) и из церкви Введения во храм, что в Барашах близ Покровки в Москве (ок. 1700 г.), указывает на резкий перелом в отношении к византийской традиции.

Иконопись петровского времени весьма разноликая. Но ее наиболее светские варианты дают основание утверждать, что временами остается лишь тематика композиций. Грань между иконой и жанровой сценой оказывается почти стертой. О моленном образе нет и речи. Однако выкорчевать византийскую традицию было нелегко.

Сазанович Н.В., Минск

ПОЭТИКА БАРОККО М.К. САРБЕВСКОГО

Барочная поэтика М.К. Сарбевского (1595–1640) включает основные представления, экзистенции и эстетические категории, характерные для барочного миросозерцания.

1. Апология поэзии. Аналогия между творческим актом и процессом сотворения мира. Уподобление поэтической деятельности Божественной (эстетическая категория In-star Dei = подобно Богу). Вымысел (fictio) – душа поэзии. Поучение – функция поэтического произведения. Топосы furor poeticus (Божественное вдохновение), particula divinitatis (Божья искра).
2. Эстетическая категория подражания (mimesis). Поэзия – искусство миметическое. Подражание как творческий процесс. Барочный аристотелизм Сарбевского.
3. Понятие "возможности" (possibilitas, possibile) – фундаментальное в концепции поэзии Сарбевского.
4. Аллегорическая концепция поэзии (трактаты Сарбевского "De perfecta poesi", "Dii gentium"). Аллегория как способ познания универсалий.
5. Задача поэзии – улучшение Природы. Осведомленность поэта-творца должна быть равнозначна сумме знаний о мире (понятия "ученая поэзия" = "poesia doctus", "ученый поэт" = "poeta doctus").

Барочная теория консептизма. Остроумие как тип эстетической и художественной гармонии, организующей Текст и культурное пространство барокко. Tonoc discors concordia vel concors discordia = несогласованная согласованность или согласованная несогласованность.

Влияние поэтики М.К. Сарбевского на театральную эстетику, школьную драматургию иезуитских коллегиумов Беларуси XVII в.

Сакалоўскі У.Л., Мінск

БЕЛАРУСКАЕ АДРАДЖЭННЕ І ДАЛУЧЭННЕ НЯМЕЦКІХ ВУЧОНЫХ ДА ДАСЛЕДАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Першае значнае далучэнне Нямеччыны да беларускай культуры адбылося ў к. XIX ст. Яно звязана з дзейнасцю нямецкага славістычнага часопіса "Архіў славянскай філалогіі" і такіх вядомых еўрапейскіх славістаў, як В. Ягіч, А. Брукнер, Я. Карскі, І. Паліўка, М. Мурко.

Але, вядома, яшчэ больш істотнае судакраненне нямецкай грамадскасці з нашым краем адбылося пазней, падчас першай Сусветнай вайны, калі кайзераўскія войскі захапілі Беларусь. Менавіта тады, пасля многіх стагоддзяў забароны, была афіцыйна прызнана немцамі (1916) беларуская мова, адкрыты першыя беларускія школы, праводзілася значная культурна-асветніцкая праца.

Нягледзячы на жорсткі акупацыйны рэжым, Нямеччына ў многім садзейнічала не толькі нашаму далучэнню да цывілізаваных асноў еўрапейскага жыцця (адкрыццё медпунктаў і бальніц, пашырэнне чыгунак і вузкакалеек, будаўніцтва дарогаў і шасэ), але і ў пэўнай меры спрыяла развіццю нашай нацыянальнай свядомасці.

Тады ж беларуская культура знайшла шырокае адлюстраванне ў нямецкай прэсе: "10 армейскай газеце", Гродненскай газеце, "Баранавіцкай нямецкай ваеннай газеце", "Навагрудскай ваеннай газеце", "Пінскай газеце", "Беластоцкай газеце", "Віленскай газеце" і інш., што выдаваліся на акупіраванай тэрыторыі. На іх старонках змяшчаліся шматлікія: артыкулы, рэцэнзіі, паведамленні, эсэ, апавяданні, вершы, малюнкі, а таксама пераклады з беларускай літаратуры і вуснай народнай творчасці.

Значны ўклад у даследаванне беларускай культуры, у знаёмства з ёю нямецкай грамадскасці ўнеслі тады нямецкія вучоныя: прафесары Брэслаўскага ўніверсітэта Рудольф Абіхт і Паўль Дзільс, Берлінскага ўніверсітэта Альберт Ірель, навукоўцы і аматары: Эрых Цэхлін, і Фрыц фон Віпарт, Вальтэр Егер і Карл Брэмер і шмат інш.

Аднак сярод іх найбольшая роля належала, безумоўна, Р. Абіхту. У 1916 г. ва ўзросце 66 гадоў ён бярэцца за вывучэнне беларускай мовы і ў хуткім часе распачынае чытанне яе ўніверсітэцкага курса. А ў 1917/18 гг. выкладае яе для навучэнцаў Свіслацкай настаўніцкай семінарыі. Усталёўвае шырокія кантакты з прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі і разам са Я. Станкевічам выдае лементар "Просты спосаб стацца ў кароткім часе граматным" (1918). Яго пяру належалі шматлікія пераклады і артыкулы: "Калі пісан Тарас на Парнасе" (пісаны па-беларуску); гістарычны агляд "Са старой і новай гісторыі Беларусі" – шырокі разгляд гісторыі Беларусі ад часоў Кіеўскай Русі да 1918 г.; "З беларускай літаратуры" (раздзел да кнігі "Беларусь"), куды акрамя артыкула ўвайшлі перакладзеныя ім творы Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Баршчэўскага, нізка беларускіх народных песняў і падборка лепшых беларускіх казак. Акрамя таго нямецкі славіст падрыхтаваў і меў намер выдаць на нямецкай мове беларускую граматыку і нямецкамоўную гісторыю беларускай літаратуры, аднак смерць (1921) перашкодзіла здзяйсненню ягоных намераў.

Не менш значны ўклад у вывучэнне і даследаванне беларускай культуры зрабіў і А. Ірель. Менавіта ім былі арганізаваны дзве буйнейшыя мастацкія выставы ў Вільні і Менску, зроблены шэраг значных публікацый: "Мінская краёвая выстава", "Магілёўскі царкоўны музей", "Гомель" і больш 10 артыкулаў пра "Выставу Вільна-Менск", выдадзены працы "Вільна–Менск. Старасвеччына і мастацтва. Каталог", "Павадыр па Менскай краёвай выставе", ды раздзел да кнігі "Беларусь" – "Аб беларускім мастацтве". Апошняя праца –

гэта першая спроба заходнееўрапейскага вучонага паказаць беларускае мастацтва ў еўрапейскім кантэксце і асабліва ў параўнаўчым супастаўленні з нямецкім і антычным. Нездарма яна прыцягнула ўвагу беларускіх спецыялістаў, некалькі разоў перекладалася на беларускую мову і атрымала шматлікія дабразычлівыя водгукі і высокія ацэнкі ў Беларусі. Адыграўшы ў свой час прыкметную ролю ў гісторыі беларускага мастацтвазнаўства, яна не страціла сваёй актуальнасці і да сёння, пра што яскрава сведчыць і нядаўняя публікацыя В. Шматава "Ля вытокаў", а яшчэ ў большай ступені наша сённяшняя выстава.

Помнікі беларускага мастацтва даследаваліся і ў іншых выданнях нямецкіх вучоных і аматараў мастацтва. У працы В. Егера "Царква святой Ганны, манастырскія цэрквы святога Бернардзіна і святога Міхаіла ў Вільні" даецца даволі падрабязнае апісанне гэтых помнікаў. Аднак значна больш поўна і кампетэнтна пададзены яны ў кнізе П. Вебера "Вільня. Забыты цэнтр мастацтва", дзе даецца дасведчаны мастацтвазнаўчы аналіз найбольш вядомых гістарычных і сучасных помнікаў архітэктуры Вільні ў іх важнейшых мастацкіх праяўленнях – стылях: гатычным і раманскім, барока і ракако, класіцызма, і дзе апрача архітэктуры разгледжаны і цікавейшыя помнікі віленскай скульптуры, іканапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Хацелася б адзначыць яшчэ дзве значныя публікацыі таго часу: артыкул Ф. Куршмана "Беларусы. Славянская сялянская нацыя, што абудзілася" і кнігу В. Егера "Беларусь". Першая з іх змяшчае даволі цікавыя для свайго часу звесткі пра тэрыторыю, насельніцтва, палітычнае і культурнае жыццё Беларусі. Праца ж В. Егера – гэта першая на нямецкай мове кніга, цалкам прысвечаная Беларусі. Яна ахоплівае шырокае кола праблем, звязаных з жыццём і дзейнасцю нашага народа ад старажытнасці да ўтварэння БРН у іх найбольш характэрных аспектах, і такім чынам, увабраўшы ў сябе самыя поўныя звесткі пра Беларусь, як бы падводзіць вынікі аднаму з найбольш плённых перыядаў у развіцці беларуска-нямецкіх культурных сувязяў, у далучэнні нямецкіх вучоных да беларускага адраджэння, да даследавання беларускай культуры.

Трутнева Н.Ф., кандидат исторических наук,
директор Московского областного
краеведческого музея в Истре, Московская обл.

ТРУДЫ ПО ИСТОРИИ ЗАПАДНОГО КРАЯ РОССИИ, ИЗДАННЫЕ П.Н. БАТЮШКОВЫМ В 60-90-е гг. XIX в.

1. Административная деятельность П.Н. Батюшкова в 50–60-е гг. XIX в.: вице-губернатор Ковно; вице-директор департамента духовных дел; попечитель Виленского учебного округа.
2. Издательская деятельность П.Н. Батюшкова: "Атлас народонаселения Западно-русского края по исповеданиям" с приложением "Собрания проектов... на постройку православных церквей в Белорусских губерниях", 1863 г. Участие академика живописи Ф.Г. Солнцева в этой работе. Издание 7 выпусков "Памятников русской старины в Западных губерниях" (1865–1886) и исторических сборников: "Холмская Русь", "Волынь", "Белоруссия и Литва", "Подолия", "Бессарабия" (1887–1892).
3. Роль и место П.Н. Батюшкова в русской культуре второй пол. XIX в. Подготовка и издание 3-томника сочинений П.Н. Батюшкова.

Чистякова М.В., научный сотрудник
филиала ГИМ "Новодевичий монастырь" Москва

ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЕ СВЯЗИ НОВОДЕВИЧЬЕГО МОНАСТЫРЯ С ПРАВОСЛАВНЫМИ МОНАСТЫРЯМИ БЕЛОРУССИИ ВО ВТОРОЙ ПОЛ. XVII в.

История московского Новодевичьего монастыря второй пол. XVII в. представляет значительный интерес в рамках характерной для этого периода проблемы проникновения и взаимовлияния русской и западнорусской культур.

Эта проблема имеет основательную историческую подоплеку. События российской истории второй пол. XVII в., результаты русско-польской войны, повлекшие за собой изменения границ и присоединение ряда западных областей, привели к оживлению культурных связей между ними и Россией, не стесненных более порубежными препятствиями.

Носителями западнорусских культурных традиций в названный период являлись и представители духовенства и, в этой среде, насельники православных монастырей, в большом количестве переезжающих в Россию.

Широко известны факты переселения белорусских монахов, по благословению патриарха Никона, в Иверский Святозерский и Воскресенский Новоиерусалимский монастыри.

В самой Москве, во многих монастырях образуются целые колонии из переселенцев, в т.ч. – белорусов. Такими монастырями становятся Донской, Симонов, Богоявленский, Андреевский и др.

Среди женских монастырей, куда переехало значительное число белорусских монахинь, следует назвать Новодевичий и Саввинский.

В Новодевичий монастырь с 1654 г. переселяются монахини из-под Орши, из Кутейнского Успенского монастыря. Во второй половине XVII в. Новодевичий, вместе с приписным к нему Саввинским монастырем, образовали довольно значительное поселение из Западной России. Достаточно сказать, что Саввинский монастырь в этот период получил наименование – Киевский Новосаввинский монастырь.

Роль и значение белорусских стариц в Новодевичьем монастыре были весьма велики. Практически всю вторую половину столетия, с 1656 г. по 1701 г., в монастыре игуменствовали кутейнские старицы. Первой белорусской игуменьей Новодевичьего монастыря стала старица Мелания Ерчакова, до переезда в Москву игуменствовавшая в Кутейнском Успенском монастыре. С этого времени начинается новый период в жизни Новодевичьего монастыря – "кутейнский", белорусский, – по-новому определивший дальнейшее развитие его истории.

Живя в Москве, монахини-кутеинки сохраняли обширные связи с белорусскими монастырями. Среди них – Борколабовский Вознесенский, Тупичевский Духов, Кутейнские Богоявленский и Успенский.

Переехавшие монахини привезли с собой новые для москвичей элементы западной культуры. Существенно пополнились библиотека и ризница монастыря, новые элементы убранства появились в интерьерах монастырских храмов, по-иному зазвучало в них пение.

Отдельно хотелось бы сказать о т.н. книгах "кутейнской печати", привезенных белорусскими монахинями в Новодевичий монастырь. Их две – Трифологион 1647 г. и Псалтирь и Новый Завет 1652 г., напечатанные в Кутейнском Богоявленском монастыре. В обеих, предваряя собственно текст, помещена "предмова" – обращение к читателям игумена Кутейнского монастыря Иоиля Труцевича. Весь текст обращения проникнут благодарственной риторикой по отношению к основателю Кутейнского монастыря,

"фундатору и добродетелю" шляхтичу Богдану Стеткевичу, прославляемому в характерном для второй половины XVII в. высоком стиле "плетения словес", нашедшем свое наивысшее развитие в знаменитом в Москве, при царском дворе, творчестве Симеона Полоцкого.

В истории московского Новодевичьего монастыря второй пол. XVII в., как в капле воды, проявились черты, столь характерные для хода российской истории этого периода.

Всеохватывающее влияние западнорусской культуры на жизнь московского общества во второй пол. XVII в. очевидно.

Развитие русской истории, определенная направленность политики царского двора, покровительствующего западнорусским переселенцам, с другой стороны - позиция самих белорусов, в большом количестве переезжающих в великорусские области - все это создало условия для постепенного органического вживания элементов западнорусской культуры в российскую среду, к тому времени уже достаточно подготовленную для ее восприятия и утверждения на своей основе.

Шведова М.М., старший научный сотрудник
филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

НОВОДЕВИЧИЙ МОНАСТЫРЬ НА СТЫКЕ БЕЛОРУССКОЙ И РУССКОЙ КУЛЬТУР ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XVII в.

1. Возрождение идей "Москва – третий Рим" в политике духовных и светских властей в России в середине XVII в. Программа культурного взаимодействия Востока и Запада.
2. Изменения в устройстве русских монастырей в связи с новой культурной ориентацией государства. Социальное и культурное обновление Новодевичьего монастыря.
3. Взаимодействие монастырской духовной культуры и московского придворного искусства второй половины XVII в. в стенах Новодевичьего монастыря. Работы мастеров Оружейной палаты, Посольского приказа и художественных мастерских монастыря.
4. Белорусская культура как компонент стиля "московское барокко" на примере памятников Новодевичьего монастыря.

Шлионская Е.И., научный сотрудник
филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

РУССКО-БЕЛОРУССКИЕ СВЯЗИ НА ПРИМЕРЕ НЕКРОПОЛЯ МОСКОВСКОГО НОВОДЕВИЧЬЕГО МОНАСТЫРЯ
(К ПОСТАНОВКЕ ПРОБЛЕМЫ)

1. Устройство некрополей на территории монастырей как элементов монастырской жизни в средневековой Москве. Некрополь Новодевичьего монастыря – один из известнейших в Москве. Его характеристика: время существования, размещение захоронений на территории монастыря, состав захоронений.
2. Захоронение в Новодевичьем монастыре выходцев из Белоруссии – отражение связей Новодевичьего монастыря с западными землями во второй половине XVII – второй половине XIX в. Уточнение исторических реалий по русско-белорусским связям материалами некрополя.
3. Материалы по некрополям – специфический тип исторических источников. Необходимость привлечения их для исторических исследований.

Горшковоз О.Д.,
кандидат искусствоведения, Минск

РУБЕНСОВСКИЙ АРХЕТИП БАРОККО БЕЛОРУССИИ

1. Имя П.П. Рубенса известно как стержневое в закреплении искусством Западной Европы экспрессивных начинаний в области пространства и объемной формы. Имманентность произведений П.П. Рубенса самому духу барокко сделала его иконографические, колористические открытия не декларируемыми, но органическими основаниями ряда начинаний стиля барокко.

2. П.П. Рубенс много работал в области станковой и монументальной живописи. Мастер являлся прекрасным знатоком античной и христианской мифологии. Исследователи отмечают большую скрупулезность маэстро в разработке христианской иконографии. Он обращался к большому кругу источников: от античных рельефов до произведений предшествующих ему художников. П.П. Рубенс имел широкие возможности осмотра зарубежных собраний и использования гравюрного и тиражированного в книгах материала.

3. Импровизационные возможности П.П. Рубенса были так велики, что, демонстрируя явный парафраз с известных уже произведений, он умел создавать новые композиции на известные темы, удивительные по выразительности, пропорциональности, естественности. Вариативность построений одной и той же темы была значительной. В нашем распоряжении несколько композиций Распятия, Поклонения Волхвов, Благовещения, Воскресения (Вознесения) и т.д.

4. Причины столь широкого распространения произведений П.П. Рубенса в качестве отправных в иконографических поисках мастеров XVII–XVIII вв. Западной Европы широко рассматривались в литературе в связи с проблемой "спора рубенсистов и пуссенистов". Нас будет интересовать внимание, которое уделила творчеству П.П. Рубенса религиозная живопись, получившая распространение в храмах католического вероисповедания Белоруссии.

5. С одной стороны, П.П. Рубенс представляет своей христианской иконографией наиболее удачное продолжение разработки основных сюжетов предшествующими мастерами. С другой стороны, надо отметить санкционированность его искусства сверху, потому что он являлся наиболее заказываемым художником своего времени (так же, как в XVI в. на папском дворе более предпочитали Рафаэля нежели Микельанджело или Леонардо да Винчи). Кроме того, важным является и то, что он опробовал свои замыслы не только в станковых произведениях, но и в монументальных стенописных циклах. Немаловажную роль в этом сыграли и его росписи иезуитских храмов (например, костел св. Игнатия Лайолы в Антверпене).

6. В сложной структуре барокко Белоруссии, ориентированое на рубенсовские композиции, не носило копийного характера, скорее, представляло некое их опосредованное (архетипическое) отражение. Это позволяет еще раз сделать вывод о западноевропейских ориентирах данного стиля в Белоруссии.

Горшковоз О.Д., кандидат искусствоведения, Минск

МАСТЕР ИОСИФ. МОГИЛЕВСКАЯ ШКОЛА ЖИВОПИСИ

Одним из важных теоретических доводов Н. Щекатихина об искусстве XVI–XVIII вв. был вывод о существовании школы могилевской иконописи и монументальной живописи. Наличие школы предполагает определенное количество памятников и имен мастеров. Н. Щекатихин видел в этом тенденцию, а конкретный сбор материала – делом ближайшего будущего.

В результате реставрационных работ в могилевском кармелитском костеле открылась надпись, датирующая второй период росписи этого памятника – 1765–1767 гг. и указывающая авторов-исполнителей – художников Иосифа (Юзефа) и Давида. Есть все основания отождествить этих мастеров с монументалистами Белыничского монастыря кармелитов, которые работали в то же самое время. Архивные сведения о них, собранные Э.И. Ветер, позволяют представить статус этих мастеров – они были монахами-"ксендзами" и им поручались значительного объема работы, сопровождающиеся большими суммами вознаграждений.

Черты стиля кармелитских мастеров: значительная спиритуалистичность образов, сдержанное несвободное владение ракурсными поворотами фигур и глубиной пространства в композициях. Т.е. стиль несет на себе отпечаток одухотворенности мастеров, недостаточно владеющих (или сознательно не признающих) приемами иллюзионистической передачи пространства и формы. Особенным поворотом данной темы является изображение рисующего монаха-художника в росписи бокового нефа, т.н. Иосифского придела. Возможно условно предположить первый в истории белорусского искусства автопортрет художника.

Піскун Ю.А., мастацтвазнаўца, старшы выкладчык
Беларускай акадэміі мастацтваў, Мінск

ВАСІЛЬ МАРКІЯНАВІЧ - СЛУЦКІ МАСТАК СЯРЭДЗІНЫ XVIII СТАГОДДЗЯ

Сярод навуковай спадчыны Міколы Шчакаціхіна ёсць і спробы стварэння персаналій беларускіх мастакоў – між імі даследаванне біяграфіі і пошук твораў беларускага малера XVIII ст. Рыгора Мядзвецкага.

Аддаючы даніну павагі заснавальніку беларускай мастацтвазнаўчай навукі, у сваім паведамленні мы спрабуем прасачыць творчую біяграфію яшчэ аднаго беларускага мастака-іканапісца XVIII ст. – Васіля Маркіянавіча са Слуцка. Звесткі пра Маркіянавіча ёсць у "Слоўніку беларускіх мастакоў ..." Н.Ф. Высоцкай (Высоцкая Н.Ф. Словарь мастеров, работавших в Белоруссии в XVI–XVIII вв.// Художественные собрания СССР. Музей 4. М. 1983. С. 174). Дзякуючы даследаванням Высоцкай вядома, што Маркіянавіч у 1758–1766 гг. стварыў пяць абразоў для царквы в. Рожан. У XX ст. пасля закрыцця гэтай царквы абразы былі перанесены ў царкву вёскі Чыжэвічы, адкуль яны трапілі ў збор Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

Адзін з гэтых твораў – абраз "Дэісус" – мае ўкладны надпіс да Рожанскай царквы, дзе пазначана дата 1758 г., прозвішчы асоб, што надалі той абраз да царквы, і прозвішча мастака: "В. Маркіянавіч малевал". Іншыя чатыры абразы зусім слушна па стылістычных прыкметах атрыбуіраваны Высоцкай таксама як творы Маркіянавіча – гэта абразы "Пакроў" (ва ўкладным подпісу датаваны 1761), "Тройца", "Звеставанне" і двухбаковы

храмавы вынасны абраз "Маці Божая Адзігітрыя – Узнясенне" (пазначана дата 1766 г.). Вядома, што Узнясенская царква ў вёсцы Рожаны Навагрудскага ваяводства мела драўляны фарбаваны іканастас, які складаўся з 17 абразоў простага пісьма, размешчаных у 3 ярусы. Дапушчальна, як тое лічыць і Высоцкая, што абраз Маркіянавіча "Дэісус" месціўся ў цэнтры другога яруса гэтага іканастаса. Магчыма, што ў гэтым іканастасе былі пастаўлены і абразы "Пакроў" 1761 г., "Звеставанне" і "Тройца", хаця разнастайнасць іх памераў робіць такое дапушчэнне больш праблематычным.

У часе навуковых экспедыцый Музея старажытнабеларускай культуры па Мінскай вобласці ў 1986–1990 гг. намі былі атрыбуіраваны як творы Маркіянавіча яшчэ два абразы ў Чыжэвіцкай царкве (па вусных звестках, яны таксама былі перанесены сюды з Рожанскай царквы). Гэта абразы "Петр і Павел" і "Мікола з жыціем". Першы з іх мае характэрную для большасці твораў Маркіянавіча ляпную арнаментацыю фона ў выглядзе кропак-"квадрыфоліяў" і С-падобных раслінных завіткоў, злучаных авальнымі перавязкамі. Другі абраз – "Мікола з жыціем" – у стылістычных адносінах вельмі блізкі да "Дэісуса" Маркіянавіча. Гэты абраз цікавы як рэдкі прыклад у беларускім іканапісу XVIII ст. жыційнага абраза, дзе вялікая колькасць клеймаў (іх тут 12) у адпаведнасці са старажытнарускай традыцыяй акаймоўвае сярэднік з усіх бакоў.

У інвентары горада Слуцка за 1765 г. (Дзяржаўны гістарычны архіў-музей Беларусі – ДГАБ, КМФ-5, воп. 1, sign. 3840) намі выяўлена пад N 586 прозвішча малера Базыля Маркіянавіча, які меў ва ўласнасці 5 1/2 прэнтаў зямлі (даволі значная на той час маёмасць) і свой дом на рагу вуліц Усцінаўскай і Зімняй. Разам з Васілем Маркіянавічам да того ж дыму належыў яшчэ адзін мастак, не названы па прозвішчу. Акрамя Васіля Маркіянавіча і яго памочніка ў Слуцку, адпаведна інвентару 1765 г., меліся яшчэ чатыры мастакі: тры ў старым горадзе – адзін з іх Захарка Багамаз (N 191) меў, напрыклад, толькі 1 1/10 прэнта, і адзін – Мацей Канатопавіч (N 659) – у Новым горадзе.

Такім чынам, меркаванне Н.Ф. Высоцкай аб слуцкім паходжанні Васіля Маркіянавіча знаходзіць архіўнае пацвярджэнне.

Акрамя вышэй названых абразоў з Рожанскай царквы – пяць у зборы ДНММ Беларусі і два ў Чыжэвіцкай царкве - да творчай спадчыны Васіля Маркіянавіча мы можам залічыць абраз "Маці Божай Чэнстахоўскай" 1773 г. з Асіповічаў і абраз "Спас" з царквы ва Урэччы.

Да майстэрні Васіля Маркіянавіча можна аднесці яшчэ два творы. Абодва гэтыя абразы – "Звеставанне" і "Пакроў" – не захаваліся і вядомы дзякуючы фотаздымкам, зробленым у час экспедыцый па Случчыне В. Ластоўскім у канцы 20-х гадоў нашага стагоддзя. (Альбом з гэтымі фотаздымкамі знаходзіцца ў Беларускай бібліятэцы імя Скарыны ў Лондане, фотакопія перададзена А. Мальдзісам у акадэмічную бібліятэку імя Я. Коласа ў Мінску.)

Абодва абразы (ілюстрацыі ў альбоме NN 4, 11) знаходзіліся, паводле подпісаў пад фотаздымкамі, у Слуцку, у царкве на Востраве. Як і многія творы Маркіянавіча, абраз "Пакровы" меў ляпны арнаментальны фон і ўкладны подпіс, на жаль, не прачытаны.

Такім чынам, маецца дзевяць стылістычна роднасных твораў і два абразы, вядомыя па фотаздымках; у адносінах да ўсіх адзінаццаці твораў дастаткова ўпэўнена можна зазначыць, што яны паходзяць з адной іканапіснай майстэрні, якая мелася ў Слуцку ў канцы 50-х–70-я гг. XVIII ст., а менавіта – з майстэрні Васіля Маркіянавіча. Тапаграфія гэтай групы абразоў лакалізуецца ў межах слуцкага княства – асобнага адміністратыўна-тэрытарыяльнага ўтварэння Рэчы Паспалітай.

Пераканаўчым лічым меркаванне аб тым, што сваю мастацкую адукацыю Васіль Маркіянавіч атрымаў у мастацкай майстэрні Кіева-Пячэрскай лаўры. У "Слоўніку беларускіх мастакоў..." Н.Ф. Высоцкай Васіль Маркіянавіч, стваральнік рожанскіх абразоў, і Васіль Марціянавіч родам са Слуцка, вучань мастацкай майстэрні Кіева-Пячэрскай лаўры ў 1749 г., прадстаўлены як розныя асобы. М.П. Істомін – першы даследчык дзейнасці

мастацкай школы Кіева-Пячэрскай лаўры, прачытаў прозвішча вучня са Слуцка наступным чынам – Васіль Маркіалавіч. Гэта прозвішча, як сцвярджаў даследчык, пазначана ў подпісу да малюнка 1749 г. (М.П. Истомин. Обучение живописи в Киево-Печерской лавре в XVIII в.// Искусство и художественная промышленность. 1901. N 11. С. 312). Сам малюнак названы Істоміным "Покушение еретиков против православной церкви". Вядомы ўкраінскі мастацтвазнаўца Жалтоўскі П.М. называе гэты сюжэт "Царква ваяўнічая" (П.М. Жолтовський. Малюнки киеволаврської іконописної майстэрні /Альбом-каталог. Київ. 1982. С. 242). Жалтоўскі П.М. у сваім даследаванні не прыводзіць подпіс з імем выканаўцы пад малюнкамі з гэтым сюжэтам (іх у кажбушку два: NN 5 і 6), але ў каталозе малюнкаў таго ж кажбушка XIX-67/XX-19/8392 Жалтоўскі падае наступны надпіс пад малюнкамі аправы Евангелля (мал. N 8 і 9): "Року 1749 мца августа 19 дня рисовал Васил Мартиянович из Слуцка в нас в малярне его прозвано Шидурка"). У другім сваім даследаванні Жалтоўскі называе іншую дату ў дадзеным подпісу – "1747 ..." (П.М. Жолтовський. Художнє життя на Україні в XVI–XVIII ст. Київ. 1983. С. 147). Таму зусім натуральна лічыць, што памылкі ў прачытанні зробленага скорапісам прозвішча вучня-выканаўцы дадзеных малюнкаў маглі зрабіць і Істомін, і Жалтоўскі. Верагодна, што і малюнкі "Царква ваяўнічая", і "Праекты аправы Евангелля", збрашураваныя ў адзін сшытак, былі зроблены адной рукой, менавіта рукой слуцкага ўраджэнца Васіля Маркіянавіча. Магчыма, што ў кіеўскіх кажбушках ёсць і іншыя неанаціраваныя малюнкі Маркіянавіча. Мы мяркуем, што пасля трохгадовага тэрміна (прыкладна 1747–1749 гг.), як было прынята ў кіеўска-лаўрскай майстэрні, Васіль Маркіянавіч вярнуўся ў родны Слуцк, дзе паспяхова займаўся стварэннем абразоў для праваслаўных (а магчыма, і ўніяцкіх) цэркваў Слуцка і яго наваколля.

Хадыка А.Ю., навуковы супрацоўнік музея
старжытнабеларускай культуры ІМЭФ АН РБ, Мінск

АЛТАРНЫЯ КАРЦІНЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII ст. З МУЗЕЯ СТАРАЖЫТНАБЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў МІНСКУ

У артыкуле разглядаюцца творы жывапісу ранняга барока, якія ўключаюць партрэтныя адлюстраванні данатараў і прадстаячых, архаічную форму партрэта, досыць пашыраную ў беларускім мастацтве першай паловы XVII ст.

У вельмі выразнай і вытанчанай "Маці Божай з яблыкам" (Ж-79), вывезенай з Іўеўскага раёну Гродзенскай вобласці, постаць адаранта злева засталася толькі ў першапачатковым графічным накідзе і выяўлена рэнтгенаграмай. Асаблівасці кроя касцюма, пазначанай у агульных рысах прычоскі з'яўляюцца дадатковымі датуючымі прыкметамі ў гэтым творы. Магчыма, менавіта залішне яскравы кантраст еўрапейскай жывапіснай аўтарскай манеры і "по-сармацку" характэрнага выгляду партрэтаванага "з'явіліся прычынай адмовы ад завяршэння партрэтнага адлюстравання ў канчатковым варыянце.

Матэрыялы грунтоўнай публікацыі Я. Рушчыц па іканаграфіі Жыгімонта III і выставы "Мастацтва перыяду Вазаў у Польшчы" будуць дапоўнены адлюстраваннямі на кампазіцыі "Маці Божая Шкаплерная" (Ж-213), якая перададзена ў Музей з Гервят Гродзенскай вобласці. У групе асобаў, якія назіраюць цуд з'яўлення Марыі, сустракаюцца спрошчаныя, магчыма, напісаныя паводле адлюстраванняў на медалях, манетах і гравюрах, вобразы Жыгімонта III, яго жонак, а таксама некаторых іншых гістарычных асоб. Жывапіс выкананы ў канцы першай трэці XVII ст.

Алтарная карціна "Пакланенне вешчуноў (1520-я гг, Ж-70), якая паходзіць з заснаванага Жыгімонтам Старым касцёла ў Дрысвятах, неаднаразова перамалёўвалася. Слой запісаў сярэдзіны XVII ст. утрымлівае надзвычай цікавую постаць шляхціча, відавочна, ініцыятара

аднаўлення жывапісу. Элементы моды паказваюць на паходжанне партрэта з сярэдзіны — другой палавіны XVII ст., аднак сама манера выканання і прынцып размяшчэння адлюстравання архаічныя, мастак следуе нормам іерархічнай перспектывы. Змешчаныя побач герб і абрэвіятура з 6 літар дазваляюць дапускаць, што перад гледачом знаходзіцца вобраз Яна Сегеня (Сехеня), венденскага (цэсіскага) падстолія.

Магчыма, утрымлівае намёк на партрэтнае адлюстраванне "Маці Божая са св.Ігнаціем і Францішкам Ксаверыям" (Ж-68) з Крывошына Брэсцкай вобласці. Гэты цудатворны абраз знаходзіўся ў ліпска-крывошынскай місіі нясвіжскага калегіума езуітаў, землі для якой былі ахвяраваны напрыканцы 1580-х гг. Мікалаем Хрыстафорам Радзівілам Сіроткам. Магчыма асцярожна дапусціць, што партрэтнае падабенства фундатара місіі і адлюстраванага на палатне заснавальніка ордэна Ігнація Лайолы невыпадковае.

Паколькі вобразы езуіцкіх святых на палатне з Крывошына абапіраюцца на агульнаеўрапейскую іканаграфію, пашыраную праз гравюру, прывядзем яшчэ адзін прыклад выкарыстання графічнага прататыпу беларускім мастаком. У "Абразанні" (Ж-75) з Мышчыц Брэсцкай вобласці ў люстэркавым адлюстраванні і ў некалькі спрошчанай рэдакцыі паўторана работа нідэрландскага ман'ерыста Франса Франкена Ст. (1542—1616). Цікава, што арыгінал (?) адлюстравання некалькі год назад паступіў у фундацыю З.-К. Парчынскага ў Варшаве, а адна з падобных люстраных рэплік, дапоўненая партрэтам данатара, знаходзіцца ў Музеі ў Альштыне і датуецца 1640-мі гг.

Шведова М.М., старший научный сотрудник филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

РАБОТЫ ИКОНОПИСЦА КАРПА ЗОЛОТОРЕВА В НОВОДЕВИЧЬЕМ МОНАСТЫРЕ

После смерти царя Федора Алексеевича Новодевичий монастырь становится местом приложения сил дворцовой партии Милославских, вступившей в борьбу за власть с Нарышкиными. Правительство царевны Софьи придавало особенно важное идеологическое значение строительству и украшению исконно царского придворного женского монастыря. Среди многих десятков мастеров, работавших в монастыре в эти годы, можно выделить имена Федора Зубова и Карпа Золоторева, организаторов и руководителей таких крупных коллективных храмовых работ, как строительство высоких иконостасов.

Федор Зубов поновлял старые иконы и писал заново страстной чин и резной седьмой ряд главного иконостаса Смоленского собора, вместе со своими учениками им были поставлены иконостасы в перестроенные в эти годы приделы собора.

Однако в новых монастырских храмах основные работы по украшению интерьеров были заказаны Карпу Золотореву. Золоторев делал иконостасы в Успенской церкви монастыря (1685) и в надвратной Преображенской церкви (1687—1688). Стилистические и конструктивные особенности позволяют приписывать Карпу Золотореву устройство иконостаса в церкви пустынника Варлаама и царевича Иоасафа (1690) в первом ярусе монастырской колокольни. Кроме того, этим же мастером писались отдельные иконы для Софийского придела и надвратной Покровской церкви. Вероятнее всего, они выполнялись по особым заказам царевен Софьи и Марии Милославских.

Федор Зубов и Карп Золоторев принадлежали к двум разным, оформившимся во второй половине XVII в., направлениям в русском изобразительном искусстве — иконописцам и живописцам. В русле средневекового искусства мастера обоих направлений получали заказы, в основном на иконописные работы. При этом учитывалась

разность стилистических и эстетических программ этих авторов. При распределении заказов учитывалось архаизирующее направление иконописи Федора Зубова, он работал в поновительском стиле в древнем соборе, вписывая в него не противоречащие художественным принципам образцы новой иконописи.

Карп Золоторев работал в храмах, связанных с монастырскими палатами дворцового типа, в которых впоследствии жили сами царевны. Под его руководством и при его участии делался иконостас в церковь при монастырской трапезной. Монастырем в эти годы руководили старицы "кутеинки", считавшиеся в Москве носительницами нового монастырского уклада. В лице обоих мастеров в монастыре сходилось старое и новое, архаизм и новаторство, которыми жила русская иконопись на краю Средневековья и Нового времени.

Золоторев подчиняет принципы конструирования иконостасов не только новым архитектурным формам храмов эпохи барокко, но и идейным новациям этого времени. Так, очевидно, под влиянием белорусского искусства, им переосмысливается содержание деисусного чина иконостаса, вводится тема церковных таинств, резко возрастает число резных фигур, завершающих иконостас или фланкирующих его центральную ось. Иконы верхних и нижних рядов иконостаса пишутся в принципиально разной стилистической манере. Изысканный колорит и сложные композиции местного ряда сочетаются с яркими цветами и упрощенными композициями верхних рядов. Свойственно Золотореву возникшее в недрах Оружейной палаты в более ранние годы следование идейным программам отдельных царствований и включение их в виде особых иконографий в структуру иконостасов. Так, Золоторев создает сложную парную композицию в местном ряду иконостаса надвратной Преображенской церкви на тему Благословения Московского царства, отчасти заимствованную из парсуны его учителя Богдана Салтанова "Прославление креста". Ориентация дворцовых вкусов на новую эстетику живописи Карпа Золоторева подтверждается заказом царевны Софьи большой иконы "Софья, Вера, Надежда, Любовь" для своего маленького придела в Смоленском соборе. В небольшом интерьере оказались совмещены работы двух первоклассных мастеров этой эпохи, по-разному интерпретировавших тему небесного покровительства царевне Софье.

В своих работах в Новодевичьем монастыре Карп Золоторев предстает перед нами как яркий, обогащенный веяниями европейской культуры мастер, провозвестник эпохи Нового времени.

Ярашэвіч А.А., навуковы супрацоўнік музея старжытнабеларускай культуры ІМЭФ АН РБ, Мінск

АБРАЗ НА СЮЖЭТ З ГІСТОРЫІ ОРДЭНА КАРМЕЛІТАЎ

У 1973 г. экспедыцыя Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі ў Гервяцкім касцёле звярнула ўвагу на абраз з невядомым развітым сюжэтам, намаляваны тэмперай на сасновай аснове па невысокім грунце. Пазней абраз быў вывезены ў Музей старажытнабеларускай культуры і апублікаваны ў каталозе яго экспазіцыі пад назвай "Пакланенне маці Божай" (датаваны першай пал. XVII ст.), а затым Н.Ф. Высоцкай – у альбоме "Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст." пад назвай "Узнясенне Марыі" (датаваны апошняй чвэрцю XVII ст.). На абразе паказана Дзева Марыя, якая сядзіць на воблаках і падае нейкаму манаху чорны кавалак тканіны. Унізе па баках абраза стаяць групы адарантаў свецкага і духоўнага стану як сведкі цудоўнай падзеі. На пазёме ў зямным праломе намаляваны рад грэшнікаў, падаграваемых языкамі пякельнага агню; анёл дастае адтуль заплаканую грэшніцу.

На датаванне і змест абраза можа паказаць яго паходжанне: праведзеныя архіўныя пошукі дазволілі ўстанавіць, што першапачаткова абраз знаходзіўся ў касцёле в. Жэлядзь, заснаваным у 1628 г. каралеўскім сакратаром Войцехам Хлудзінскім, які падараваў свой фальварак Жэлядзь Віленскаму кляштару Усіх святых, таксама ім заснаванаму. Таму касцёл і абслугоўвалі манахі з гэтага кляштара, дзе, дарэчы, яшчэ ў 1-й пал. XIX ст. захоўваўся партрэт Хлудзінскага (памёр у 1628 г.). На Гервяцкім (дакладней казаць, Жэлядзьскім) абразе адлюстравана падзея ўручэння Маці Божай шкаплера першаму генералу ордэна кармелітаў Сымону Стоку (першая пал. XIII ст.). У 1587 г. папа зацвердзіў для кармелітаў патранальнае свята Маці Божай Шкаплернай 16 ліпеня, якое з 1726 г. адзначаецца ўсёй каталіцкай царквой.

Вялікую цікавасць уяўляе архітэктурны пейзаж паміж групамі адарантаў, на ім, хутчэй за ўсё, паказана Віленская катэдра, як яе можна бачыць на плане Браўна XVI ст. ці гравюры Макоўскага 1604 г., да перабудовы 1613–1626 гг., наогул, мастак, відаць, архаізаваў выгляд храма, улічваючы даўнасць падзеі.

Легендарная аснова сюжэта ўзнікла, напэўна, пад уплывам усходнехрысціянскага пакроўскага падання; што датычыць іканаграфічных прататыпаў, можна нагадаць "Каранаванне Маці Божай", яе "Узнясенне" і візіянерскія сюжэты са св. Францыскам і св. Дамінікам. Непасрэднай крыніцай для мастака магла з'явіцца гравюра з кнігі "Jacek Duzacz. Pobudka do bractwa..." (Кракаў, 1610). Звяртае на сябе ўвагу падабенства караля ў групе адарантаў да партрэта Жыгмонта III Вазы, гэта дае падставу дапусціць, што абраз намаляваны да 1632 г. Сюжэт яго можна акрэсліць як "Уручэнне Сымону Стоку шкаплера", ці больш шырока – "Маці Божая Шкаплерная", па назве бакавога алтара Жэлядзьскага касцёла, у якім, хутчэй за ўсё, абраз і знаходзіўся да 1864 г.

...

Гваздзёў С.М., Мінск

ПЫТАННІ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАЙ БІЯГРАФІІ ЯЎХІМА МІНІНА

Святкуючы 100-годдзе з дня нараджэння піянера беларускага мастацтвазнаўства – Мікалая Мікалаевіча Шчакаціхіна – хочацца адзначыць яго непасрэдны ўплыў на мастацтва 30-х гг., асабліва графіку. Згадаць у гэтым кантэксце мастака, які ў сваёй творчай практыцы карыстаўся высновамі навукоўца.

Яўхім Мінін так жа, як і яго духоўны настаўнік Мікола Шчакаціхін, на доўгія часы быў выкінуты з гісторыі беларускага мастацтва. Нешматлікім матэрыялам, апублікаваным у апошнія дваццаць гадоў, бракуе інфармацыйная непаўната, недакладнасць, адсутнасць грунтоўнага мастацтвазнаўчага аналізу. Выдатны тэарэтык і гісторык мастацтва Мікола Шчакаціхін імкнуўся скіроўваць штодзённую працу творцаў у рэчышча паслядоўнага рэалізму і нацыянальнай самабытнасці. Гэтая адметнасць – "беларускі стыль" – мусіў быў грунтавацца на засваенні і творчай перапрацоўцы гістарычных традыцыяў беларускага мастацтва, якія навуковец трактаваў значна шырэй і глыбей, чым вонкава-этнаграфічныя ды арнаментальныя аздобы. Думкай гэтай прасякнуты літаральна ўсе яго публікацыі. Паслядоўнае вывучэнне і асвятленне гэтых традыцыяў склалі сутнасць яго навуковых даследаванняў. Менавіта такі падыход быў уласцівы і Мініну. "... у выніку вывучэння Мініным старой Магілёўскай і Віленскай гравюры эпохі беларускага адраджэння і пазнейшай, атрымліваецца клясычная манументальнасць у яго творчасці, здаровы рэалізм, не пазбаўлены новых тэхнічных дасягненняў" – сведчыць Мікола Каспяровіч. На жаль, нам пакуль што невядомыя тыя творы, пра якія гаворыць навуковец. Дарэчы, экслібрыс М.І. Каспяровіча (ксілаграфія, 80х62) – тая графічная форма, у якой шмат працаваў мастак, Мінін зрабіў у ліку першых. Пэўна, меў падставы сучаснік – мастацтвазнаўца І. Фурман, вызначыўшы яго ў якасці аўтара першага нацыянальнага экслібрыса". Заўважым, што ініцыятарам стварэння суполкі аматараў экслібрысу і заўзятым калекцыянерам іх быў М.М. Шчакаціхін.

Ва ўліковай картцы справы Мініна (БДАМЛіМ) адзначана, што ў пляменніцы мастака – Людмілы Сільвестраўны Мінінай захоўваюцца 20 гравюр і 11 экслібрысаў. На цяперашні час у навуковым ужытку знаходзіцца не больш за дзесятак твораў. (Без уліку кніжных ілюстрацыяў, якімі мастак асабліва актыўна займаўся ў другой палове 30-х гг.) Для поўнага і ўсебаковага вывучэння творчай спадчыны мастака натуральна неабходны як мага большы аб'ём матэрыялу. Мяркуем, што зараз яшчэ мажліва (першасна з прычыны тыражнасці графікі) знайсці яго творы і папоўніць музейныя экспазіцыі і сховішчы Беларусі. Слушна заўважае доктар мастацтвазнаўства В. Шматаў, што Мінін быў мастаком шырокага творчага дыяпазону і добра валодаў тэхнікай алейнага і акварэльнага жывапісу, працаваў у жанры партрэта, пейзажа і нацюрморта.

Але пакуль творы не выяўлены, гэта застаецца "агульнай мясцінай" даследчыка і белай плямінай творчасці мастака. Апрача гэтага, шырока сцверджана пэўная недакладнасць у атрыбуцыі нават вядомых твораў. Да прыкладу, ва ўсіх публікацыях 70–80-х гг. дрэварыт Мініна – "Стары" (119х79 мм) датуецца 1928 г. На самой справе работа была выканана ў Віцебску ў кастрычніку 1926 г. Як мяркуе М. Каспяровіч, з натуры, і была надрукавана ў часопісу "Наш Край" N 12, 1926 г. Гэтая драбніца падаўжае спелае творчае жыццё майстра яшчэ на якія два гады.

Спрэчным падаецца меркаванне, што Мінін кінуў займацца ксілаграфіяй пасля 1932 г. "з прычыны хваробы вачэй". Увогуле не існуе адзінага прачытання (дакументальна пацверджанага) з фактаў біяграфіі мастака:

На пачатку 80-х гг. другая пляменніца Мініна – Марфа Фёдараўна на свой запыт, накіраваны ва ўпраўленне МУС па Віцебскай вобл., атрымала адказ "... умер от разрыва сердца в 1941 году..." . Неўзабаве адгукнуўся архіў КБВО: – "Ефим Минин умер от воспаления легких в 1940 году".

Аддзел архіваў і справаводства Віцебскага аблвыканкама даў вусную інфармацыю, што арыштаваны 1 лістапада 1937 г. мастак быў расстраляны 29 снежня таго ж году. Не менш блытаніны і вакол нараджэння мастака. Энцыклапедычны артыкул, напісаны П. Герасімовічам, падае ў якасці даты нараджэння 9 кастрычніка 1897 г. Праўда, на падставе якога дакументу з'явілася гэтая дата, асабісты архіў мастацтвазнаўцы, як і іншыя крыніцы, адказу не даюць. У згаданай ужо даведцы абласнога ўпраўлення МУС значыцца: "Мінін Е.С. 1894 г.р. ...". Апошняя лічба ў даце 4 закрэслена рукой Людмилы Сільвестраўны і зверху напісана лічба 8. Такім чынам, год нараджэння 1898. Але блізка ведаўшы мастака беларускі навуковец, грамадскі дзеяч і педагог Мікола Каспяровіч, які некалькі год працаваў поруч з ім у Мастацкім тэхнікуме, у сваіх "Матэрыялах да вывучэння Віцебскай краёвай літаратуры і мастацтва" у якасці даты падае 1896 г. Гэта ж дата фігуруе і ў архіўных матэрыялах мастацтвазнаўцы І. Элентуха (БДАМЛіМ), які шмат рупіўся падчас вывучэння гісторыі Віцебскага мастацкага тэхнікума. З прычыны таго, што Яўхім Мінін паходзіў са старавабрадцаў, наўрад ці мы знойдзем метрычны запіс аб хрышчэнні будучага мастака. Але ёсць надзея знайсці пратаколы допытаў мастака, уласнаручную аўтабіяграфію "ворага народа" ў нетрах КДБ па Віцебскай вобласці.

Прыклады гэтых недакладных звестак можна было б доўжыць і доўжыць.

Напрыканцы пастановы праблемы хочацца выказаць спадзяванне, што апрача зацікаўленых асобаў у высвятленні жыццёвага і творчага шляху майстра, грунтоўнага аналізу яго ўнёскаў у мастацтва Беларусі зрэшты знойдуцца дзяржаўныя даследчыя ўстановы з адпаведнымі мажлівасцямі.

Нікалаеў М.В., Расійская нацыянальная бібліятэка (РНБ), Санкт-Пецярбург

СТАРАДРУКІ З ГРАФІЧНЫМІ ВЫЯВАМІ НАВАГРАДСКІХ ЦУДАТВОРНЫХ АБРАЗОЎ

Напрацяг шматвекавой гісторыі Наваградскіх (і навакольных) праваслаўных, уніяцкіх і каталіцкіх храмах былі абразы, да якіх людзі прыносілі самыя моцныя свае пачуцці. А калі пасьля звяртання па дапамогу ў шматлікіх малельнікаў нешта змянялася да лепшага, абраз пачыналі шанаваць як цудатворны. У другой палове XIX ст. наібольш вядомыя з іх наступныя:

Месца знаходжання	Царква	Абраз	На чым напісаны	Памер	Асаблівасці
вёска Войнава		Божыя Мацеры	на дошцы	8 вяршкоў	Пакрыты срэбным абкладам
вёска Сянежыцы	прыходская Пакроўская	Пакрава Божыя Мацеры	на дошцы	2 аршыны	
мястэчка Нягневічы		Св. Мікалая	на палатне	2,5 аршыны	пакрыты абкладам
вёска Шчорсы	прыходская Дзімітраўская	Св. вялікапакутніка Дзімітрыя	на палатне	1 аршын 12 вяршкоў	
Навагрудак	Замкавая Успенская (пазней Барысаглебская)	Божыя Мацеры	на палатне	1 аршын 14 вяршкоў	пакрыты срэбным вызалачаным абкладам
Навагрудак	Іезуіцкі касьцёл (пазней Фарны)	Божыя Мацеры	на дошцы		пакрыты срэбным абкладам

Як бачым, у самым Наваградку знаходзіліся два шануемыя цудатворныя абразы, абодва з выявай Багародзіцы. Упершыню яны сталі прадметам асаблівай увагі грамадскасьці ў канцы XIX ст., у сувязі з падрыхтоўкай да юбілею Адама Міцкевіча. Славуты паэт, ураджэнец Наваградчыны, быў вельмі квёлым неўмаўляткам — пасьля марных спробаў атрымаць дапамогу ад дактароў, яго маці аддала хлопчыка пад апеку Наваградскаму цудатворнаму абразу Багародзіцы. Дзіцятка выжыла, а праз шмат гадоў Адам Міцкевіч апісаў гэты выпадак у "Пане Тадэвушы". У двухтамовіку, што выпусьцілі да юбілею паэта 1898 г., з'явіўся артыкул "Аб цудоўных абразах Маці Божай у Наваградку", падпісаны крыптаграмай X.W.K.[1] Аўтар палемізаваў з публікацыяй львоўскай "Gazety Kocielnej", у апошніх нумарах якой за 1897 год пад псеўданімам ks.M.S. надрукаваны артыкул "Уніяцкая Маці Божая Наваградская на чале Пана Тадэвуша", дзе праводзілася думка, што Міцкевіча выратаваў абраз з замкавай Успенскай царквы, перанесены пазней у царкву Барысаглебскую.[2] Выратаванне А.Міцкевіча X.W.K. прыпісвае Наваградскаму цудатворнаму іезуіцкаму абразу, які пазней перанесены, на яго думку, у францішканскі касьцёл.

X.W.K. слушна даводзіць, што напісаны на палатне цудатворны абраз з замкавай Успенскай царквы не мог быць больш старажытны ў параўнанні з пісаным на дошцы абразом Багародзіцы з саборнай Мікалаеўскай царквы (былога францішканскага касьцёлу). Пры гэтым X.W.K. сам рабіў памылку, не заўважыўшы, што пісаны на дошцы шануемы цудатворны абраз належыць не Мікалаеўскай царкве, а прыпісанай да яе Сенежыцкай,[3] а значыць, мог паходзіць з зачыненай замкавай Успенскай царквы.

Калі пра цудатворны абраз, што захоўваўся ў замкавай Успенскай царкве, інфармацыі досыць мала, то пра другую мясцовую хрысьціянскую рэліквію ў друкарні віленскага універсітэта ў XVII ст. надрукаваны дзве кнігі:

1. NOWA OBRONA Vtrapioney oyczyznie OD BOGA z NIEBA DANA W obrázie Nowo-Cudownym BOGARODZICE PANNY M A R Y E Y Przy Kosćiele Nowogrodzkim SOCIETATIS IESV W Nowogrodku, y w Okolicy Całego Woiewodstwá Nowogrodzkiego, W roznych potrzebách, od rożnych osob doznána. Za pozwoleniem y wyrázna aprobácya Urzendu Duchownego do druku podána.// w WILNIE W Drukárni Akademickiey Societatis IESV. Roku 1673. Mśca Iulij, dniá 14. (Мал. 1.)

Для вызначэння каштоўнасьці гэтай невялічкай кніжачкі (31 ненумараваны аркуш памерам 145 x 172 мм.) цалкам падыходзіць тэрмін "rarissima" (вельмі рэдкая, наірадчэйшая). Мы карысталіся экзэмплярам Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу (шыфр 15.23.5.27.).

На першых двух старонках надрукаваны панігірык наваградскай рэзідэнцыі ордэну іезуітаў пралату віленскай капітулы, ксянзу Крыштафу Пшэслаўскаму. У тэксце тлумачыцца: кніга "Новая з неба абарона" надрукавана з прычыны таго, што ў цяжкую для Радзімы хвіліну віленскі дэкан ксёнз Крыштаф Пшэслаўскі падараваў наваградскаму ваяводству цудатворны абраз Багародзіцы, які належаў асабіста яму, а цяпер будзе ў тутэйшым касьцёле іезуітаў. Пасьля панігірыку зьмешчана "Гісторыя аб цудоўным вобразе найсьвяцейшай дзевы Марыі, што знаходзіцца ў касьцёле вялебных айцоў Societatis IESV у Наваградку, узятая з пэўных запісаў і сьведчанняў пад прысягай, якія прадстаўлены духоўнаму ўраду, спецыяльна для гэтага сазванаму...".

"Гісторыя..." паведамляе, што наваградскі цудоўны абраз атрыманы пры панаванні Жыгімонта III — гэта быў трафей, узяты ў маскоўскім горадзе Вязьма ў 1615 г., аб чым сьведчыць і тое, што абраз "па звычаю рускага народу" намаляваны на дрэве. Вывезена з Масковіі была толькі фігура Найсьвяцейшае Дзевы, "бо фігуру дзіцятка госпада Іісуса, што была пры тым вобразе, у замяшанні, калі абраз бралі, неасьцярожна адшчапілі і згубілі".

Пасьля заканчэння маскоўскага паходу абраз знаходзіўся ў Вільні, у хаце каваля Пятра Багуцкага, потым перайшоў да пана Мікалая Каламыйскага. Мікалай Каламыйскі

пастараўся аднавіць абраз – па яго заказу была намалявана фігура Ісуса Хрыста і "прыложана" да вобразу замест страчанай. Рэстаўрацыя, відаць, не была ўдалай, бо "вялікая розніца паміж тымі абразамі выдаецца" – зазначае аўтар "Гісторыі...".

У 1646 г. пан Мікалай перадаў абраз тагачаснаму віленскаму каноніку Крыштафу Пшэслаўскаму, каторы будучы за пралата ў тургяльскім касьцёле, паставіў абраз у гэтым храме. Пасьля спалення касьцёлу ад непрыяцеля, Пшэслаўскі захоўваў абраз пры сабе. Чацьвёртага чэрвеня 1662 году ён "спачатку прыватна" падараваў абраз старэйшаму наваградскай іезуіцкай рэзідэнцыі ксянзу Адаму Вардацкаму. У тым самым годзе, 5 лістапада ў Жыровіцкім манастыры пад старшынством віленскага епіскапа Юрыя Белазора сабралася спецыяльная Камісія, якая засьведчыла 47 цудаў, што былі ад гэтай іконы,– пры рабоце Камісіі ў Жыровіцах знаходзіўся і сам абраз. Пасьля заканчэння работы Камісіі, у сьнежні 1662 г., абраз быў урачыста перавезены ў Наваградак. Другая камісія адбылася ўжо ў Наваградку, 10 красавіка 1673 г., па ініцыятыве Адама Вардацкага і засьведчыла 48 новых цудаў.

Далей у кніжцы надрукаваны акты абедзьвух камісій, апісаны розныя ласкі і дабрадзействы абраза. На заканчэнні падаецца апісанне ўрачыстасьцяў пры перанясенні іконы ў наваградскі іезуіцкі касьцёл "і некаторых значнейшых акалічнасьцяў, каторыя пры гэтым адбываліся".

Падчас работы камісій і падрыхтоўкі першае кніжкі віленскі гравер Л. Віланц (L. Willontz) зрабіў з цудатворнага абраза гравюру, пад выявай Багародзіцы зьмешчаны наступны подпіс:

"W Nowogrudku nowemi cudami wsławiony,
Ten obraz, ktorego tu wizerunk stawiony."

Гравюра прыпляталася да кнігі; частка экзэмпляраў, верагодна, распаўсюджвалася як станкавы твор.

2. Другая кніжка, прысвечаная нова-цудоўнай іезуіцкай іконе была надрукавана ў 1684 годзе: "EFFIGIES Miraculosae Imaginis DEIPARAE VIRGINIS, quae apud Patres Societatis IESV religiosŷ colitur, NOVOGRODECI, compendiosa Narratione Historiea illustrata, atq; INSTRVCTIONE brevi Omnibus Beatissimae V. opem implorantibus perutili, adjuncta, in Solarium afflictorum, б Residencia Novogrodensi Soc: IESU proposita. Vilnae Typis Acad: Soc. IESV. 1684." Яна мае маленькі кішэнковы фармат (малае актаво) і зьмяшчае перадрук "Гісторыі...", апісанні некаторых цудаў, а таксама багародзічныя медытацыі. Выдадзена яна па ініцыятыве той самай Наваградскай іезуіцкай рэзідэнцыі і прысьвечана земскаму пісару Наваградскага ваяводства (Notario Terrestri Palatinatus Novogroden[sis]) Багуславу Ўнехоўскаму.[4] (Мал. 3.)

У тым жа самым 1684 годзе ўніверсітэцкая друкарня ў Вільні выдала кніжачку айца Іаана Дрэўса "Methodus peregrinationi Menstruae Marianae ad Imagines DEIPARE Virg: per Ditiones Regni Poloniae et M. Ducatus Litvaniae...". Кожны месяц каляндарнага году прысьвячаўся пэўнай іконе Багародзіцы: сярод іншых жнівень – Наваградскай з касьцёлу іезуітаў. Для гэтага выдання былі зроблены гравюры абразоў у тым самым фармаце, што і кніжка –у 12 долю аркуша (прыкладна 60х80мм).

Ёсьць сярод іх і гравюра Багародзіцы з Наваградка работы невядомага майстра. Пад выявай тлумачальны надпіс:

Colitur Nouogrodeci in Templo PP. Societatis Iesu; Miraculis clara.

Прайшло ўсяго адзінаццаць гадоў ад часу з'яўлення гравюры наваградскай іезуіцкай іконы работы Віланца, але на гравюры 1684 г. можна бачыць значныя змены: іншыя па канфігурацыі кароны ў Марыі і Хрыста, іншы малюнак кветак на пакрове Марыі, няма двух анёлкаў паабапал німбу.[5] Затое ў верхняй частцы гравюры 1684 г. намаляваныя

два гербы: злева меч і два паўмесяцы з ініцыяламі "B.V.N.T.P.N." (верагодна, што гэта значыць: "Boguslaus Vniechowski Notarius Terrestrus Palatinatus Novogrodensis" – "Багуслаў Унехоўскі, пісар земскі ваяводства Наваградскага"), зправа лебедзь з ініцыяламі "B.D.P.N." Цяжка сказаць, каму гэты другі герб належыць; магчыма дзве апошнія літары абрэвіятуры значаць: "Palatinas Novogrodensis" – "Ваяводва Наваградскі". Нажаль невядома, хто на той час быў наваградскі ваявода. Папярэдні ваявода – Зьміцер Палубінскі – апошні раз успамінаецца ў крыніцах у снежні 1679 г.; таксама вядома, што ў 1689 ваяводам стаў Багуслаў Унехоўскі.[6] Ці належаў герб "Лебедзь" на гравюры 1684 г. невядомаму наваградскаму ваяводу, ці якой іншай персоне – зараз цяжка сказаць. Магчыма, гравюра паслужыць ключом для адказу на гэта важнае для гісторыі Наваградка пытанне.

Іезуіцкі касьцёл у 1815 г. зачынены; вядома, што званы з яго перавезены ў касьцёл св. Казіміра ў Вільну.[7] Дзе засталася астатняя маёмасьць – невядома. Пасля сучаснай рэстаўрацыі абразоў з Наваградскага фарнага касьцёлу (1993 г.) з'явілася гіпотэза, што захаваны дасёння абраз Багародзіцы з Дзіцяткам – гэта рэпліка XVIII ст. з цудатворнага іезуіцкага абраза, які быццам бы загінуў у пажары Наваградка 1751 г.[8]

Што датычыць другога наваградскага цудатворнага абраза, то выказвалася думка, што ён быў у саборнай Барысаглебскай царкве Багародзіцы да 1915 году, пасьля быў вывезены ў эвакуацыю ў глыб Расійскай Імперыі (ішла Першая Сусветная вайна). Дзе знаходзіцца зараз – невядома.

Недаследаванасьць старажытных абразоў і вялікая рэдкасьць прысьвечаных ім публікацый нараджае памылкі і новыя легенды. Так сучасны польскі дасьледчык "крэсаў" Анджэй Кемпфі піша: "бясспрэчнай сваёй візантыйскасьцю выява Наваградскай Замкавай Маці Божай выразна кантрастуе з адменна-заходняй выявай іезуіцка-наваградскай [іконы], якая і дасення шчасьліва захавалася...[9] Гэту гіпотэзу цалкам слушна абвергла М.Каламайска-Саід.[10]

...

---

[1] X.W.K. O cudownych obrazach Malki Bozej w Nowogródku//Ksiega pamiátkowa na uczczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza (1798–1898). Tom II. Warszawa – Krakow, 1898. S. 257–264.

[2] На гэтым абразе меўся наступны надпіс: "Року 1654 месяца Іануарія 25 дня За старанемъ Ч.О. Павла Крысковича, Протопопа Новогрудскаго, прэсвітера церкви Пречистыя Богородицы и коштом Иоанна Романовича сей образ поставлен есть" – ks.M.S., здаецца, гэтага не ведаў.

[3] "Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от притчов сведениям. Ч.IX. Новогрудский уезд. Минск, 1879.

[4] Праз пяць гадоў, у 1689 г., Багуслаў Унехоўскі займе пасаду Наваградскага ваяводы.

[5] Мы не можам не прымаць да ўвагі, што гравюры з абраза пры ўсім імкненні аўтара да дасканалага паўтору з'яўляюцца самастойнымі мастацкімі творамі і маглі ў дэталях адрозніваца ад арыгіналу.


[6] Wolf J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego ksiestwa Litewskiego 1386–1795. Kraków. 1885. S.39.

[7] Pawlowicz E. Nowogródek w drugiej polowie XIX stulecia// Ksiega pamiftkowa na ułczczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza (1798–1898). Tom II. Warszawa – Kraków, 1898. S. 148.

[8] Kalamajska-Saeed M. Obraz Matki Boskej z Dzieciftkiem z Fary w Nowogródku // Nowogródzkie obrazy w konserwacji. Warszawa. 1993. S. 19.

[9] Kempfi Andrzej. W kregu "spolecznego Nowogródka" i nowogródzkiej Matki Boski Zamkowej/"Slowo Powszechnie" 9.09.1991. S.9.

[10] Kalamajska-Saeed M. Op. sit. S. 21.



NOWA OBRONA

VTRAPIONEY OYCZYZNIE

OD BOGA z NIEBA DANA

W obrázie Nowo-Cudownym

BOGARODZICE PANNY

MARYEY

Przy Kośćiele Nowogrodzkim

SOCIETATIS IESV W Nowogrodku,

y w Okolicy Cáłego Woiewodztwá Nowogrodzkiego, W rożnych potrzebách, od rożnych oſob doznána.

Zá pozwoleniem/ y wyráźną ápprobácyą Vrzędu Duchownego do druku podána.

w WILNIE


W Drukárni Akádemickiey Societatis IESV. Roku 1673.

Mścá Iulij, dniá 14.

Мал. 1 (Да артыкула Нікалаева М.)



Мал. 2 (Да артыкула Нікалаева М.)


EFFIGIES
Miraculosæ Imaginis
DEIPARÆ VIRGINIS,
quæ apud Patres Societatis IESV
religiosè colitur,
NOVOGRODECI,
compendiosa Narratione Historica
illustrata,
atq; INSTRUCTIONE brevi
Omnibus Beatissimæ V. opem implo-
rantibus pretiuli adjuncta,
in Solemni Festorum,
à Residentia Novogrodensi
SOC: IESU proposita.
Vilnæ Typis Acad: Soc: IESV.
1689.

Мал. 3 (Да артыкула Нікалаева М.)



Мал. 4 (Да артыкула Нікалаева М.)

Ткачэнка М.Н., навуковы супрацоўнік,
Расійская нацыянальная бібліятэка (РНБ), Санкт-Пецярбург

НЕВЯДОМАЯ ГРАВЮРА АБРАЗА МАЦІ БОСКАЙ СВЕРЖАНЬСКАЙ

Надзвычай багатай і змястоўнай старонкай гісторыі мастацтва Беларусі былі цудатворныя абразы Маці Боскай. З па-над сотні святыняў да сённяшняга дня дайшлі толькі адзінкі. Таму даследчыкі аддаюць належнае значэнню літаратурных крыніц, дзе захаваліся звесткі пра абразы.[1] Неацэнным дадаткам да гісторыі іканапісу нам уяўляюцца гравіраваныя выявы цудатворных абразоў.

Апошнім часам у фондах РНБ (С.-Пецярбург) намі выяўлена невядомая гравюра цудатворнага абраза Маці Боскай Свержаньскай.[2] Медзярыт памерамі 188x141 змешчаны ў выдадзенай у Нясвіжы на ўшанаванне Свержаньскай святыні кнізе "Поўня Прыгожай як Месяц, што свету ласкаў праменямі прысвечвае...".[3] Гравюра перадае адзін з асноўных тыпаў паказу Маці Боскай з дзіцем — Адзігітрыю. Выява амаль пакаленная, дзіця сядзіць на левай руцэ Марыі. Правай рукой яно благаслаўляе, у левай трымае скрутак. Маці Боская апранута ў хітон, магчыма, арнаментаваны ля шыі і на рукавах, і мафорый з вузкай каймой, на галоўнай частцы ён мае роўнаканцовы крыж, на правым плячы — шасціканцовую зорку. Дзіця адлюстравана ў хітоне, падпяразаным паяском, і гімацыі; арганізацыя складак саступае візантыйскім узорам. Маці Боская, як царыца неба і зямлі, мае на галаве карону, аднолькавую па кшталту з каронай Хрыста. Рысы твараў маюць некаторае падабенства да выяваў на абразе "Маці Боская Адзігітрыя Неўвядальны цвет".[4] Фон аздоблены буйным раслінным арнаментам і манаграмамі Марыі і Хрыста. Вядома, што абраз быў напісаны на драўлянай дошцы па залатому фону і меў у XIX ст. срэбную шату.[5]

Адметнасць гравюры ад жывапіснага абраза складае шырокі ракайльны картуш з надпісам на лацінскай мове: "Выява Найсвяцейшай Дзевы Марыі Свержаньскай у графстве Мірскім Найвысакароднейшых Князёў Радзівілаў у айцоў Ордэна Святога Васілія Вялікага цудамі праслаўленая 1753". Над картушам шырока раскінуў крылы чорны радзівілаўскі арол, па баках якога гербы Радзівілаў і Вішнявецкіх. Арнаментыка ў выглядзе асіметрычных завіткоў і невялікіх ракавін характэрная для нясвіжскай гравюры сярэдзіны XVIII ст. Тэхнічны ўзровень выканання медзярыта досыць высокі. Прыёмы гравіравання нагадваюць аб партрэтах Радзівілаў з нясвіжскага альбому 1758 г. Магчыма, гэта работа Г. Ляйбовіча.[6]

У прадмове да чытача аўтар адзначыў, што шмат часу патраціў, шукаючы інфармацыю, як даўно існуе абраз, кім і адкуль паходзіць. Але дарэмна.[7] "Падчас многіх розных у Айчыне войнаў пры рабаванні з апошніх набыткаў бедных людзей і мучэнні іх, забіванні і паленні, да спалення або захопу ўсіх старадаўніх дакументаў, фундушаў і іншых несмяротнай памяці годных рэчаў дахадзіла. Хто, напрыклад, пра цудатворны Жыровіцкі абраз дакладна ведаць можа? Адкуль? І як узяўся? Хто пра Рымскі ў базылянскай рэзідэнцыі Літоўскай правінцыі ў 1718 г. з'яўленым дакладную вядомасць мець можа ?"[8] Вяртаючыся да Свержаньскага абраза, І. Ясткевіч спасылаецца на "вуснае паданне, якое існавала з даўніх часоў сярод людзей, што каля 1500 г. у лесе на дрэве быў знойдзены".[9] Занадта традыцыйнае паданне наўрад ці можна прымаць на веру. Царква Успення Багародзіцы, дзе знаходзіўся абраз, была фундацыяй 1590 г. Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі.[10]

Паяўленне абраза ў храме, магчыма, адбылося ў хуткім часе пасля яго будаўніцтва. Першы занатаваны цуд Свержаньскай святыні адносіцца да 22.03.1638 г.[11] Тады падчас хрышчэння дзіцяці бацька хросны замарудзіўся з адказам на пытанне святара: "Верыш у Ісуса Хрыста?", — але немаўля само да вялікага здзіўлення многіх прысутных адказала: "Веру". З таго часу, як сцвярджаюць аўтары, шмат праяўленняў Боскай моцы адбывалася ў Свержані. Са сваімі хваробамі і бедамі выпраўляўся туды не толькі просты люд, але і

шляхта. Магнаты Радзівілы, якія мелі клопаты са здароўем, як і ўсе смяротныя, таксама ахвяраваліся да абраза. Сын Сіроткі Аляксандр[12] дзякаваў Маці Боскай за збавенне ад каменя ў нырках. Да нябеснай апякункі звярталіся і аб выздараўленні яго жонка Лукрэцыя, дачка Цэцылія. Праўнук Аляксандра Міхал Казімір Рыбенька ў 1749 г. пазбыўся каменя "велічынёй з фінікавую костку", адправіўшы да абраза cum voto сваіх дзяцей.

І. Ясткевіч у прысвячэнні сваёй кнігі Рыбеньку адзначыў яго шчодрую фундацыю для цудатворнага абраза. Коштам Міхала Казіміра царква была адноўлена, аздоблена і надзелена рознымі начыннямі.[13]

Выданне кнігі "Поўня Прыгожай як Месяц...", а, магчыма, і стварэнне гравюры было ініцыятывай Міхала Казіміра. І. Ясткевіч, як рэктар семінарыі, спадзеючыся атрымаць ад князя дадатковыя сродкі на вымураванне будынку, выкарыстаў гэтую акалічнасць, пакінуўшы нам выдатны помнік беларускай гравюры.

Выявы цудатворных абразоў і святых патронаў былі здаўна распаўсюджаныя ў нашым краі. Іх стваралі мастакі такога ўзроўню, як І. Шчырскі, Л. Тарасевіч, Ф. Бальцэвіч, І. Карэнга, а таксама П. Пятровіч, П. Камар і іншыя менш вядомыя і ананімныя майстры. Кніжныя гравюры і станковыя лісты дапаўняюць белыя старонкі гісторыі беларускага мастацтва.

...

---

[1] Высоцкая Н.Ф. Тэмперны жывапіс Беларусі канца XV–XVIII стагоддзяў. Каталог. Мн. 1986. С. 26.

[2] У назве абраза спыняемся на крыніцах XVII–XVIII стст. Гл. ніжэй.

[3] Pelnia Piekney iak Xiezyc lask promieniami Swiatu Przyswiecaiaca... W Nieswizu W Drukarni Jego Hiazecey Msci. 1754. Passim. РНБ 15.14.3.18. Выданне вядомае як твор рэктара Свержаньскай базылянскай семінарыі І. Ясткевіча. Гл.: Estreicher K. Bibliografia Polska. Krakow. 1897. T. 4, cz. 3. S. 405. Архимандрит Николай. Историко-статистическое описание Минской епархии. СПб. 1864. С. 63. Гравюра не ўпамінаецца.

[4] Высоцкая Н.Ф. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў. Мн. 1992. Іл. 13.

[5] Описание церквей и приходов Минской епархии. М. 1878. Ч. 1. С. 109.

[6] На адвароце тытула змешчаны герб Радзівілаў (77х60), ідэнтычны з медзярытам Г. Ляйбовіча з "Ваенных артыкулаў" 1754 г.

[7] Нічога не паведамляецца пра гісторыю абраза і ў першай прысвечанай яму кнізе, выдадзенай свержаньскім плябанам П. Дунгоўскім "Cuda y dobrodzieestwa Otrzymane przy Obrazie Cudownym NP Maryey w Swierznie, Cerkwi Unitow..." Wilno: Druk. Akad. Soc. Jezu, 1651. РНБ 15.23.5.26. Гэтае выданне гравюры Свержаньскага абраза яшчэ не мела.

[8] Pelnia Piekney iak Xiezys... Passim.

[9] Ibid.

[10] М.К. Радзівіл набыў Свержань ад Слушкаў у 1575 г.

[11] Dungowski P. Cuda i dobrodzieystwa... F. A1. Аўтар падаў і больш раннюю дату: верасень 1636 г., аднак не апісаў змест той з'явы.

[12] Аляксандр Людвік (1594–1654) валодаў Свержанем пасля бацькі. Яму прысвяціў сваю кнігу П. Дунгоўскі.

[13] Міхал Казімір (1702–1762) фундаваў у Свержані базылянскую семінарыю (1743), дзе, па яго волі, навучаліся тэалогіі, лаціне, геаметрыі, арыфметыцы, гісторыі, рыторыцы і філасофіі 12 клерыкаў, дзяцей мясцовых уніяцкіх святароў, пад кіраўніцтвам чатырох прафесараў.



Да артыкула Ткачэнкі М.

Шматаў В.Ф, доктар мастацтвазнаўства,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, Мінск

ДА ПЫТАННЯ АБ РАЗВІЦЦІ СТЫЛЮ БАРОКА ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ КНІЖНАЙ ГРАФІЦЫ XVI-XVIII стст.

Пачынаючы, здаецца, ад І.Э. Грабара, ў шэрагу публікацый рускіх і ўкраінскіх даследчыкаў сцвярджаецца, што прыярытэт у развіцці стылю барока на ўсходнеславянскіх землях належыць Украіне; з Украіны гэты стыль распаўсюджваўся ў рускую культуру. Беларусь у такіх публікацыях часцей за ўсё, нават, не згадваецца наогул. Тым часам, барока на ўсходнеславянскіх землях пачало фарміравацца на Беларусі і пад уплывам нашай краіны пазней з'явілася на Украіне і ў Расіі. У гэтым асабліва наглядна пераконвае кніжная гравюра, помнікі якой (ілюстраваныя старадрукі) у адрозненне ад іканапісу, скульптуры, дакладна датаваны і таму даюць магчымасць прасачыць міграцыю стылю барока ў напрамку "Беларусь – Украіна – Расія". Асноўныя этапы гэтай міграцыі храналагічна і тэрытарыяльна выглядаюць так:

- першыя кніжныя гравюры на Беларусі з'явіліся ў 20-я гг. XVI ст. і выкананы ў стылі позняй готыкі і Рэнесансу (ілюстрацыі пражскіх (1517–1519) і віленскіх (1522–1525) выданняў Скарыны). Адзначым пры гэтым, што першай рускай дакладна датаванай ілюстраванай кніжкай з'яўляецца маскоўскі Апостал (1564), а першай украінскай – львоўскі Апостал (1574);
- пэўныя рэмінісцэнцыі стылю барока ў ілюстрацыях кірыліцкіх выданняў заўважаюцца ўжо ў 60-70-я гг. XVI ст. (Герб Рыгора Хадкевіча з заблудаўскага Евангелля 1569 г. і Псалтыры 1570 г.; выявы евангелістаў з Евангелля Пятра Мсціслаўца 1576 г. і інш.);
- асаблівае развіццё барока атрымала ў медзярытных ілюстрацыях польска-лацінскіх выданняў Беларусі і Літвы, дзе, пачынаючы ад нясвіжскага гравёра Тамаша Макоўскага (каля 1575 – каля 1630), якому належыць самая ранняя барочная гравюра-канклюзія "Панегірык братоў Скарульскіх" (Нясвіж, 1604), у гэтым жанры працавалі Аляксандр (каля 1640–1727) і Лявонцій (каля 1650–1710) Тарасевічы, Іван Шчырскі (каля 1650–1714), Лаўрэнцій Кршчановіч (каля 1650–1704), Максім Вашчанка (?–памёр у 1708) і інш. З Беларусі і Літвы браты Тарасевічы, Шчырскі і Кршчановіч перанеслі барока ў украінскую графіку;
- у рускай кніжнай гравюры на дрэве першыя ілюстрацыі ў стылі барока былі выкананы беларускімі (куцеінскімі) майстрамі ў Іверскім манастыры на Валдаі (герб патрыярха Нікана з "Рая мысленнага" 1659 г. Гл.: Сидоров А.А. Древнерусская книжная гравюра. М. 1951. С. 203–204);
- першыя рускія ілюстрацыі медзярыты ў стылі барока з'явіліся ў выданнях Сімеона Полацкага ("Псалтыр у вершах" 1680 г., "Гісторыя пра Варлаама і Іасафа" 1681 г., "Абед душэўны" 1681 г.) і выкананы Сімонам Ушаковым і Афанасіям паводле ініцыятывы Сімеона Полацкага (Сідараў А.А. Названы твор. С. 255–256).

Такім чынам, барока ў кніжнай гравюры XVI–XVIII стст. узнікла на Беларусі і з Беларусі пашыралася ў Расію і на Украіну. Беларусь, тэрыторыя, грамадска-палітычны лад і культура якой у тыя часы былі цесна звязаны з Заходняй Еўропай, першая ўспрымала "сусветныя" мастацкія стылі (не толькі барока, але і познюю готыку, Рэнесанс, ман'ерызм) і была іх галоўнай перадатчыцай у іншыя рэгіёны ўсходнеславянскай краіны.

Яцкевіч З.Л., Мінск

ЦІКАВЕЙШЫ ТВОР ПАЧАТКУ XVIII ст. З МАГІЛЁЎСКАЙ БРАЦКАЙ ДРУКАРНІ

Выдатнейшы магілёўскі майстар гравюры па дрэву Васіль Максімавіч Вашчанка пакінуў нам у спадчыну больш за два дзесяткі сваіх друкаваных твораў. Усе яны былі выдадзены ў друкарні Магілёўскага багаяўленскага брацтва ў перыяд з 1694 па 1730 г.

Сярод іх сваім мастацкім аздабленнем вылучаецца кніга "Жыцце святых", якая, па меркаванню адных даследчыкаў, была выдадзена 12.XI.1702 (так лічыць Галенчанка), ці ў 1703 г. (Шматаў). Выпадкі разыходжання могуць быць звязаны з рознымі каляндарнымі стылямі. Бясспрэчна, самая прыгожая і непаўторная яе частка — тытульны аркуш, які здаўна прыцягваў увагу даследчыкаў. Аб ім пісалі: рускі мастацкі крытык У. Стасаў, даследчык гравюы Д. Равінскі, беларускі гісторык мастацтва Мікола Шчакаціхін, якія адзначалі прыгажосць і высокія мастацкія якасці твора.

Кампазіцыя аркуша пабудавана своеасаблівымі ярусамі-паясамі. Уверсе ў прамяністым ззянні адлюстраваны сімвал Святога Духа — голуб, Бог-айцец і Бог-сын, ніжэй — крыж з сімваламі ахвяр Хрыста і дзве групы святых, яшчэ ніжэй — анёлы (досыць характэрны вобраз для магілёўцаў, які вельмі часта сустракаецца на іншых мастацкіх творах: абразах, кафлінах, фрэсках) і краявід з надпісам кірылічным паўуставам без скарачэнняў — "Град Могилев". Апошні акаймаваны прыгожым арнаментам у выглядзе скрутка, які быццам бы прыбіты да аркуша цвікамі (іх шляпкі добра бачны на выяве). Заўважым, што картушы такога кшталту шырока ўжываліся ў часы Рэнесансу ў Нямеччыне. Але для нас вельмі істотна тое, што гэта першая датаваная выява сярэдневечнага Магілева, якую стварыў тагачасны жыхар горада.

Спробы яе аналізу ўжо былі зроблены доктарам мастацтвазнаўства В. Шматавым у даследванні "Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст." (с. 168), "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" (т. 3, с. 356), "Гісторыі беларускага мастацтва" (т. 2, с. 290). Але дрэнна распрацаваная гісторыя і тапаграфія горада гэтага перыяду не дазволілі яму зрабіць гэта дакладна. Што ж дакладна адлюстраваў Вашчанка на сваім дрэварыце?

На пярэднім плане гравюры ўнізе бачны нейкія ўмацаванні бастыённага тыпу з брамай у правым баку, наверсе якіх, верагодна, стаяць гарадскія гародні з байніцамі. Далей у цэнтры значная пабудова з трох'ярусным купалам, які завяршаецца крыжам. Падобныя крыжы, але меншых памераў, маюцца з правага боку на канструкцыях, падобных да вежачак, а таксама на даху з левага боку, на выступаючых частках, якія нагадваюць франтон трансепта, а таксама ўнізе (магчыма, бакавы ўваход). Калі больш уважліва глядзець, то бачны бакавы неф і паўкруглая бакавая апсіда. З трох існаваўшых на той час храмаў крыжова-купальнага кшталту гэта можа быць толькі Багаяўленская царква. Значна прасцей вызначыцца з другімі пабудовамі, што маюцца на гравюры: з правага боку чатырох'ярусная званіца з крыжом наверсе, за ей дамкі жаночага Багаяўленскага манастыра, што знаходзіліся насупраць — на другім баку Шклоўскай вуліцы (зараз Першамайская). Злева — царква Іаана Багаслова з крыжамі на сваіх купалах, і манатырскія карпусы, у якіх, па сведчанню Ф. Жудро, раней знаходзілася брацкая друкарня. Не зусім адпавядае знешні выгляд Каралеўскай, ці, як яшчэ яе называлі, Трыўмфальнай, брамы апісанню XVII ст., што можна растлумачыць шмат у чым умоўным, стылізаваным характарам невялікага па памерах твора.

Разгледжаны помнік магілёўскай школы гравюры дапамог нам уявіць Магілёў на пачатку XVIII стагоддзя і, такім чынам, расчыніць яшчэ адну цікавую старонку ў гісторыі горада.

Косицина М.Ю., старший научный сотрудник
филиала ГИМ "Новодевичий монастырь", Москва

ИСТОРИЯ СОЗДАНИЯ И БЫТОВАНИЯ ДРЕВНЕЙ ПЛАЩАНИЦЫ НОВОДЕВИЧЬЕГО МОНАСТЫРЯ

1. Борьба за Смоленск между Русским государством и Польско-Литовским княжеством. Притязания великого московского князя Василия III. Основание Новодевичьего монастыря в честь возвращения Смоленска в состав русских земель. 1514–1523 гг.
2. Создание монахинями Новодевичьего монастыря плащаницы в дар смоленскому епископу Гурию Заболоцкому в 1545–1546 гг. Художественно-стилистические особенности памятника.
3. Эпоха смутного времени. Дар короля Сигизмунда III Виленскому Троицкому монастырю в 1611 г. Передача плащаницы князю Адаму Чарторыйскому для его коллекции древностей в Пулавском замке (ок. 1820 г.). Польское восстание 1831 г. Перенос плащаницы в Клеменсовский замок графов Замойских.
4. Розыск плащаницы по указанию генерал-губернатора Муравьева М.Н. Возвращение памятника в Москву и перенос его в Новодевичий монастырь в 1864–1865 гг.

Сташкевіч А.Б., Мінск

БЕЛАРУСКАЕ ШКЛО Ў МАСКВЕ XVII ст.

Праблеме руска-беларускіх сувязей прысвячалі свае працы многія аўтары, а ў публікацыях апошніх гадоў выразна назіраецца тэндэнцыя да канкрэтызацыі некаторых аспектаў дадзенай тэмы. Ускосна руска-беларускія сувязі разглядаліся і ў даследаваннях па беларускаму сярэдневечнаму шкларобству. Апублікаваны дакументальны матэрыял сведчыць пра шырокі геаграфічны дыяпазон гэтых сувязей, які ахопліваў усю Усходнюю і Паўночную Беларусь, Палессе і працягваўся далей – на Міншчыну і частку Гародзеншчыны. Мытныя кнігі Смаленска, Вязьмы, Тулы за 1626–1678 гг. утрымліваюць шматлікія запісы пра беларускі гандаль шклом у Маскоўскай дзяржаве, з якіх мы даведваемся пра найбольш распаўсюджаны асартымент такога тавару. Гандлявалі ў асноўным "шклом аканічным", "скляніцамі", "скляніцамі навожены золатам", проста "склом", квартамі. Раскопкі на Краснай плошчы ў Маскве, якія праводзіла ў 1988 г. Маскоўская археалагічная экспедыцыя, далі матэрыяльнае пацвярджэнне вышэйадзначаным фактам. Пры даследаванні рэштак вядомага з пісьмовых крыніц XVII–XVIII стст. паграбка Івашкі Цюкі была выяўлена цэлая калекцыя (400 фр.) шкляных вырабаў (у асноўным, посуду), якая дазволіла супаставіць знойдзены матэрыял з ужо даследаваным раней і выяўленым на тэрыторыі Беларусі. Паграбок быў пабудаваны ў 1636 г. "из оброку..." "Сретенской сотни тяглецом Ивашкой Тюкой..." "под болшими пушками что у лобного места". Івашка "под теми пушками сделал погреб каменный да кладовую палату длиной на 10, поперег на 8 саженях, да круг сторон погреба и палаты 22 лавки каменные". У 1655 г. "тот погреб, и палат, и лавки отписаны на Великих Государей и отдаются внаем торговым людям" у сувязі са смерцю гаспадара, які не пакінуў спадчыннікаў. Час найбольшага

функцыяніравання Івашкіна пагрэбка — канец XVII — першая палова XVIII ст. (на гэты перыяд прыпадае частка нумізматычнага матэрыялу). Гэтым жа часам датуецца і сабраная калекцыя шкла. Аснову калекцыі складае сталовы посуд — шкляніцы, шклянкі, куфлі, кварты, круглыя бутэлькі. Адметнае месца займаюць шкляніцы. Гэта традыцыйны для беларускага познесярэдневяковага шкла посуд з высокай (ад 9; 13,5 і вышэй) чашай на паддоне, утвораным хвалістаўкладзеным жгутом, край якога прыгожа зашчыплены. Выдзьмуты шкляніцы з цемна-зяленага, з ізумрудным адценнем шкла. Такое адценне было характэрна для мсціслаўскіх шкляных вырабаў сярэдзіны XVII ст. Аздабленне дна хвалістаўкладзеным жгутом сустракаецца таксама ў куфляў з маскоўскай калекцыі. Вельмі цікавымі, на наш погляд, з'яўляюцца некаторыя тыпы шклянак альбо кубачкаў з вузкім у дыяметры донцам і моцна раскрытым вусцем. Такія шклянкі былі выяўлены толькі ва Усходняй Беларусі, асабліва іх шмат у мсціслаўскай калекцыі. Месца пераходу вусця ў донца на некаторых шклянках пазначана трыма радамі хвалістападобных жгутоў.

Фрагменты донцаў і сценак кварт, упрыгожаныя радамі рознакаляровых, уплаўленых у тоўшчу матэрыяла шкляных ніцей маюць аналогіі ў крычаўскай і магілёўскай археалагічных калекцыях. Даследаванне маскоўскай калекцыі шкла, такім чынам, не толькі сведчыць пра беларускае яго паходжанне (што цалкам даказана, бо не сустракаюцца аналогіі сярод рускіх матэрыялаў), але дазваляе вызначыць і пэўны рэгіён вытворчасці гэтых вырабаў, якім, на нашу думку, з'яўляецца Магілёўшчына.

...

ЗМЕСТ

БІЯГРАФІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ І ДАКУМЕНТЫ

Арсень Ліс. Мікалай Мікалаевіч Шчакаціхін 3
Храналогія жыцця і дзейнасці М. Шчакаціхіна (1896–1940) .. 4
Публікацыі і рукапісы М. Шчакаціхіна 17
Успаміны Ганны Мацвееўны (у апрацоўцы С. Хайкінай) 26
А.М. Щекатихина. Памяти моего мужа Николая Николаевича Щекатихина 38
З неапублікаванай паэтычнай спадчыны М. Шчакаціхіна 48
Пісьмо М.М. Шчакаціхіна да У.І. Пічэты ад 2 лютага 1939 г. 51

ВЫСТАЎКА "МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XVI–XVIII стст. ЗНАХОДКІ М.М. ШЧАКАЦІХІНА"

Уступны артыкул Н.Ф. Высоцкай. 60
Каталог выстаўкі 61
Матэрыялы з архіваў 72

НАВУКОВЫЯ ЧЫТАННІ

Навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці М. Шчакаціхіна 76
Аб дзейнасці М. Шчакаціхіна 78
Агульныя працы 84
Жывапіс 95
Графіка 102
Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва 114

SUMMARY

"Матэрыялы" посвящены 100-летнему юбилею со дня рождения Николая Николаевича Щекатихина (1.10.1896, Москва – 5.04.1940, Белебей Башкирской АССР) – выдающегося ученого, основателя белорусского искусствознания, историка и теоретика искусства, репрессированного в 1930-е гг. Предваряет сборник статья кандидата филологических наук А.С. Лиса, первооткрывателя имени Н.Н. Щекатихина. Далее даны даты жизни и творчества Н.Н. Щекатихина, перечень научных трудов: воспоминания жены ученого, эпистолярное наследие, в том числе стихи, написанные в тюрьме, письмо к В.И. Пичета, первому ректору Белорусского государственного университета. Во второй части "Материалов" помещен каталог выставки "Мастацтва Беларусі XVI–XVIII стст. Знаходкі М.М. Шчакаціхіна" со вступительной статьей доктора искусствоведения, профессора Н.Ф. Высоцкой, и приведен перечень документов, показанных в экспозиции. Научные чтения, приуроченные к 100-летию со дня рождения Н.Н. Щекатихина, отражены в виде тезисов докладов современных исследователей.

...

"Materyaly" ("Materials") are devoted to the 100th anniversary of the birthday of Nickolay Nickolaevitch Shtchekatikhin (1.10.1896, Moscow – 5.04.1940, Belebey, Bashkir ASSR) – a prominent scientist, the founder of the Belarusian art criticism, historian and theorist of art, who was repressed in the 1930-s. The introduction to the book is the article by A.S. Lis, Candidate of Philological Sciences who was the first to reveal the name of N.N. Shtchekatikhin, chronology of life, the list of scientific works, the memories of the scientist's wife; the epistolary hevitage including the verses written in prison, the letter to V.I. Pycheta the first Rector of the Belarusian State University. In the next part of "Materyaly" there is Catalogue of the exhibition "The Art of Belarus of XVI–XVIII cent. The discoveries of N. N. Shtchekatikhin" with the introductory article of N.F. Vysotskaya, Doctor of Arts, Professor; and there is a list of documents, shown at the exposition. The scientific readings, devoted to the 100-th anniversary of N.N. Shtchekatikhin's birhtday, are reflexed as the theses of the reports by the modern researchers.

Выданне ажыццеўлена дзякуючы фінансаваму забяспячэнню Беларускім фондам Сораса у межах культурнай праграмы праекта *"Правядзенне канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння М.Шчакаціхіна".*

Навуковы кансультант выдання
доктар мастацтвазнаўства, прафесар БДУ,
загадчык аддзела старажытнабеларускага
мастацтва НММ Беларусі, навуковы кіраўнік
па складанню каталога выстаўкі
"Мастацтва Беларусі XVI—XVIII ст. Знаходкі
М. М. Шчакаціхіна" — *Высоцкая Н.Ф.*

Удзельнікі праекта, складальнікі каталога
выстаўкі "Мастацтва Беларусі XVI—XVIII ст.
Знаходкі М. М. Шчакаціхіна"
старшыя навуковыя супрацоўнікі
аддзела старажытнабеларускага мастацтва
НММ Беларусі — *Карпенка А.У., Трыфанава Н.Я.*

Кіраўнік праекта, складальнік дат
жыцця і творчасці, бібліяграфіі,
спіса матэрыялаў з архіваў, заўваг
малодшы навуковы супрацоўнік аддзела
старажытнабеларускага мастацтва НММ Беларусі — *Чэбан І.Л.*

Карэктар — *Маліноўская А.Р.*

Макет — *Харытоненка В.Я.*

Удзельнікі праекта шчыра дзякуюць супрацоўнікам аддзела мастацтва Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь за падрыхтоўку матэрыялаў з фондаў бібліятэкі.

Падпісана ў друк 23.12.96. Фармат 60x90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Free Set. Афсетны друк.
Умоўн. друк. аркушаў 7,2. Умоўн.-выд. аркушаў 4.9.
Наклад 300 асобнікаў. Заказ № 72.

Надрукавана з дыяпазітываў у друкарні "Юніпол".
Ліцэнзія ЛП—340 ад 26.12.96.
220000, Рэспубліка Беларусь, Мінск, Караткевіча, 6.